Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

2 снежня 1977 г.
№ 48 (2887)

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Цана 8 кап.
Выдаецца з 1932 г.



Нафтахімія.

Фота А. НІКАЛАЕВА.

ВЫСОКАЕ ПРЫЗВАННЕ МАСТАКА

З пачуццём вялікай адказнасці за лёс мастацтва, за развіццё духоўнай культуры народа прыбылі ў Маскву дэлегаты V з'езда мастакоў СССР, які адкрыўся 29 лістапада ў Вялікім Крамлёўскім палацы.

Цёпла сустрэлі прысутныя таварышаў В. В. Грышына, А. П. Кірыленку, К. Т. Мазурава, М. А. Суслава, П. Н. Дземічава, І. В. Капітонава, М. В. Зімяніна.

Са справаздачным дакладам праўлення Саюза мастакоў СССР «Творчасць савецкага мастака — неад'емная частка вялікай стваральнай працы народа» выступіў старшыня праўлення саюза М. А. Панамароў.

Чатыры гады, якія мінулі пасля папярэдняга з'езда мастакоў СССР, сталі часам умацавання творчай арганізацыі, значнага пашырэння яе дзейнасці, узбагачэння зместу работы. Мы бачым, падкрэсліў дакладчык, наяўныя цяжкасці і недахопы. Але, апіраючыся на дасягнутае, можам сказаць, што наш творчы саюз здольны вырашаць вялікія ідэйна-творчыя задачы, пастаўленыя новым этапам камуністычнага будаўніцтва.

Саюз мастацтва і працы, працягваў прамоўца, увасабляецца ў жывую канкрэтную справу, пачатую мастакамі Расіі, падхопленую творчымі калектывамі ўсіх рэспублік. Ён прывёў шматлікія прыклады плённых творчых сувязей з калектывамі прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, калгасаў.

Сёння наша мастацтва, адзначыў дакладчык, мае незвычайна шырокую аўдыторыю. Няма такой сферы жыцця, дзе савецкі чалавек не сутыкаўся б з яго творамі. Але асабліва вялікае месца ва ўсёй арганізацыйна-творчай рабоце займае выставачная дзейнасць. Разгортванне яе мае велізарнае значэнне для развіцця ўсяго мастацтва, уздыму творчай актыўнасці мастакоў.

Ацэньваючы поспехі выставачнай работы, М. А. Панамароў разам з тым у ліку першачарговых задач назваў павышэнне ідэйнай і мастацкай якасці твораў, экспануемых на выстаўках. Мы нярэдка спагадліва ставімся да твораў, прысвечаных важным тэмам, але выкананым на недастаткова высокім мастацкім узроўні. Трэба думаць не толькі пра якасць твора, але і пра тое, наколькі ён адпавядае магчымасцям яго стваральніка. Ці цалкам аўтар аддаў такому твору свой талент? Такая пастаноўка пытання не зводзіцца толькі да патрабавальнасці. Трэба, каб у выніку паездак на прамысловыя прадпрыемствы, будоўлі, у калгасы былі створаны абагульняючыя творы, тэмы і вобразы якіх глыбока перажыты мастаком.

Ахарактарызаваўшы далей творчасць маладых, М. А. Панамароў адзначыў, што прыток новых сіл у савецкае выяўленчае мастацтва, у нашу мастацкую культуру ў цэлым—адно з самых яркіх праяўленняў духоўнай атмасферы грамадства развітога сацыялізму, якая садзейнічае росквіту шматнацыянальнай па характару і інтэрнацыянальнай па духу сацыялістычнай культуры.

Нідзе ў свеце, падкрэслівалі дакладчык і выступаўшыя на з'ездзе, мастак не акружаны такой высокай увагай і душэўнымі клопатамі дзяржавы і народа, як у нашай краіне. Высокае давер'е аказана мастаку Камуністычнай партыяй. І яго маральны, прафесійны абавязак — быць дастойным гэтага вялікага давер'я.

Увасабленне высокіх ідэалаў камунізму, сцвярджэнне і прапаганда савецкага ладу жыцця — вось тыя галоўныя рысы, якія вызначаюць творчасць майстроў нашага шматнацыянальнага мастацтва. Пра гэта з вялікай зацікаўленасцю гаварылі дэлегаты V з'езда мастакоў СССР. Ішла таксама гаворка аб узаемадзеянні і ўзаемаўзбагачэнні нацыянальных культур — жыватворнай крыніцы, якая ўзбагачае скарбніцу адзінага сацыялістычнага мастацтва.

Учора з'езд закончыў работу.

САЮЗ ПЯРА І КІНАКАМЕРЫ

— У нас ёсць сур'ёзная, глыбокая літаратура, якая заваявала папулярнасць не толькі ў чытачоў нашай краіны, але і далёка за яе межамі. Здавалася б, гэта невычэрпная крыніца для творчасці беларускіх кінематаграфістаў, трывалая аснова стварэння самабытных, па-сапраўднаму нацыянальных кінафільмаў. На жаль, нашы рэжысёры недастаткова выкарыстоўваюць такую магчымасць...

Гэтыя словы першага сакратара праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР Віктара Турава, сказаныя ім на адкрыцці сустрэчы пісьменнікаў і работнікаў кіно за «круглым сталом» «Беларуская літаратура як крыніца і рэзерв беларускага кіно», вызначылі характар і напрамак абмеркавання праблем узаемасувязей гэтых двух відаў мастацтва.

Усіх, хто прыйшоў у той вечар у Дом кіно, хвалявала галоўнае — нашы фільмы павінны быць высокага ідэйна-эстэтычнага ўзроўню, глыбокай думкі, па-сапраўднаму мастацкімі; толькі тады яны змогуць паказаць, як ствараецца новае грамадства, як фарміруецца новы чалавек у барацьбе за камуністычныя ідэалы. Таму і гаворка атрымалася зацікаўленай, дзелавой, прынцыповай.

Беларуская літаратура дала штуршок развіццю нацыянальнага кінематографа, вызначыла яго гістарычную накіраванасць. Першыя нашы фільмы 20-х гадоў ствараліся на аснове твораў беларускіх пісьменнікаў. Але пасля гэтыя кантакты пачалі слабець. Гэта, вядома, не значыць, што работнікі кіно наогул не заўважаюць беларускай літаратуры. У розны час здымаліся фільмы па творах Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Янкі Маўра, Міхася Лынькова і многіх іншых беларускіх пісьменнікаў. Адзін з лепшых фільмаў нашай кінастудыі «Канстанцін Заслонаў» створаны па п'есе беларускага драматурга Аркадзя Маўзона. І ўсё-такі ў гэтай справе больш няўдач. Творы Івана Шамякіна, Андрэя Макаёнка, Уладзіміра Караткевіча, Івана Пташнікава, Сяргея Грахоўскага і іншых літаратараў многае страцілі пры пераносе іх на экран. Кінематаграфісты зрабілі па творах В. Быкава нямала фільмаў, але ў многіх не хапае таго глыбокага філасофскага роздуму, што так характэрна творчасці гэтага пісьменніка.

Беларускае кіно ні разу не звярнулася да твораў такіх выдатных пісьменнікаў, як Кузьма Чорны і Максім Гарэцкі. Чакае сваёй чаргі «Палеская хроніка» Івана Мележа, патрабуе далейшай распрацоўкі ў кіно творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа. Асвойваць кінематаграфічнымі сродкамі гэтае багацце нялёгка. Аднак, як паказвае практыка многіх кінастудый краіны, магчыма.

Аб усім гэтым гаварылі ў сваіх выступленнях кіназнаўца Вольга Нячай, сцэнарыстка Эла Мілова, галоўны рэдактар сцэнарнай майстэрні кінастудыі «Беларусьфільм» пісьменнік Вячаслаў Адамчык.

Галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм» Леанід Гаўрылкін пазнаёміў прысутных з планамі студыі на бліжэйшыя гады.

У сваім выступленні сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Барыс Сачанка падкрэсліў, што экранізацыя твораў пісьменнікаў нашай рэспублікі вымагае больш цеснай сядружнасці пісьменнікаў і работнікаў кіно.

На сустрэчы былі выказаны цікавыя думкі і прапановы па паляпшэнню сувязей беларускіх пісьменнікаў і кінематаграфістаў, якія, на думку ўдзельнікаў «круглага стала», павінны даць добры плён.

СВЯТА ТВОРЧАЙ САДРУЖНАСЦІ

З 5 па 9 снежня ў Каралішчавічах будзе працаваць рэспубліканскі семінар маладых пісьменнікаў, у якім прымуць удзел паэты, празаікі, драматургі і крытыкі.

Правядзенне падобных мерапрыемстваў стала добрай традыцыяй у рабоце Саюза пісьменнікаў з творчай моладдзю. Аднак семінар-77 істотна адрозніваецца ад папярэдніх. Ён з'яўляецца ўвасабленнем новых формаў і метадаў у рабоце пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі з літаратурным папаўненнем у святле пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю». На гэты раз у Каралішчавічах збяруцца маладыя члены саюза, а таксама аўтары першых кніжак.

Літаратурная моладзь вучыцца ў старэйшых таварышаў па пяру. Многіх маладых звязвае са старэйшымі творчае сяброўства. Семінар у Каралішчавічах выльецца ў вялікае свята гэтай творчай сядружнасці. У дыспутах на самыя розныя тэмы, якія хвалююць нашу сучасную літаратуру, прымуць удзел аўтары, чые творы занялі пачэснае месца ў беларускай нацыянальнай культуры, а таксама тыя, у каго галоўныя творы — яшчэ наперадзе.

Адкрые семінар народны паэт рэспублікі, старшыня праўлення СП БССР Максім Танк. З аналізам здабыткаў нашай літаратуры за апошнія гады і вызначэннем задач, якія стаяць перад ёй сёння, выступіць сакратар праўлення СП БССР, вядомы беларускі празаік Іван Чыгрынаў. Адбудуцца гутарні аб праблемах маладой прозы і паэзіі, драматургіі і мастацкага перакладу. «Галоўны герой прозы — сучаснік», «Грамадзянская пазіцыя паэта і майстэрства», «Беларускі мастацкі пераклад сягоння», «Драматургічны твор і яго сцэнічнае ўвасабленне», «Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і чалавек» — па гэтых пытаннях будуць праслуханы даклады беларускіх крытыкаў і вучоных.

Плануецца правядзенне творчых сустрэч з народнымі пісьменнікамі рэспублікі І. Шамякіным і А. Макаёнкам, з народным паэтам БССР П. Панчанкам, а таксама з членамі Савета па беларускай літаратуры СП СССР, галоўнымі рэдактарамі рэспубліканскіх перыядычных выданняў, работнікамі выдавецтва «Мастацкая літаратура».

У заключны дзень семінара адбудзецца пасяджэнне прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў, у рабоце якога прымуць удзел і маладыя літаратары. З дакладам «Аб выхаванні маладых літаратараў у святле пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю» выступіць старшыня камісіі па рабоце з маладымі СП БССР Я. Сіпакоў. Самыя таленавітыя з аўтараў першых кніжак будуць прыняты ў члены Саюза пісьменнікаў рэспублікі.

НА ЭКРАНЕ — ФІЛЬМЫ АМАТАРАЎ

З 28 па 30 лістапада ў Доме кіно адбыўся чарговы рэспубліканскі агляд аматарскіх фільмаў, прысвечаны 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. Для ўдзелу ў заключным этапе агляду было прадстаўлена 50 лепшых работ кінааматараў з усіх абласцей Беларусі.

Аб развіцці аматарскага кіно ў рэспубліцы, яго ролі ў жыцці вытворчых калектываў, аб некаторых праблемах далейшага ўдасканалення гэтага віду народнай мастацкай творчасці па просьбе нашага карэспандэнта расказаў старшыня секцыі аматарскіх фільмаў, рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Стральцоў:

— За апошнія дзесяць-пятнаццаць гадоў кінааматарства ў рэспубліцы з асобных невялічкіх самадзейных гурткоў ператварылася ў сапраўды масавую з'яву. Зараз у нас звыш 130 аматарскіх студый, якія аб'ядноўваюць каля паўтары тысячы чалавек. Штогод аматары выпускаюць на экран каля 150 кінастужак.

Актыўную дапамогу самадзейным калектывам аказвае Саюз кінематаграфістаў, у прыватнасці — наша секцыя. Мы праводзім кансультацыі, агляды, семінары, на якіх кінааматары абменьваюцца вопытам, сустракаюцца з прафесійнымі майстрамі кіно. Гэта, безумоўна, спрыяе павышэнню рэжысёрскага, аператарскага і сцэнарнага майстэрства. Дастаткова сказаць, што на Першым Усесаюзным фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці працоўных з адзінаццаці аматарскіх фільмаў нашай рэспублікі сем былі адзначаны залатымі медалямі і тры атрымалі дыпломы.

У ПОЛЬСКАЙ АНТАЛОГІІ

Напярэдадні 60-й гадавіны Вялікага Кастрычніка Лодзінскае выдавецтва выпусціла анталогію «Польшча ў савецкай паэзіі» («Як узняць вершам тваю славу»). Уклаў яе і напісаў прадмову вядомы польскі славіст, нядаўні госць Беларусі Базылі Беланазовіч.

Усяго ў выданні змешчаны творы ста дваццаці трох савецкіх аўтараў. Сярод іх — трынаццаць паэтаў з Беларусі: Якуб Колас, Язэп Пушча, Пятрусь Броўка, Аляксей Зарыцкі, Максім Танк, Марына Барстак, Пімен Панчанка, Кастусь Кірэенка, Еўданія Лось, Алег Лойка, Рыгор Барадулін, Янка Сіпакоў і Сяргей Панізнік (творы падаюцца ў адпаведнасці з годам нараджэння аўтараў). Яны ўсхвалявана пішуць пра даўнюю дружбу беларускага і польскага народаў, баявое братэрства ў апошняй вайне, пра аднаўленую Варшаву і старажытны Кракаў, пра неўміручасць Міцкевіча, Шапэна і Карловіча. Найбольш шырока, дванаццацю вершамі прадстаўлена ў анталогіі паэзія Максіма Танка.

Над перакладамі беларускіх вершаў працавалі даўнія сябры нашай літаратуры, — К. А. Яворскі, Б. Жыранік, М. Ю. Кананові́ч, Я. Гушча, Т. Хрусцялеўскі, І. Сінірыцкі, Л. Левін, Т. Плеснярові́ч. Сярод перакладчыкаў з беларускай мовы знаходзім таксама прозвішчы С. Е. Леца, Р. Сцілера, К. Фрэйдліха, Т. Ранітняка, В. Слабодніна.

А. ГУДАС.

ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ, ВЫСОКІЯ ЎЗНАГАРОДЫ

За заслугі ў развіцці самадзейнай мастацкай творчасці працоўных Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў работнікам культуры і народнай творчасці рэспублікі ганаровыя званні:

НАРОДНАГА АРТЫСТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Бяльзацкай Марыне Мікалаеўне — балетмайстру народнага ансамбля танца «Равеснік» Палаца культуры Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў.

ЗАСЛУЖАНАГА РАБОТНІКА КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Бяловай Антаніне Аляксееўне — мастаку па касцюмах вытворчага камбіната Беларускага тэатральнага таварыства.

Барысевічу Васілю Мікалаевічу — дырэктару Палаца культуры Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў.

Гразнову Юрыю Рыгоравічу — намесніку дырэктара па музычнай адукацыі сярэдняй школы № 33, кіраўніку народнай харавой капэлы Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута.

Дашкоўскай Вользе Іванаўне — сакратару выканкома Варытынскага сельскага Савета народных дэпутатаў, кіраўніку народнага хору даярак калгаса імя А. С. Пушкіна, Бабруйскі раён.

Дубовіку Платону Карпавічу — намесніку начальніка ўпраўлення культурна-асветных устаноў Міністэрства культуры Беларускай ССР.

Жмайліку Паўлу Андрэевічу — загадчыку аддзела культуры выканкома Брэсцкага гарадскога Савета народных дэпутатаў.

Засінцу Міхаілу Мікалаевічу — самадзейнаму мастаку, кіраўніку гуртка выяўленчага мастацтва Скараднянскай сярэдняй школы, Ельскі раён.

Кацнельсону Якаву Раманавічу — мастацкаму кіраўніку народнага ансамбля песні і танца «Тачанка» вайсковай часці.

Клёсавай Галіне Іонаўне — начальніку ўпраўлення культуры выканкома Віцебскага абласнога Савета народных дэпутатаў.

Любчуну Сяргею Феадосьевічу — кіраўніку народнага ансамбля песні і танца «Брастаўчанка» клуба Брэсцкага электрамеханічнага завода імя XXV з'езда КПСС.

Музычку Івану Андрэевічу — кіраўніку народнага духавога аркестра Слуцкага гарадскога Дома культуры.

Ніціцінай Аляксандры Пятроўне — кіраўніку народнага хору Палаца культуры Мінскага аўтамабільнага завода.

Перацяцьку Уладзіміру Сяргеевічу — старшаму выкладчыку Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, кіраўніку народнага аркестра народных інструментаў.

Сераму Аляксандру Фёдаравічу — кіраўніку народнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Дзвінскія зоры» Палаца культуры нафтавікоў Наваполацкага нафтаперапрацоўчага завода імя XXV з'езда КПСС.

Сталярову Дзмітрыю Уладзіміравічу — загадчыку Каменскага сельскага клуба, Рагачоўскі раён.

Сушко Іосіфу Фамічу — кіраўніку народнага ансамбля песні і танца Маладзечанскага гарадскога Дома культуры.

Хворасту Івану Маркавічу — няштатнаму кансультанту рэспубліканскага Дома народнай творчасці.

Шарэцкаму Віктару Канстанцінавічу — настаўніку Бараўскай сярэдняй школы, кіраўніку Бараўскага народнага хору, Іўеўскі раён.

●

За актыўную і плённую работу па развіццю самадзейнай мастацкай творчасці Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў вялікую групу работнікаў культуры і народнай творчасці рэспублікі Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ПОСТУП ТЫДНЯ

ЭТЫКА — ПРАДМЕТ ШКОЛЬНЫ

Чацвёрты год у школах рэспублікі выкладаецца новы прадмет — этыка. Ёсць першы вопыт, але шмат яшчэ праблем і клопатаў. Няма стабільнага падручніка, не хапае дапаможнага матэрыялу, абмежавана колькасць гадзін.

Пра гэта ішла зацікаўленая гаворка ў Інстытуце ўдасканалення настаўнікаў з удзелам Янкі Брыля і Васіля Віткі.

Пісьменнікі гаварылі пра тое, што ніводная справа не будзе мець поспеху без творчага падыходу. Можна звесці ўсё да засвае́ння этыкету, карыстацца яго знешнімі правіламі і ў той жа час заставацца эмацыянальна неразвітым, духоўна абмежаваным чалавекам.

Выкладчык этыкі сам павінен быць перш за ўсё чалавекам высокай культуры, выхоўваць дзяцей сваім асабістым прыкладам, культурай мовы, паводзінамі. І той, хто не любіць дзяцей, не любіць прадмета, які выкладае, — не павінен нават брацца за гэтую справу.

На выкладчыку этыкі ляжыць адказная задача: зрабіць тое, што не здолела ці ўпусціла сям'я, школа.

Пра этыку, як і пра пісьменнасць, неабходна дбаць кожны дзень і кожнаму настаўніку, а не толькі тым, хто яе выкладае. Самы галоўны этычны экзамен для чалавека — гэта яго ўменне глянуць на сябе збоку, вачамі людзей.

Настаўнікі этыкі выказалі шмат пажаданняў, прапаноў і Саюзу пісьменнікаў, і нашым выдавецтвам. Чаму б, гаварылі яны, у «Полымі», а тым больш — у «Маладосці» не ўвесці раздзелы па этыцы, дзе змяшчаліся б этычныя гутаркі, выступленні пісьменнікаў, мастакоў, настаўнікаў. Неабходна больш шырока прыцягваць пісьменнікаў для ўдзелу ў падрыхтоўцы і выданні падручнікаў і дапаможнікаў па вывучэнню этыкі ў школе.

Было выказана пажаданне, каб як хутчэй выдаць у нас на Беларусі кнігу Васіля Сухамлінскага «Сэрца аддаю дзецям», а таксама перавыдаць яго кнігу апавяданняў і казак «Блакітныя жураўлі». Гэта былі б добрыя дапаможнікі настаўнікам, вучням, бацькам.

СУСТРЭЧА АРТЫСТАЎ

У Доме мастацтваў адбылася творчая сустрэча артыстаў цырка з тэатральнай грамадскасцю Мінска. Прысутныя цёпла сустрэлі лаўрэата Усесаюзнага і Міжнароднага конкурсаў, заслужанага артыста РСФСР ілюзіяніста Ілью Сімвалокава, заслужаных артыстаў РСФСР клоунаў Генадзя Макоўскага і Генадзя Ротмана, а таксама іх малодшых калег Антона Абаджана, Валерыя Маркава, Ларысу Кобышаву, Юрыя Аляксандрава, Святлану і Вадзіма Сімвалокавых, Вячаслава Барысенку і Аркадзя Бурдзецкага.

Галоўны рэжысёр цырка Валерый Маторын расказаў аб рабоце творчага калектыву над героіка-эпічнай пантамімай «Кастрычніцкая паэма». Госці падзяліліся думкамі аб развіцці цыркавога мастацтва, прадэманстравалі сваё майстэрства.

Беларускае тэатральнае аб'яднанне за высокую творчую і актыўную шэфскую дзейнасць адзначыла групу артыстаў цырка граматамі, якія ім уручыў народны артыст СССР Леанід Рахленка. Ня вечары быў уручаны дыплом лаўрэата Усесаюзнага конкурсу артыстаў цырка Ілы Сімвалокаву.

На афішы — чайка

Сустрэча з мхатаўцамі заўсёды хвалюе. На мінулым тыдні мінчане зноў віталі прадстаўніноў МХАТа. «Святая святых» І. Друцэ і «Валянцін і Валянціна» М. Рошчына — вось рэпертуар так званых малых гастролей мхатаўцаў у сталіцы Беларусі на пачатку зімы. Абедзве работы, паказаныя мхатаўцамі ў Мінску, ажыццёўлены пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Алега Яфрэмава, чыя рэжысура сёння выяўляе сучасныя тэндэнцыі ў разуменні і паказе праўды жыцця як праўды мастацтва, зыходзіць з індывідуальнасці артыста і яго ўмення ўнутрана пераўвасабляцца ў вобраз.

Мінчане цёпла сустрэлі гасцей.

На здымку: заслужаныя артысты РСФСР Уладзімір Кашпур і Святлана Карношка ў ролях Каліна і Марыі ў спектаклі «Святая святых».

Фота І. АБРАЎЦА.

НАМ ПІШУЦЬ

У КУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЦІ горада Барысава адбылася важная падзея: пачалося будаўніцтва Палаца культуры. Гэта будзе трохпавярховы манументальны будынак сучаснай архітэктуры з глядзельнай залай на 800 чалавек, музычным салонам, танцавальнай залай, студыяй выяўленчага мастацтва, памяшканнямі для гурткоў мастацкай самадзейнасці і г. д.

У падмурак Палаца культуры закладзена капсула з пісьмом да нашчадкаў, у якім напісана: «Дарагія нашчадкі! Будаўніцтва Палаца культуры ў старажытным беларускім горадзе Барысаве пачалося ў год 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, калі ў краіне праходзіла ўсенароднае абмеркаванне Канстытуцыі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, калі савецкі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, з велізарным працоўным і творчым уздымам, выконваючы велічныя прадвызначэнні партыі, паспяхова будаваў камуністычнае грамадства ў нашай краіне».

А. БЕНЯНСОН.

●

НЯДАЎНА ГОСЦЕМ НАВУЧЭНЦАЎ Гомельскага музычнага вучылішча імя Н. Ф. Сакалоўскага быў вядомы чэшскі піяніст Павел Штэпан. З вялікім майстэрствам музыкант выканаў творы Баха, Моцарта, Шуберта і іншых вядомых кампазітараў.

А. ЖЫЖНЕЎСКІ.

●

У САЎГАСЕ «МІНСКАЯ ФАБРЫКА ГАРОДНІНЫ» адбылася сустрэча за «круглым сталом» работнікаў гаспадаркі з тымі, хто непасрэдна ўдзельнічае ў стварэнні кнігі.

У шчырай сяброўскай гаворцы прынялі ўдзел загадчык аддзела прапаганды часопіса «Камуніст Беларусі» В. Барушка, старшы рэдактар Дзяржкамвыда У. Кузьміч, загадчык аддзела навукова-папулярнай і вучэбнай літаратуры выдавецтва «Ураджай» М. Давыдзік.

Аб ролі грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай літаратуры ў жыцці працоўных расказаў сакратар парткома саўгаса Г. Аляксееў.

Госці пазнаёміліся з дасягненнямі гаспадаркі, з умовамі працы работнікаў саўгаса.

Вёў сустрэчу за «круглым сталом» адказны сакратар Мінскай арганізацыі Саюза журналістаў БССР В. Садоўскі.

Л. ШЧЭРБАЧ.

●

У МАЛАДЗЕЧНЕ АДБЫЛОСЯ свята кнігі. У госці да маладзечанцаў прыехалі пісьменнік А. Гардзіцкі, паэтэса Я. Янішчыц, карэспандэнт газеты «Советская Белоруссия» паэт А. Харкевіч. У свяце кнігі прынялі ўдзел і мясцовыя літаратары — члены літаратурнага аб'яднання «Купалінка».

У гэты дзень аматары беларускай літаратуры набылі кнігі з аўтографамі аўтараў.

І. ГАЛУБОВІЧ.

●

ЗВОНКАЯ ПЕСНЯЯ, дасціпным жартам, віхурным танцам радуюць хлебаробаў, жывёлаводаў, механізатараў члены агітбрыгады, якая створана пры Клічаўскім раённым Доме культуры. Нядаўна агітбрыгада выступіла ў саўгасе «Добраахвотнік». Цёпла прымалі працаўніні вёскі кожны нумар самадзейных артыстаў. Асабліва спадабаліся гледачам песні ў выкананні Аляксандра Красько і Алены Акуліч.

Члены агітбрыгады маюць намер выступіць ва ўсіх гаспадарках раёна.

І. СЦЯПУРА.

●

ДВАНАЦЦАЦЬ ДЗЁН у горадзе над Пінай гастраляваў Цярнопальскі дзяржаўны ўкраінскі музычна-драматычны тэатр імя Т. Р. Шаўчэнкі.

Гледачы горада і працаўнікі вёскі з вялікім задавальненнем паглядзелі спектаклі па п'есах І. Шамякіна «Родны дом», М. Крапіўніцкага «Дай сэрцу волю, завядзе ў няволю», В. Карасёва «Адзенне для выхаднога дня», С. Міхалкова «Пена» і іншыя.

В. ГРЫШКАВЕЦ.

ПРА ЛІТАРАТУРУ ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ

У рабоце секцыі дзіцячай і юнацкай літаратуры ўжо стала добрай традыцыяй рэгулярна праводзіць пасяджэнні бюро, а таксама пашыраныя сходы, на якія, акрамя паэтаў, празаікаў, крытыкаў, запрашаюцца работнікі народнай асветы, настаўнікі, выхавацелі дзіцячых садоў, супрацоўнікі бібліятэк сталіцы рэспублікі і іншых гарадоў, шматлікія чытачы. Шырокай, зацікаўленай атрымалася і чарговая гаворка, прысвечаная такой важнай праблеме, як літаратура для маленькіх, што адбылася нядаўна ў канферэнц-зале Дома літаратара.

Супрацоўнік навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР, пісьменнік А. Клышка, які выступіў з дакладам, прааналізаваў кнігі для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, што выйшлі на працягу года ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», а таксама творы, якія друкаваліся ў «Вясёлцы» і «Работніцы і сялянцы».

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел кандыдат філалагічных навук М. Яфімава, загадчык рэдакцыі літаратуры для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту выдавецтва «Мастацкая літаратура» С. Міхальчук, загадчыца навучальнай часткі пачатковых класаў СШ № 117 Мінска В. Леўта, кандыдат педагагічных навук П. Лявонава, адказны сакратар часопіса «Вясёлка» Т. Тарасава, настаўнік з Салігорска Л. Шырын, бібліятэкар бібліятэкі імя Я. Маўра Я. Керуль, кандыдат філалагічных навук Р. Літвінаў, выхавальніца дзіцячага сада № 333 Мінска І. Казлова, супрацоўніца Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна К. Навуменка, настаўніца СШ № 136 Мінска А. Грынкевіч, метадыст Мінскага гарана па дзіцячых установах А. Чарнова, пісьменнікі А. Якімовіч, Я. Брыль, С. Шушкевіч, Г. Каржанеўская, А. Дзеружынскі.

Сакратар праўлення СП БССР Б. Сачанка сваё выступленне прысвяціў пытанням перавыдання лепшых твораў беларускай дзіцячай літаратуры, а таксама перакладу іх на іншыя мовы.

Старшыня бюро секцыі П. Кавалёў гаварыў аб адлюстраванні тэмы сучаснасці ў творах для дзяцей.

Выдаецца ў ГДР

На працягу месяца ў Дрэздэне экспанавалася выстаўка савецкай графікі, прысвечаная 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Экспазіцыю склалі творы трох мастакоў: М. Грыцука (Новасібірск), М. Каплана (Ленінград), Б. Заборава (Мінск).

Беларускі мастак Б. Забораў паказаў нямецкім гледачам тры афорты з серыі «Памяці тых, хто не вярнуўся з вайны», восем афортаў да аповесці Дастаеўскага «Пакорлівая» і чатыры аўталітаграфіі з серыі «Чалавек і космас».

Усе работы, якія былі паказаны на выстаўцы, з'яўляцца ў хуткім часе ў асобных альбомах, якія выпускае выдавецтва «Kunst der Zeit» «Сучаснае мастацтва»).

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Паважаны таварыш рэдактар!

Дазвольце праз Вашу газету перадаць сардэчную падзяку арганізацыям і асобным таварышам за віншаванні ў сувязі з маім юбілеем і прысваеннем мне ганаровага звання заслужанага дзеяча навукі БССР.

Міхась ЛАРЧАНКА.

КАСТРЫЧНІК І КНІГА

У Цэнтральнай бібліятэцы імя Карла Маркса зараз асабліва людна. Тут нядаўна адкрылася кніжная выстаўка «60 гадоў па ленінскаму шляху». На 24 кніжных паліцах больш як 150 лепшых кніг з фондаў бібліятэкі, якія аб'яднаны ў сем раздзелаў: «Ленін і кніга», «Ленін — правадыр Кастрычніка», «За ўладу народную», «Палымяныя рэвалюцыянеры», «Мы ў бітвах здабывалі свой лёс», «У буднях вялікіх будоўляў», «Кастрычнік крочыць па планеце».

Адкрыццём гэтай выстаўкі пачалося свята палітычнай кнігі ў Магілёве.

Цікавыя сустрэчы з кнігай, з пісьменнікамі, равеснікамі Кастрычніка, наватарамі вытворчасці штодня праводзяцца зараз на заводах і фабрыках, будоўлях і ў дамах культуры, у школах і навучальных установах горада. Месячнік праходзіць пад дэвізам «Кастрычнік і кніга».

В. АРЦЕМ'ЕЎ.

Сацыялізм — грамадства сапраўднай свабоды

Такую тэму канферэнцыі чытачоў выбралі кніголюбы Брэсцкай базы «Прамімпартгандло» сумесна з кніголюбамі Брэсцкага абласнога бюро таварных экспертыз.

На пасяджэннях былі абмеркаваны такія пытанні, як «Марксізм-ленінізм аб сутнасці свабоды», «Сацыялістычны лад жыцця і свабоды грамадзян», «Фарміраванне новага чалавека». Сваёй актуальнасцю выбранай тэмы, арганізаванасцю і глыбокім зместам абмяркоўваемых пытанняў канферэнцыя прыцягнула да сябе ўвагу многіх арганізацый горада і вобласці.

Удзельнікі канферэнцыі прынялі зварот да ўсіх кніголюбаў Брэсцкай вобласці яшчэ шырэй разгортваць прапаганду і распаўсюджанне грамадска-палітычнай кнігі, правядзенне чытацкіх канферэнцый, тэматычных вечароў, рэкамендаваць усім таварыствам правесці канферэнцыю чытачоў на тэму: «Сацыялізм — грамадства сапраўднай свабоды».

П. ВУЕК.

У САЮЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ

Пісьменнікі з Польскай Народнай Рэспублікі любяць наведваць Беларусь. У гэтым годзе гасцямі нашай рэспублікі былі галоўны рэдактар штотыднёвіка «Жыцце літэрацкае» Уладзіслаў Махэек, польская пісьменніца Ганна Строньска, якая збірала матэрыял для кнігі пра Савецкі Саюз, член Саюза польскіх пісьменнікаў беларускі празаік з Беластока Сакрат Яновіч.

Днямі на Беларусі пабываў польскі крытык Фелікс Фарнальчык. Аўтар кнігі пра Уладзіслава Сыракомлю і шэрагу творчых партрэтаў сучасных польскіх пісьменнікаў, Фелікс Фарнальчык у апошні час зацікавіўся таксама творчасцю беларускіх празаікаў. У польскім друку ён ужо выступаў з артыкуламі пра творчасць Івана Шамякіна, Івана Чыгрынава, Уладзіміра Караткевіча, Івана Пташнікава. На гэты раз у Мінску Фелікс Фарнальчык збіраў матэрыялы пра Максіма Гарэцкага, дзённік якога «На імперыялістычнай вайне» і раман «Віленскія камунары» мяркуе перакласці на польскую мову, меў гутарку з братам беларускага пісьменніка акадэмікам Г. І. Гарэцкім.

Госць наведаў радзіму рыцара рэвалюцыі Ф. Э. Дзяржынскага Дзяржынава, а таксама месца нараджэння Уладзіслава Сыракомлі — Залучча на Стаўбцоўшчыне.

Адбылася гутарка ў СП БССР, у якой удзельнічалі пісьменнікі Дзмітрый Бугаёў, Мікола Гамолка, Аляксей Гардзіцкі, Пятрусь Макаль, Адам Мальдзіс, Міхась Мушынскі, Іван Пташнікаў, сакратары праўлення СП БССР І. Чыгрынаў, Б Сачанка, адказны сакратар У. Ліпскі.

Раіса БАРАВІКОВА

●

Пакуль жыву — агнём гару!
Іначай быць ніяк не можа.

Я сонца некаму дару,
і нехта ў горы мне паможа.

Прарвецца з сэрца жалю спеў,
маё дзіця яго пачуе...
Я некаму дарую гнеў,
і нехта слабасць мне даруе.

І абяцае добрым быць
дзень сённяшні і дзень наступны,
вучу душу сваю любіць
усё, што позірку даступна, —

ад хаты і да мураша,
ад небасхілу да асфальту...
Пакуль жыву, — нясі, душа,
любві зямной зямную варту!

●

Вясны ўтрапёнае дыханне
пачула на лясной мяжы,
зрывае золкае світанне
з галін змакрэлых капяжы.

Эх, заспяваць бы, ды няможна,
шчымлівы надта хвойны пах.
Іду сцяжынай асцярожна
з маўклівай песняй на губах.

Дубы вялікасна пасталі,
нібы заморскія купцы,
а на сырой шчацэ праталін
траншэй і брустверaў рубцы.

З якога дня, з якое явы
выходжу — справа не у тым!
Бяроста, нібы чуб русявы,
туман разрэджаны, як дым.

Ля пнёў замшэлых густа трэскі,
як гільзы чорныя ляжаць,
а побач першыя пралескі
слязою матчынай гараць.

Застукаў блізка гулка дзяцел,
а мне пачуўся посвіст куль...
У сорак трэцім родны дзядзька
мой не прыйшоў дамоў адсюль.

●

Не давайце мне думаць пра лета,
затрымайце гадзінніка ход.
Лепей дайце у рукі газету
за мінулы ў мінулае год.

Не кажыце, што быў ён няўдалы,
я па словах усё разбяру,
хоць пакінуў мне снег падталы
толькі леташнюю кару.

Я пракрочу забытаю сцежкай,
кожны след свой былы уяўлю
і рассыплю па дрэвах усмешкі,
нібы зерне сухое ў раллю.

Я забуду пра вершы, пра песні,
пра вясёлага месяца рог.
Хто сказаў вам, што свет гэты цесны?
Маю волю ніхто не запрог!

Вось ляціць яна зоркаю ў ночы!
Не схапіць, не злавіць, не дагнаць!
І пралесак ліловыя вочы
ува след ёй зайздросна глядзяць.

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

Мост Шандара Пецёфі

Паэт не той, хто вершы піша, не.
Каб так было — усе б былі паэты.
Паэт сябе стварае,
Як камета
След самагубны, —
Самагубнасць гэта
Сапраўднага паэта
Не міне.

Яна адна правы яму дае
Сумленнем быць і праўдаю народа.
Паэт не той, хто апяе свабоду,
А той, хто ў бітве згіне за яе.

З такою доляй ці пашчасціць мне?..
Вадою цёмнай, часам замучонай,
Плыве Дунай — і раптам уздыхне
То хваляю зялёнай, то чырвонай.

Яго дыханне запаўняе Пешт
І заціхае ў вузкіх вулках Буды...
Не страшна думаць мне, што ў рэшце рэшт
Заціхну я... закончуся... не буду...
Што лягу ў полі, прарасту травой...
Мне страшна не счакаць хвіліну тую,
Калі, сарваўшы ў сечы голас свой,
Паэты шчодра плацяць —
Галавой —
За слова, што нічога не каштуе!

Мне гэткай платы будзе не шкада,
Хай толькі лёс прыняць яе захоча...

Мост Пецёфі пагрозліва ракоча.
Цямней за ноч дунайская вада.

Горад

ТРЫПЦІХ

1.

Сумую па табе, мой горад.
Як ні напоўнена душа
Палёў прасторам, шумам лесу
І плёскатам крыніц і рэчак —
Сумую па табе, каменным.

Гады глыбеюць. Не злучыць
Карэнні з вершалінай стромай,
Якую толькі ледзь хістае
Вяртанняў нашых нізкі вецер.

2.

Пагоркамі, дзе грае рэха,
Зялёным звонам касавіцы
Працуе ліпень... На вазах
Плывуць зялёныя аблокі.

З дарогі падыму травінку —
І загарчыць на вуснах лета,
І пошук страчанага часу
Патрэбным здасца і дарэмным.

Дзяўчо на возе засмяецца
І кіне недаспелы яблык,
Які ўпадзе, як узарвецца,
У босы след майго маленства,
У пыл гарачай каляіны.

3.

У горад мой, да сцен каменных,
Вяртаюся з палёў і рэчак,
Святлее ўсход паловай сонца,
Мінулым і наступным днём.

І час, які не захаваць,
Не зберагчы ў сабе навечна,
Сухой травінкай касавіцы
Шапоча пад чаравіком.

Мар'ян ДУКСА

Нарач

У нераце сонца ружоваю плоткай заб'ецца.
Аерам запахне. Ліпова-сасновая вёска
На сон адыходзіць, стамлёная нанач кладзецца,
А цёплыя шыбы казычуць малыя усплёскі.

Зацэдзіцца зверху малодзіва — месяц на грушы.
І мроіцца хлопцам, што трухаюць з позняй вячоркі:
Вунь човен нырнуў партызанскі, трысцё узварушыў.
І мацае бераг пад назіркам гатаўскай* зоркі.

Былым партызанам спяшацца не трэба нікуды.
Парыпвае лодка насупраць дагледжанай дачы.
Ускідвае вёслы ўладальнік бамбукавай вуды
Пад ветлівым назіркам колішняй зоркі удачы.

Зара палыхае. І цела дрымотнае пройме
Рыбацкага шчасця салодкі дурман і спакуса.
Зайграе затока, як першы раскрышыцца промень
У водах — празрыстых, нібыта душа беларуса.

З кнігі «Забытыя словы»

Прыхільнікам нейтроннай бомбы

Жартаўнікі і трохі фарысеі,
Вы пад чыю няспынную дыктоўку
Таму, што смерць бязлітасную сее,
Гуманную далі фармуліроўку?
Пляшчыце ў ладкі: бомба-каралева!
Такой ніколі не было, не будзе —
Не паміраюць вуліцы і дрэвы,
Дамы... А людзі?
Што такое — людзі...

І для трывогі — ні адной прычыны
У вас, хто так заблытаўся у блудзе,
Хай застаюцца спраўныя машыны,
А людзі як жа?
А навошта людзі?

Ах, па зямлі мы ходзім недарэчы,
Найбольш спадручна — лезці ў катакомбы...
Якая радасць: выжываюць рэчы—
Хавацца ім не прыйдзецца ад бомбы.

Няўжо і праўда весела вар'ятам,
Што ганарыста б'юць ва ўсе званіцы?..
Вы кожны раз ныраеце у атам,
Каб там знайсці не сонца— навальніцу.

Спакушаныя хмельна барышамі,
Званіць то безразважліва званіце.
Але, але — удумайцеся самі —
Вы надта гэты атам не дражніце.
Ён чалавечны і гняўліва-грозны —
Павінны ведаць,
Хто над ім гарбее.
Ягоны нораў расшыфроўваць позна,
Як выбухне апошні дзень Пампеі...

Вытокі

Разводдзе, канікулы, лотаці выбух.
У рэчцы зялёнай пасуцца аблокі.
І сінія пальмы узімку на шыбах —
Вытокі.

Вісіць над суніцамі сонейка павай,
Палеглі каровы у поўдзень высокі.
Пагляд незабыўны дзяўчынкі чарнявай —
Вытокі.

Вясёлая маці глядзіць, смеючыся,
Пытае ў мяне, ці зрабіў я урокі.
О, як вы далёка ужо засталіся,
Вытокі!

Кароценькі ліст ад старэйшага брата,
Пасылка, дзе яблык ляжыць рудабокі.
Журботна люляе драўляная хата
Вытокі.

Ручай не вяртаецца зноў у крыніцу.
Ды каб не паволіўся бег яснавокі,
Дазвольце яшчэ раз да вас прыхіліцца,
Вытокі.

* Гатавічы — вёска на ўзбярэжжы Нарачы.

«...ЭПОХІ ЖОРСТКІ ВЕЦЕР»

Блакітны сшытак вершаў «Вячэрні цягнік»... А памяць суадносіць і тут жа ставіць побач другі такі ж — не, нават крыху меншы — панчанкаўскі «Снежань» (1972), які па праву стаў адной з лепшых кніг года. «Вячэрні цягнік» уварваўся ў наша чаканне ўслед за нядаўнім «Крыкам сойкі», каб зноў парадаваць і ўсхваляваць. Высокая грамадзянскасць, палымянасць, мудрасць, смеласць, непрымірымасць да сацыяльнага зла ва ўсіх яго праяўленнях і такая харошая лірычнасць — усё гэта на старонках новай кнігі.

І зноў чуваць даўні боль вайны, што вечным напамінкам жыве «недзе ад Дуброўны недалёка»— гэта «цёмны замініраваны лес»:

Не прайшлі сапёры тут
спачатку,
Не прайшлі сапёры тут пасля.
І нашпігавана ўся
ўзрыўчаткай
Ды іржавым страхам тут
зямля.

...Навакол малых тым лесам
страшаць
З лесу прыкульгаўшыя
дзядзькі.

Хлапчукі на дрэвы тут не
лазяць,
Вось бы ім заўсёды памяць
мець,
Бо з карэннем тут
пераплялася
Даўняя затоеная смерць.

І вось пытанне: «Час мой асцярожны і трывожны, колькі лес той будзе на вайне?» Яно падрыхтавана ўсім ладам верша, больш таго — усёй творчасцю, усім жыццём паэта-грамадзяніна. Яму баліць не толькі за боль свайго народа.

«Боль Сербіі»... Чытаю гэты верш раз, і другі... Стрыманы голас паэта. Сцяты, нібы спружына, радок. Рэквіем. Фашысты «хацелі бацькоў запалохаць, забралі са школы малых». Пяцікласнікаў...

Шумадзія — сэрца Сербіі
І боль яе невыносны.
Нізіны, таполі срэбныя,
Горы — чорныя сосны.

Але чарнейшы за дрэва
Быў дзень,
Як стралялі дзяцей...

У той страшнай апошняй вайне гартаваліся не толькі душы — нараджалася, мацавалася братэрства, класавая, інтэрнацыянальная еднасць, як прыступкі да неадольнай перамогі.

Назаўтра усе цыганяты—
Чысцільшчыкі ботаў чужых—
Пакінулі звычны занятак
У чэсць аднагодкаў сваіх.

Не чысціць забойцаў,
Не чысціць!
Закідаць гразёй гэту дрэнь.
І брудныя боты фашыстаў
Былі у крыві цэлы дзень.

Якая трапнасць дэталі! Якая высокая паэзія! Калі б у «Вячэрнім цягніку» былі толькі два гэтыя творы, пра якія гавару, і тады мы былі б шчаслівыя новай сустрэчай з сапраўдным талентам.

Чарговая кніга Панчанкі сведчыць аб тым, што ён па-ранейшаму застаецца на пярэднім краі паэтычнага асэнсавання жыцця, барацьбы за чалавечае ў чалавеку, непрымірымага змагання са злом, мяшчанствам ва ўсіх яго праяўленнях, вельмі шчырым, заўсёды думаючым, мудрым, палкім публіцыстам і лірыкам, прасветленым, чуйным...

Сцякае дождж з далоняў
светлых лесу,
Пажоўклы мох бясшумна п'е
ваду.

Мне сёння ты патрэбна да
зарэзу,
Дай толькі знак—
І ў момант я прыйду.

Ціхая музыка лесу. Асацыятыўна ажыло асабістае. А следам, вельмі арганічна наплывае агульначалавечае, гуманнае: «вучуся век з людзьмі сумленна ладзіць...», і зноў асабістае, яго, паэтава, і асацыятыўна,— чытачова: «Сячэ душу мне бліскавіц агонь, і без папрокаў хочацца пагладзіць цяпер тваю шурпатую далонь».

Шмат мудрасці, сапраўднай паэзіі, шчырасці ў новай Панчанкавай кнізе. І зноў самы светлы вобраз паэтавай ліры — вобраз Радзімы. Мы ведаем неўтаймаванасць Панчанкі — ён аб'ехаў Еўропу, Азію, Афрыку, Амерыку. Плённа ўзбагацілі тыя падарожжы творчасць. А вось цяпер вандроўкі толькі па роднай зямлі: «Не паеду болей за граніцу: сэрца разарвецца ад тугі».

Неяк Станіслаўскі сказаў: успрымаць факт усёй сваёй біяграфіяй. Гэта адрасавалася акцёрам. А хіба не так і ў паэта? Яго жыццё, яго біяграфія, яго вопыт высвечвае кожны новы факт, які, прапушчаны праз паэтава сэрца, становіцца фактам мастацтва. Колькі шчырасці ў вершы «Няўдачнік», і мудрай яснасці, хлебаробскай паэтавай біяграфіі ў яго «Хлебных словах»!

І тут такое ж сталае, падоранае нам багатым вопытам паэтава слова, падоранае вельмі зацікаўлена, шчыра, з бацькоўскім клопатам і надзеяй, што яго, паэтаў, вопыт людзі ўспрымуць сэрцам.

Даруйце бацькам, што жадаюць сваім
Наследнікам многа багацця:
Жылося вайною так голадна
ім
Без хлеба і солі у хаце.

Даруйце настаўнікам, што ў юнаках
Захоплена таленты бачаць:
Іх талент уласны згарэў у
баях,
І позна жыццё перайначыць...

Ды нельга наследнікам тым
дараваць,
Што толькі ўзаб'юцца на
горку—
Забудуць рублі ды і пісьмы
паслаць
Дадому,
Дзе сумна і горка.

Верш гэты — суровы, па-грамадзянску ўсхваляваны. Панчанку заўсёды імпанавалі ў чалавеку яго высокая духоўнасць, яго сапраўднасць, як працяг горкаўскага: «Чалавек — гэта гучыць горда». Усёй сваёй творчасцю паэт адмаўляе свет прыстасавальніцтва, «сучаснае мурло» мяшчанства, бездухоўнасць, маральнае ўбоства. І тут мы гаворым пра Панчанку-сатырыка.

Паэт заўсёды хвалюецца «за ўсіх і ўсё, за зерне і дзіця...» Гэта — грамадзянская сталасць яго. Гэта — яго знітаванасць з народам. Усе беды зямлі праходзяць праз яго, паэтава, сэрца.

...Шчаслівая наша паэзія сёння. Ёсць у нас Броўка. Ёсць у нас Куляшоў. Ёсць Танк. І ёсць Пімен Панчанка.

А замыслаў яшчэ на тры
жыцці,
І сонца добрае шчэ ласкава
свеціць,
Ды дзьмухае эпохі жорсткі
вецер,
І трэба не спыняцца, а ісці.

І мы ведаем: наш таленавіты сучаснік неадольна будзе працягваць сваю плённую хаду.

Ніна ЗАГОРСКАЯ.

П. Панчанка. Вячэрні цягнік. Вершы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1977.

НА СУЧАСНЫМ НАВУКОВЫМ УЗРОЎНІ

ВЕЛЬМІ значным дасягненнем нашай літаратуразнаўчай думкі была і застаецца двухтомная «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры», выдадзеная ў 1964 — 1966 гадах. Але за дзесяцігоддзе з лішнім адбыліся прыкметныя зрухі і ў развіцці сацыялістычнага грамадства, і ў далейшым поступе шматнацыянальнай савецкай літаратуры, у -ым ліку літаратуры беларускай. Таму ўзнікла патрэба не толькі даць навуковае абагульненне новых мастацкіх з'яў, але і па-новаму, з пункту гледжання важных грамадскіх перамен апошняга дзесяцігоддзя, асэнсаваць папярэдняе літаратурнае развіццё. Адгукаючыся на гэтую патрэбу, вучоныя Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР з удзелам некаторых іншых літаратуразнаўцаў стварылі новую «Гісторыю беларускай савецкай літаратуры».

Па сваёй агульнай структуры яна блізкая да папярэдніх прац такога характару, у прыватнасці, да той жа двухтомнай «Гісторыі». Структура гэтая, у якой агляды літаратурнага развіцця за пэўныя перыяды спалучаюцца з манаграфічнымі характарыстыкамі творчасці найбольш значных пісьменнікаў, дастаткова шырока апрабавана рознымі навуковымі калектывамі, прайшла праверку часам.

Разам з тым новая праца мае і сваю выразную адметнасць. Яна адрасавана перш за ўсё ўсесаюзнаму чытачу, у той час як папярэдняя «Гісторыя» арыентавалася на нашы ўласныя патрэбы, на чытача беларускага. Двухтомная «Гісторыя» стваралася пад кіраўніцтвам В. Барысенкі і В. Івашына, якія з'яўляліся яе навуковымі рэдактарамі. Навуковае рэдагаванне новай «Гісторыі» і кіраўніцтва ўсёй працай па яе стварэнню забяспечылі член-карэспандэнт АН БССР І. Навуменка і дактары філалагічных навук П. Дзюбайла і Н. Перкін, які, на вялікі жаль, не дажыў да выхаду кнігі ў свет.

Значна змяніўся і аўтарскі калектыў. Толькі Н. Перкін, У. Калеснік, М. Барсток, М. Ярош, В. Каваленка і В. Гапава працавалі і над двухтомнай «Гісторыяй». Астатнія аўтары новай працы (П. Дзюбайла, М. Арочка, М. Мушынскі, І. Чыгрын, А. Лысенка, М. Тычына, Э. Гурэвіч, С. Андраюк, В. Бечык, В. Буран, С. Лаўшук) упершыню ўдзельнічаюць у напісанні самастойных раздзелаў для выдання такога тыпу.

Гэткае значнае абнаўленне аўтарскага калектыву таксама станоўча адбілася на асэнсаванні мастацкіх з'яў у «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры». Падкрэсліваючы гэтую акалічнасць, я, вядома, не збіраюся змяншаць адпаведную ролю тых даследчыкаў, якія ўдзельнічалі і ў двухтомнай «Гісторыі». Некаторыя з іх цяпер, побач з ранейшымі, пісалі новыя раздзелы. Так, Н. Перкіну, апрача раздзелаў, над якімі ён працаваў і раней, у новай кнізе належаць «Уводзіны», у якіх зроблена плённая спроба вельмі сцісла, у самым агульным плане сказаць пра галоўныя абрысы гістарычнага шляху нашай літаратуры, пачынаючы ад самых яе вытокаў, пра яе месца сярод іншых літаратур Савецкай краіны, а таксама пра характар і асноўныя задачы новай «Гісторыі». Для М. Яроша новымі з'яўляюцца раздзелы пра паэзію і прозу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, для М. Барсток—раздзел пра творчасць У. Дубоўкі.

Не менш істотна тое, што даследчыкі, якія працавалі над папярэдняй «Гісторыяй», цяпер, як правіла, не толькі нанава пісалі, але і нанава вывучалі свае ранейшыя тэмы, ва ўсякім разе, паглыблялі і ўзбагачалі іх асэнсаванне ў новай кнізе. Гэта ў першую чаргу стасуецца да разгляду заходнебеларускай літаратуры, зробленага У. Калеснікам, які, дарэчы сказаць, амаль што адзін і ўзняў на сапраўды навуковы ўзровень гэтую галіну нашага літаратуразнаўства, а таксама да раздзелаў пра літаратуру 20-х і 30-х гадоў, напісаных Н. Перкіным, артыкулаў пра творчасць П. Броўкі і П. Панчанкі, якія належаць адпаведна М. Ярошу і В. Гапавай, і некаторых іншых прац.

Цалкам новай у цяперашняй «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» з'яўляецца, вядома, размова пра літаратуру другой паловы 60-х —70-х гадоў. Яна, гэтая размова, дазволіла разгледзець нямала новых цікавых твораў, вылучыць новыя пісьменніцкія імёны. Гутарка ідзе пра сучасных маладых літаратараў і тых майстроў слова, якія на працягу апошняга дзесяцігоддзя занялі трывалае месца ў літаратуры, надзейна сцвердзілі сваю мастакоўскую рэпутацыю.

Бясспрэчнай заслугай аўтарскага калектыву новай «Гісторыі» трэба лічыць і тое, што яны абнавілі кола пісьменнікаў, якім прысвечаны манаграфічныя характарыстыкі. Так, упершыню «свае» манаграфічныя раздзелы атрымалі В. Быкаў і А. Макаёнак. І гэта вельмі слушна, бо сённяшнюю беларускую літаратуру, многія істотныя асаблівасці яе развіцця ніяк нельга ўявіць без грунтоўнага аналізу творчасці гэтых пісьменнікаў. Можна сказаць і больш. Сёння ўжо адчуваецца выразная патрэба ў падрабязным разглядзе творчасці А. Пысіна, І. Навуменкі, І. Чыгрынава, І. Пташнікава і некаторых іншых мастакоў, якія разам са старэйшымі пісьменнікамі шмат у чым вызначаюць воблік сучаснай беларускай літаратуры.

Зрэагавала «Гісторыя» і на цяперашнюю ўвагу грамадскасці да літаратурнай крытыкі — упершыню ў практыцы такіх выданняў у новай «Гісторыі» змешчаны спецыяльны, дарэчы, вельмі добра напісаны, раздзел пра нашу крытыку і літаратуразнаўства. Аўтар гэтага раздзела М. Мушынскі грунтоўна і падрабязна даследаваў беларускую крытычную і літаратуразнаўчую думку савецкага часу за ўсю гісторыю яе існавання.

У адпаведнасці з духам часу і ў прамой сувязі з арыентаванасцю на ўсесаюзнага чытача ў новай «Гісторыі», як слушна падкрэсліваюць «Уводзіны», вялікая ўвага аддаецца таму, што збліжае нашу літаратуру з іншымі літаратурамі Савецкай краіны, робіць яе састаўной часткай шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

Аўтары большасці раздзелаў настойліва імкнуцца ўключаць беларускіх пісьменнікаў у агульнасаюзны літаратурны кантэкст, гаварыць пра іх з вышыні агульнасаюзных ідэйна-эстэтычных крытэрыяў. Таму яны шчодрыя і на прамыя паралелі, якія таксама маюць свой сэнс, і на фіксацыю кантактных сувязей нашых пісьменнікаў з пісьменнікамі іншых братніх рэспублік, і на выяўленне тыпалагічнай агульнасці ў творах рознай нацыянальнай прыналежнасці. «Па сваёй ідэйнай сутнасці, па агульных мастацкіх асаблівасцях раман гэты, — справядліва зазначае С. Андраюк пра «Мінскі напрамак» І. Мележа, — блізкі такім творам, напісаным у тыя гады, як «Сцяганосцы» А. Ганчара, «Бура» В. Лаціса, «Бура» І. Эрэнбурга, «Векапомныя дні» М. Лынькова і інш. Творы гэтыя шырокія, шматпланавыя, «панарамныя»... Іх галоўная задача — уславіць вялікі подзвіг народа, паказаць масавы, усенародны характар барацьбы з фашызмам, барацьбы, нябачнай па сваіх маштабах, па напружанню духоўных і фізічных сіл, па сваіх выніках — палітычных, сацыяльных, маральных. Адсюль пафас, ідэйны змест, характар вобразнай сістэмы, спецыфіка сюжэтабудавання і кампазіцыі, эмацыянальная афарбоўка».

Не менш выразна рысы тыпалагічнай блізкасці ў творах пра вайну, якія належаць рознанацыянальным савецкім пісьменнікам, сцвярджаюцца ў разважаннях П. Дзюбайлы. «Галоўнае для сучасных твораў пра вайну — праўдзівае, канкрэтнае адлюстраванне падзей, глыбокае раскрыццё псіхалогіі чалавека на вайне, пільная ўвага не толькі да вытокаў гераічнага, сутнасці подзвігу, але і да трагічных з'яў. Пафасам твораў пра вайну стаў савецкі гуманізм, антымілітарызм. Раманы і аповесці будуюцца не толькі на рэзкай сацыяльна-палітычнай канфліктнасці (барацьба супраць фашысцкіх захопнікаў), але і на ўнутраным псіхалагічным драматызме», — піша даследчык, падмацоўваючы свой вывад спасылкай на творы К. Сіманава і Л. Первамайскага, А. Адамовіча і А. Ананьева, Ю. Бондарава і В. Быкава, Й. Авіжуса і Я. Брыля, І. Навуменкі і А. Кулакоўскага.

Аўтары новай «Гісторыі» так паслядоўна акцэнтуюць роднаснае або агульнае ў творах розных савецкіх пісьменнікаў таму, што добра разумеюць важнасць працэсаў далейшага ўзаемадзеяння і ўзаемазбліжэння, якія спрыяюць хутчэйшаму росту ўсёй шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Але даследчыкі далёкія ад спрашчэння гэтых працэсаў. Яны выразна ўсведамляюць дыялектыку агульнага, інтэрнацыянальнага і адметнага, нацыянальна спецыфічнага, якое вызначае непаўторны воблік кожнай з літаратур Савецкай краіны.

(Працяг на стар. 6).

Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. На рускай мове. Мінск, «Навука і тэхніка», 1977.

НА СУЧАСНЫМ НАВУКОВЫМ УЗРОЎНІ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5.).

Такім чынам, з імкненнем паказаць не толькі тое агульнае, што аб'ядноўвае нашу літаратуру з іншымі літаратурамі народаў СССР, але і яе нацыянальную адметнасць, яе непаўторны каларыт, арыгінальнасць яе ўкладу ў агульнасаюзны літаратурны працэс непасрэдна звязана прыкметная ўвага аўтараў «Гісторыі» да эстэтычнай своеасаблівасці беларускай літаратуры, да творчага вобліку, індывідуальнай манеры і мастацкага стылю нашых вядучых пісьменнікаў. Гэтая ўвага выразна адчуваецца нават у некаторых аглядных раздзелах, дзе сканцэнтраванасць на творчай адметнасці асобных мастакоў звычайна даецца вельмі нялёгка. У новай жа «Гісторыі» ёсць, бясспрэчна, удачы і ў гэтым плане. Так, у аглядзе сучаснай беларускай прозы падкрэсліваецца вялікая моц эпічнай пластыкі І. Мележа, трагедыйнасць твораў В. Быкава, дынамічнасць пісьма ў рамане М. Лобана «Гарадок Устронь», лірызм Я. Брыля і І. Навуменкі, схільнасць да рамантычных прыёмаў У. Караткевіча і інш. У аглядзе беларускай паэзіі на сучасным этапе М. Арочка цікава гаворыць пра творчыя пошукі М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі, А. Пысіна, Р. Барадуліна і некаторых іншых цяперашніх паэтаў розных пакаленняў.

Вядома, куды большыя магчымасці выявіць эстэтычную самабытнасць таго ці іншага пісьменніка былі ў аўтараў манаграфічных характарыстык. І магчымасці гэтыя ў большасці выпадкаў паспяхова выкарыстоўваюцца, асабліва тымі даследчыкамі, якія раней працавалі над кнігай «Стыль пісьменніка», прысвечанай П. Броўку, М. Танку, А. Куляшову, П. Панчанку, І. Мележу, І. Шамякіну, Я. Брылю (аўтары — М. Ярош, М. Арочка, В. Бечык, В. Гапава, С. Андраюк, А. Лысенка, Э. Гурэвіч). Яны ж пісалі адпаведныя манаграфічныя раздзелы ў новай «Гісторыі», непасрэдна абапіраючыся на свае ранейшыя вывады пра пісьменніцкі стыль. Таму не дзіўна, што асобныя з гэтых манаграфічных характарыстык, не трацячы сваёй фактычнай насычанасці, якая з'яўляецца абавязковай для раздзелаў з «Гісторыі», па сваёй вялікай увазе да творчага вобліку пісьменніка набліжаюцца да літаратурных партрэтаў (раздзелы пра Я. Брыля, М. Танка, А. Куляшова).

Сканцэнтраванасць на мастакоўскай адметнасці адчуваецца таксама ў раздзелах пра К. Чорнага (аўтар—М. Тычына), М. Зарэцкага (І. Чыгрын), М. Лынькова (Э. Гурэвіч), А. Макаёнка (С. Лаўшук), К. Крапіву (С. Андраюк). У апошнім раздзеле асабліва прываблівае ўменне вучонага вельмі важка сказаць пра нацыянальную самабытнасць крапівінскай сатыры.

Варта адзначыць таксама, што аўтары новай кнігі, як правіла, даволі паслядоўна прытрымліваюцца прынцыпаў гістарызму, добра паказваюць асаблівасці літаратуры на розных этапах грамадскага і яе ўласнага развіцця, яе паступальны рух, яе ідэйна-тэматычнае, праблемнае, жанравае і стылявое ўзбагачэнне, выразна вылучаюць новыя рысы, якія адрозніваюць адзін перыяд літаратурнай гісторыі ад другога. Гэта дазваляе ў цэлым аб'ектыўна ацаніць не толькі здабыткі выдатных майстроў, але і такіх значных для свайго часу пісьменнікаў, як Ц. Гартны, М. Чарот і інш.

Арыентуючыся пераважна на вяршынныя дасягненні ў кожнага з тых мастакоў, пра якіх ідзе гаворка ў «Гісторыі», даследчыкі звычайна не забываюць адзначыць і характэрныя выдаткі — незалежна ад таго, датычацца яны ўсёй літаратуры пэўнага перыяду ці толькі асобных аўтараў. Размова пра недахопы вядзецца ў спакойным тоне добра ўзважанага даследавання і пераконвае сваёй доказнасцю.

Аўтарскі калектыў «Гісторыі» выразна адчувае дух нашага часу, суадносячы з гэтым духам сваю гаворку як пра самыя новыя творы, так і пра тое, што стваралася яшчэ ў даваенныя або першыя пасляваенныя гады.

Новая «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» шчодра насычана спасылкамі на важнейшыя партыйныя дакументы па пытаннях літаратуры і мастацтва, у тым ліку на пастанову ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы» і на матэрыялы XXIV і XXV партыйных з'ездаў. Гэтыя дакументы і матэрыялы далі аўтарам адчуванне той вышыні, з якой асэнсоўваюцца літаратурныя з'явы ў новай «Гісторыі», асэнсоўваюцца дасведчана, грунтоўна, на сучасным навуковым узроўні.

Сучасны навуковы ўзровень новай «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» не ў апошнюю чаргу абумоўлены і тым, што яна арганічна ўвабрала ў сябе не толькі ўласныя навуковыя дасягненні аўтараў працы, але і станоўчы вопыт, лепшыя здабыткі ўсяго беларускага літаратуразнаўства і крытыкі апошніх дзесяцігоддзяў. Такім чынам, «Гісторыя» ў пэўным сэнсе падводзіць вынікі вывучэння беларускай савецкай літаратуры як навуковымі супрацоўнікамі Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР, так і беларускім літаратуразнаўствам у цэлым.

Разам з тым цяперашнюю «Гісторыю» ў некаторых адносінах можна лічыць новым крокам у асэнсаванні літаратурнага працэсу ў нашай рэспубліцы, перш за ўсё ў асэнсаванні мастацкіх з'яў сучаснасці, але не толькі іх.

Вельмі высока ацэньваючы новую «Гісторыю беларускай савецкай літаратуры», я, аднак, не збіраюся сцвярджаць, што яна зусім пазбаўлена недахопаў. Тыя ці іншыя недагляды і пралікі ў такіх вялікіх кнігах бадай-што непазбежныя. Ёсць яны і ў новай «Гісторыі», але маюць у асноўным прыватны характар. Так, у раздзеле аб літаратуры 20-х гадоў мне здалося спрэчным сцвярджэнне нібыта на першых апавяданнях З. Бядулі савецкага перыяду адчуваецца ўплыў «эмацыянальна-рамантычнага метаду» М. Зарэцкага. Як сведчаць «Абразкі» і некаторыя іншыя тагачасныя апавяданні пісьменніка, Бядуля яшчэ ў дарэвалюцыйную пару меў вопыт працы ў галіне адкрыта-эмацыянальнай, паэтычна-рамантызаванай прозы. У яе рэчышчы ў 20-я гады ішлі М. Зарэцкі і іншыя прыхільнікі рамантызаванай паэтыкі, якія ў стылявых адносінах фактычна працягвалі і, вядома, развівалі бядулеўскія традыцыі.

У добрым раздзеле пра В. Быкава, напісаным В. Бураном, які шмат зрабіў для вывучэння творчасці гэтага празаіка, негрунтоўным уяўляецца асцярожна выказаны папрок пісьменніку за нібыта працяглую засяроджанасць «на фактах аднаго і таго ж адмоўнага парадку». Гэты папрок наўрад ці слушны і сам па сабе, бо В. Быкаў калі і звяртаецца час ад часу да нейкіх блізкіх з'яў, дык асвятляе іх кожны раз з новага боку ці з новай глыбінёй. А галоўнае, што ў літаратуры справу ў канчатковым выніку вырашае не тое, пра станоўчае ці адмоўнае піша мастак, а яго грамадзянская пазіцыя. Таленавіты сатырык можа ўсё жыццё пісаць менавіта сатырычныя творы. І нікому не прыйдзе ў галаву папракаць яго, прымушаць пераключацца на оды, калі, вядома, нас задавальняе аўтарская пазіцыя ў выкрыцці адмоўнага.

Яшчэ менш можна пагадзіцца з В. Бураном тады, калі ён фактычна ацэньвае творчасць В. Быкава з пункту гледжання таго, ці дае яна ўзнаўленне «праўды вайны ва ўсёй яе паўнаце і складанасці», ці асэнсоўвае ўсе бакі велізарнай народнай эпапеі. Гэтую задачу агульнымі намаганнямі вырашаюць шматлікія савецкія пісьменнікі, у выніку напружанай працы якіх мы ўсё глыбей і глыбей спасцігаем народны подзвіг у барацьбе з фашызмам. Але ўся паўната бяздоннага мора народнай героікі ў гады Айчыннай вайны наўрад ці будзе калі-небудзь вычарпана не толькі В. Быкавым, якім бы значным ні быў яго асабісты ўклад у гэтым плане, але і многімі іншымі пісьменнікамі, разам узятымі. Лічылася ж яшчэ не так даўно амаль вы-

---

«У АДРОЗНЕННЕ АД ІНШЫХ ВЫДАННЯЎ...»

Слоў няма, багатая наша мемуарна-дакументальная спадчына. І не выпадкова чытач цягнецца да твораў гэтага жанру: колькі цікавых і дакладных звестак даюць яны аб гераічных падзеях з гісторыі нашай Радзімы, аб выдатных людзях, дзеячах партыі, палкаводцах і героях рэвалюцыі, грамадзянскай і Айчыннай войнаў... Не буду шмат пералічваць, назаву толькі кнігу «В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте» (успаміны актыўных удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі), выпушчаную ў 1957 годзе ў Мінску тагачасным Дзяржаўным выдавецтвам БССР.

Прызнаюся адразу, што гэтую кнігу ўспамінаў я прыгадваю не без пэўных намераў: буду спасылацца на яе як на своеасаблівую крыніцу фактаў і матэрыялаў для М. Вінагорава, аўтара дакументальнай аповесці «Бронепоезд имени В. И. Ленина», выпушчанай выдавецтвам «Беларусь» (рэдактар М. Плотнікаў) напярэдадні 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Каб пачаць гаворку пра твор М. Вінагорава, прывяду выдавецкую атэстацыю яго: «У дакументальнай аповесці аўтар на аснове шырокага фактычнага матэрыялу расказвае аб перамозе рэвалюцыі ў Мінску ў 1917 годзе, пра бронепоезд імя У. І. Леніна, які прымаў удзел у разгроме контррэвалюцыі, пра подзвіг яго камандзіра, вернага сына Камуністычнай партыі В. А. Пралыгіна і яго баявых сяброў. **У адрозненне ад іншых выданняў** на гэтую тэму (выдзелена мной. — **А. К.**) кніга М. А. Вінагорава больш падрабязна асвятляе барацьбу бальшавікоў супраць контррэвалюцыі...»

Як бачым, атэстацыя вельмі высокая. Яна паддасць ахвоты чытачу, тым больш, што гаворка ідзе пра рашучы і вызначальны момант у гісторыі нашай краіны, рэспублікі. Да гэтай тэмы з хваляваннем, з велізарнай адказнасцю, я галоўнае, з чыстым сумленнем і чыстымі намерамі звярталіся і будуць заўсёды звяртацца мастакі слова, і слова іх — таленавітае, праўдзівае, сумленнае — хвалявала і заўсёды будзе хваляваць людзей.

З давер'ем да аўтара (а як жа інакш!) чытаем дакументальную аповесць «Бронепоезд имени В. И. Ленина». Праўда, адразу насцярожвае бойкасць і зухаватасць выкладання: «Подпрапорщик Пролыгин, невысокий, плотный, лет тридцати с небольшим, увязая в грязи, шел напрямик через поле, между двумя линиями окопов....» Далей апісваюцца ўзаемаадносіны В. Пралыгіна з другім вядомым удзельнікам Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі М. Пятровым, абставіны і настрой у вайсковых падраздзяленнях, уводзяцца новыя дзейныя асобы, паказваецца работа бальшавікоў сярод салдацкай масы.

Падзеі ў аповесці разгортваюцца ў адпаведнасці з гістарычнай праўдай, нярэдка з падрабязнай дэталізацыяй, нібыта аўтар асабіста быў знаёмы са сваімі героямі. У аўтара, бясспрэчна, была надзейная і дакладная крыніца (ці крыніцы), але ён чамусьці лічыць за лепшае пра тое не гаварыць.

І тут успомнілася кніга ўдзельнікаў рэвалюцыі, якую я прыгадаў у пачатку. Вось яна, крыніца! І вось дзе памылка выдавецтва, што нібыта ў адрозненне ад іншых выданняў на гэтую тэму кніга М. Вінагорава «больш падрабязна асвятляе» і г. д. Дзе там! З матэрыялаў сарака ці больш аўтараў паўстае цэласная і праўдзівая панарама барацьбы за Савецкую ўладу ў Беларусі, хоць там не ўсё так выстрасна і падагнана, як у М. Вінагорава. А М. Вінагораў скарыстаў толькі частку ўспамінаў, якія цікавілі яго, у прыватнасці, успаміны В. Кнорына, І. Алібегава, В. Каменшчыкава, М. Пятрова, М. Ціхменева, В. Пралыгіна, І. Макарэвіча, магчыма, яшчэ некаторых аўтараў.

Але як скарыстаў! Ён «сціпла» замоўчвае гэтую шчодрую крыніцу, якая дазволіла яму без лішніх клопатаў чэрпаць звесткі і факты, што называецца, поўніцаю. Так, на стар. 50—51 у М. Вінагорава — пераказ зместу, своеасаблівая камбінацыя звестак, што даюць у сваіх успамінах В. Кнорын (стар. 37—38) і І. Алібегаў (стар. 56—58). Але гэта было б яшчэ паўбяды. М. Вінагораў «упадабаў» не толькі звесткі і факты (без спасылкі на крыніцу, нібыта ён сам іх здабыў карпатлівай працай); чым далей, тым болей мы пераконваемся, што ён «выкарыстоўвае» гатовыя сказы, захоўваючы парадак слоў, сінтаксіс і г. д., натуральна, у адпаведных месцах замяняючы «я» (у аўтара ўспамінаў) на сваё «аб'ектыўнае» «ён» або на ўласнае імя героя, элементарна белетрызуючы чужы тэкст.

Параўнайце:

«На станции Замирье я решил набрать полный тендер угля и воды и потому с ходу подъехал к водоразборной колонке. На платформе мы увидели возбужденную массу народа. Лица одних выражали радость, других — испуг, у иных были кислые физиономии. Комендант станции с бледным лицом подошел к паровозу и спросил:

— Кто у вас начальник?

— Я, — отвечаю.

— Кто вы будете?

— Член Революционного штаба II армии. От его имени действую...» (В. Пралыгін. У рашучы момант. Стар. 257).

«На станции Замирье бронепоезд с ходу подъехал к водоразборной колонке, заправился водой, затем набрал полный тендер угля. На платформе Пролыгин увидел возбужденную толпу народа. Лица одних выражали радость, других — испуг, у иных были кислые физиономии. Вскоре к паровозу подошел человек с бледным лицом, спросил:

— Кто у вас начальник?

— А вы кто такой? — вопросом на вопрос ответил Пролыгин.

— Я комендант станции.

— А я, — сказал Пролыгин, — комендант бронепоезда.

— По чьему приказу вы действуете?

— Я член Революционного штаба 2-й армии, — ответил Пролыгин. — От его имени и действую...» (М. Вінагораў, стар. 99).

Можна прывесці нямала такіх «запазычаных» М. Вінагоравым пасажаў. Вось яшчэ прыклад. У сваіх успамінах, надрукаваных у памянёным зборніку пад загалоўкам «У барацьбе за Кастрычнік на Заходнім фронце», В. Каменшчыкаў так апісвае змяшчэнне галоўнакамандуючага Заходнім фронтам генерала Балуева (стар. 222—223):

«Оставив взвод солдат у входа в штаб, мы вместе с Полукаровым прошли в приемную. Приемная была полна штабными офицерами. Среди них находились командир польского корпуса генерал Довбор-Мусницкий и командир Кавказской кавалерийской дивизии. Офицеры о чем-то жарко спорили и старались что-то доказать один другому. При нашем появлении они замолчали...»

чарпанай таксама вялікая тэма калектывізацыі. А ўзяліся за яе наш І. Мележ, рускі празаік С. Залыгін — і мы ўбачылі новыя глыбінныя пласты, здавалася, добра вядомай тэмы. Што ж датычыць В. Быкава, дык для высокай ацэнкі яго творчасці зусім дастаткова і таго, што пісьменнік, не замахваючыся на ўсебаковасць і вычарпальнасць, адлюстроўвае некаторыя істотныя рысы гераізму народа ў гады Айчыннай вайны, значна паглыбляе і ўзбагачае наша разуменне гэтага гераізму, тым самым уносячы свой важкі ўклад у вялікі калектыўны летапіс савецкай літаратуры, прысвечаны народнаму змаганню.

Некаторыя спрэчныя, на маю думку, палажэнні ёсць і ў раздзеле аб творчасці Я. Коласа. Гэты раздзел належыць В. Каваленку, які, бясспрэчна, з'яўляецца адным з самых таленавітых, цікавых і арыгінальных сучасных крытыкаў. Пра Я. Коласа В. Каваленка таксама піша ўвогуле вельмі змястоўна, глыбока і пераканальна. Але асобныя разважанні даследчыка пра паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка» здаюцца мне недастаткова абгрунтаванымі.

Сустракаюцца ў новай «Гісторыі» разбежкі ў ацэнцы адных і тых жа твораў, літаратурна-мастацкіх і грамадскіх з'яў, калі пра іх ідзе гаворка ў раздзелах, што належаць розным аўтарам. Так, у розных месцах па-рознаму ацэньваюцца некаторыя аспекты ў дзейнасці «Узвышша». У раздзеле пра літаратуру 20-х гадоў гэтая пісьменніцкая арганізацыя па старой традыцыі папракаецца за «вядомую адасобленасць», «акадэмізм». Гэткі папрок фактычна аспрэчвае М. Мушынскі, аналізуючы даваенную крытыку і літаратуразнаўства. Маючы на ўвазе тое ж «Узвышша», ён зазначае, што абвінавачанні «ў замкнёнасці, у сектанцтве арганізацыі і яе крытычнага цэху былі неабгрунтаванымі». Зазначае, вядома, слушна, у адпаведнасці з сапраўдным становішчам рэчаў, з гістарычнымі фактамі, якія, на жаль, працяглы час або скажаліся, або зусім замоўчваліся.

Зрэшты, супярэчлівыя сцвярджэнні і нават абагульняючыя вывады зрэдку пракідаюцца і ў межах аднаго і таго ж раздзела. Напрыклад, аб прозе першага пасляваеннага дзесяцігоддзя М. Ярош піша: «У ёй выразна выявілася тэндэнцыя да эпічнай шырыні, да ўсебаковага адлюстравання народнага жыцця, да стварэння паўнакроўных характараў». Трошкі далей гэтая думка дастасоўваецца і да паэзіі той пары: «У творчасці беларускіх паэтаў... праявілася тэндэнцыя да ўсебаковага, праўдзівага паказу жыцця народа, да раскрыцця ўнутранага свету сучасніка». Гэтыя вывады не толькі не адпавядаюць куды больш складанай і супярэчлівай рэальнасці літаратурнага працэсу ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, але слаба ўзгадняецца і з разумнай думкай даследчыка аб павярхоўнасці тагачаснага разумення самой маштабнасці, і з яго ўласнымі заявамі аб тым, што «эстэтычнае асэнсаванне пасляваеннага жыцця некаторы час заставалася аднабаковым... Па сутнасці, ігнараваўся складаны дыялектычны працэс росту, пераадолення цяжкасцей», «яўна пераважала тэндэнцыя ўслаўляць толькі поспехі, радасці мірнага жыцця», а будзённыя праявы рэчаіснасці, звычайныя клопаты людзей, іх беды і цяжкасці тады рэдка траплялі ў поле зроку літаратуры і асэнсоўваліся ёю вельмі спрошчана, тлумачыліся толькі «неўладкаванасцю, выкліканай вайною».

Апошнія сцвярджэнні якраз і маюць пад сабою рэальны грунт, бо менавіта выбарачнасць у адлюстраванні рэчаіснасці, малая ўвага да глыбінных асноў народнага жыцця, недастаткова праўдзівы паказ многіх яго сфер і праяў, схематызацыя і дэкларацыйнасць у выяўленні ўнутранага свету чалавека складаюць найбольш прыкметныя слабасці літаратуры першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, з'яўляюцца такімі яе недахопамі, якія ў той ці іншай меры адчуваюцца ў тагачаснай творчасці нават лепшых нашых пісьменнікаў. Гаварыў жа М. Танк на Трэцім з'ездзе СП БССР: «Мы няправільна падыходзім да стварэння сучаснага героя, калі ў дэталях выпісваем толькі яго партрэт, яго прафесію, не надзяляючы героя глыбокімі думкамі, светапоглядам, не даючы яму вырашаць жыццёвых пытанняў, а разам з імі і самі абыходзім іх». Будучы вельмі самакрытычным, паэт, аднак, меў на ўвазе не толькі сябе, а і сваіх таварышаў па літаратурнай працы.

Далейшы рух літаратуры, глыбінныя якасныя змены ў ёй на сучасным этапе, добра падкрэсленыя ў адпаведных раздзелах «Гісторыі», галоўным чынам і звязаны з узмацненнем праўдзівасці, даследчага і гуманістычнага пафасу ў адлюстраванні разнастайных сфер народнага жыцця.

Супярэчлівасць і часам недакладнасці дапускаюцца ў «Гісторыі» ў адносінах датавання асобных твораў. Напрыклад, паэма «Сымон-музыка» спачатку датуецца толькі 1918—1925 гадамі (раздзел пра літаратуру 20-х гадоў), а потым (у манаграфічнай характарыстыцы, прысвечанай Я. Коласу) называецца 1910 год як пачатак працы аўтара над гэтым творам і «Новай зямлёй», хаця ўжо дакладна ўстаноўлена, што абедзве паэмы народны паэт пачаў пісаць у 1911 годзе.

У змястоўным раздзеле пра творчасць М. Лынькова сцвярджаецца, што апавяданне пісьменніка «З пражытых год» напісана на некалькі гадоў раней, чым «Гой». На самой справе абодва творы датуюцца 1926 годам. Недакладнасць адносна першага апавядання мае сваю даўнюю гісторыю. Яна ўзнікла яшчэ ў першай публікацыі твора ў альманаху «Уздым», дзе гэтае апавяданне пазначана 1922 годам. Але гэта датаванне не часу напісання твора, а тых падзей, якія ў ім адлюстраваны. Аб тым, што сам твор пісаўся пазней, у 1926 годзе, пасведчыў аўтар у адной з гутарак пасляваеннага часу.

У вельмі добра, таленавіта напісаным раздзеле пра А. Куляшова паэма «Далёка да акіяна» датуецца 1971 годам. Тут яўная памылка, бо ўжо ў 1970 годзе твор друкаваўся ў «Полымі» і тады ж змяшчаўся ў зборніку «Сасна і бяроза».

Як звычайную апіску трэба разглядаць датаванне 1929 годам паэмы У. Дубоўкі «Крычаўская спакуса», якая напісана ў 1959 годзе. Гэтая дата, відаць, і мелася на ўвазе аўтарам раздзела, бо паэма слушна разглядаецца пры аналізе пасляваеннай творчасці пісьменніка. Мусіць, такой жа апіскай народжаны **І. Ладыгін**, які ў аўтара (раман «У добры час» І. Шамякіна) мае прозвішча **Ладынін.**

Не пашанцавала ў «Гісторыі» некаторым творам І. Мележа. Адно яго апавяданне («Такі кароткі водпуск») М. Ярош прыпісвае А. Кулакоўскаму, а другое («У гарах дажджы») называе сярод твораў пра вайну, хаця яно адлюстроўвае эпізод, звязаны з даваенным жыццём.

Асобныя даследчыкі не заўсёды ўлічваюць пазнейшыя рэдакцыі твораў, змены ў іх назвах і г. д. Так, у раздзеле пра паэзію першага пасляваеннага дзесяцігоддзя згадваецца паэма А. Куляшова «Простыя людзі», хаця аўтар ужо адмовіўся ад гэтага загалоўка. Цяпер яго твор мае назву «Перамога». Зняў паэт і эпілог, зрабіўшы яго самастойным вершам. Даследчык жа нічога не гаворыць ні пра змену загалоўка, ні пра тое, што ў апошняй аўтарскай рэдакцыі ніякага эпілога няма.

Прыкрае ўражанне пакідаюць выпадкі разнабою і асабліва недакладнасці ў перакладах беларускіх назваў на рускую мову. Скажам, паэма М. Танка «Пражскі дзённік» у адных выпадках так называецца і па-руску (і гэта слушна), а ў іншых—даецца пад загалоўкам «За мир!». Не ўсякі чытач здагадаецца, што і там і тут гаворка ідзе пра адзін і той жа твор. Зборнік П. Броўкі «Пахне чабор» у перакладзе гучыць то як «Пахнет чабрец», то як «Пахнет чабёр», а назва кнігі В. Карамазава «Падранак» (тэрмін з паляўнічай галіны) па-руску перакладзена «Под утро», што зусім не адпавядае сэнсу аўтарскага загалоўка.

Такія апіскі і недагляды, вядома, не ўпрыгожваюць «Гісторыю». Але яны не могуць перакрэсліць высокія навуковыя вартасці кнігі, якая, можна не сумнявацца, адыграе сваю ролю ў азнаямленні ўсесаюзнага чытача з лепшымі здабыткамі беларускага слова, прынясе бясспрэчную карысць шматлікім колам чытачоў у самой Беларусі.

Дзмітрый БУГАЁЎ.

Гэты ўступ да эпізоду М. Вінагораў пераказвае «сваімі» словамі, але тое, што крыніцай яму паслужылі ўспаміны В. Каменшчыкава, не выклікае сумнення. Мяркуйце самі. М. Вінагораў піша:

«Подполковника Каменщикова и Полукарова, выполнявшего роль штабного работника для поручений, встретили в приемной многие штабные офицеры. Там же были генерал Довбор-Мусницкий и командир Кавказской кавдивизии. Легко представить, как были озлоблены генералы и офицеры, предвидевшие отставку...» (стар. 162).

Далей В. Каменшчыкаў:

«Ко мне быстро подошли генерал Довбор-Мусницкий и командир Кавказской кавалерийской дивизии. Они так «ласково» взглянули на меня, что, казалось, готовы были проглотить.

— Подполковник, мы не позволим вам учинить насилие! Я вызову сейчас же на защиту штаба свои части,—почти крикнул генерал Довбор-Мусницкий.

— Я вызову свои полки,—так же решительно вторил ему командир кавалерийской дивизии.

Они, как видно, хотели взять меня на испуг. Меня плотной стеной окружили штабные офицеры; нужно было действовать решительно, не показывая ни малейшего волнения.

— Господин генерал, — ответил я Довбор-Мусницкому, — вы полагаете, что, предпринимая такой шаг, как смена главнокомандующего, мы не подумали, что это произойдет без борьбы? Все нами взвешено и учтено, и я заявляю вам, генерал Довбор-Мусницкий, что если ваши солдаты выйдут из казарм по вашему приказанию, то они будут расстреляны. Что же касается кавалерии,—обратился я к командиру Кавказской кавалерийской дивизии,—то вам, генерал, заявляю, что вряд ли ваши полки выполнят ваше приказание. А если они и выступят, то дальше окраин города им не пройти, они будут разбиты...»

А вось як «арыгінальна» гучыць гэтая мясціна ў М. Вінагорава:

«Подполковник! — преградил дорогу генерал Довбор-Мусницкий.—Мы не позволим вам учинить насилие! Я вызову сейчас же на защиту штаба свои войска.

Подскочил и командир кавдивизии:

— Я тоже вызову свои полки,—замахал он костлявой рукой. (Істотнае ўдакладненне! — А. К.).

Каменщикова и Полукарова плотной стеной окружили штабные офицеры, которые, видимо, уже до этого выучили свою роль в комедии нагнетания страха. (Вартыя жалю намаганні прыкрыцца фігавым лістком! — А. К.). Но они напали не на робких.

— Генерал, — ответил Каменщиков Довбор-Мусницкому, — вы полагаете, что предпринимая такой шаг, как смена главнокомандующего, мы не подумали, что может произойти борьба? Все нами взвешено и учтено. Нам даже известно, что Ставка замышляет вместо генерала Балуева поставить вас, генерал Довбор-Мусницкий. (Гэта ўжо нешта новае, але ці не беспадстаўная выдумка?—А. К.). Отсюда и ваше усердие. К счастью, от Ставки это уже не зависит. Я заявляю вам, генерал, что если ваши солдаты выйдут из казарм по вашему приказанию, то они будут расстреляны. Что же касается кавалерии,—обратился Каменщиков к командиру кавдивизии,—то вам, генерал, заявляю, что вряд ли ваши полки выполнят ваше приказание. А если они и выступят, то дальше окраин города им не пройти, они будут разбиты...» (М. Вінагораў, стар. 162—163).

Як чытач пераканаўся, М. Вінагораў цэлыя старонкі «запазычыў» у аўтараў успамінаў, скапіраваў да слова, калі не лічыць асобных, трэба сказаць, шкалярскіх паправак, накшталт «подскочил и командир кавдивизии» і інш.

Праўда, у некаторых выпадках, нібы засаромеўшыся, М. Вінагораў спасылаецца на асобных, вельмі нямногіх аўтараў — напрыклад, на старонцы 112 ён упамінае П. Жуковіна, гаворыць пра артыкул «Звязды» ад 3 лістапада 1917 года (стар. 130), прыгадвае ўспаміны І. Макарэвіча і артыкул (?—А. К.) В. Пралыгіна, на некаторыя дакументы ЦДАСА. Але нідзе ні словам не гаворыць пра сваю галоўную і ледзь не адзіную крыніцу — зборнік «В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте».

Алесь КУЗНЯЦОЎ.

КНІГАПІС

Ф. КАЗЛОЎСКІ. «Трэці» выходзіць на сувязь. Аповесць і апавяданні. На рускай мове. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1977.

Пра мужнасць савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пра гераізм падпольшчыкаў і партызан расказвае пісьменнік Фелікс Казлоўскі ў аповесці «Трэці» выходзіць на сувязь», якая дала назву яго новай кнізе.

Падзеі ў творы развіваюцца напружана, дынамічна. З цеплынёй піша аўтар пра партызан і ў першую чаргу — пра камандзіра партызанскай брыгады Куневіча, камісара Бабенку. Менавіта дзякуючы іх прадуманым дзеянням планы ворага церпяць крах, народныя мсціўцы прарываюць варожую бланаду.

Праблемы станаўлення асобы закранаюцца ў апавяданнях, што ўвайшлі ў зборнік — «Сустрэча», «Забойства ў скверы», «Пунсовыя кветкі», «Позняя размова».

Я. ДРОМІН.

А. АДАМОВІЧ, Я. БРЫЛЬ, У. КАЛЕСНІК. Я з вогненнай вёскі... На ўкраінскай мове. Кіеў, «Дніпро», 1977.

«Я з вогненнай вёскі...» —«дакументальная трагедыя, кніга-памяць, жывы голас людзей, што былі спалены, забіты разам з сям'ёй, разам са сваёй вёскай, і якія жывуць» (так пісалі ў прадмове да кнігі яе стваральнікі Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік)—пядаўна ўбачыла свет на Украіне.

«Дзевяць тысяч дзвесце беларускіх вёсак знішчылі і спалілі гітлераўцы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а разам з імі сотні тысяч жыхароў, — гаворыцца ў рэдакцыйнай нататцы, вынесенай на вокладку. — У гэтай кнізе сабраны хвалюючыя, поўныя драматызму і трагедыйнасці расказы людзей, якіх расстрэльвалі і спальвалі жыўцом і якія цудам ацалелі ад смерці. Нясцерпна балючыя, крывавыя словы іх — гнеўнае абвінавачанне тым, хто сёння на Захадзе намагаецца апраўдаць забойцаў». «Не! Няма ім апраўдання!» — крычыць памяць гэтых людзей, як перасцярога, як заклік на ўвесь свет, каб наступныя пакаленні на зямлі ніколі не зведалі такога шалёнага ліхалецця».

Аўтарызаваны пераклад зроблены актыўнай перакладчыцай і папулярызатарам беларускай літаратуры на Украіне Маяй Львовіч.

В. ЛЯВОНЦЬЕЎ.

Р. ЯРОХІН, Ю. САПАЖКОЎ. Сэрца помніць. Нарысы. На рускай мове. Мінск, «Беларусь», 1977.

Кожная новая кніга, у якой узнаўляецца дарагі, непаўторны і незабыўны воблік Уладзіміра Ільіча Леніна, успрымаецца з асаблівай цікавасцю і хваляваннем. Безумоўна, шмат радасных хвілін прынясе многім чытачам і зборнік нарысаў «Сэрца помніць». Яго аўтары — беларускія журналісты Раман Ярохін і Юрый Сапажкоў — расказваюць пра мясціны, звязаныя з жыццём і рэвалюцыйнай дзейнасцю Ільіча.

Ульянаўск і Канушкіна, Казань і Масква, Уладзімір і Горкі, Ленінград і Выбарг, Парыж і Лондан — адрасы іх паездак. У зборніку вынарыстаны не толькі асабістыя ўражанні аўтараў, але і факты з жыцця правадыра працоўных, архіўныя матэрыялы.

А. КАЗЛОЎСКІ.

Паездка па спакой

Леанід КАЛОДЗЕЖНЫ

АПАВЯДАННЕ

Выправішся ў кароткі перадвыходны дзень, калі не заладзіцца работа або дома парушыцца спакой, калі, змардаваны клопатамі і згрызотамі, адчуеш, што няўсцерп, калі не ведаеш, куды падзець сябе.

Станцыя стрэне глухім гоманам, няўрымслівай, залішне бойкай мітуснёй. Людзі будуць тасавацца, лезці туды, сюды.

Да білетных кас аж праз усю залу выцягнуцца чэргі. Адшукаеш пагрэбную табе, папытаеш канцавога і памалу, бы спутаны, паціснешся ў бок акенца. Хутка за табой прыстрояцца яшчэ і яшчэ. Сціснуць — не павярнуцца. І так мінут дваццаць, а то і паўгадзіны прамарнуешся. Абавязкова знойдзецца маладзічка, якой не па нутру таўкатня, якая не захоча пацець і папрэ напралом: маўляў, я стаяла, не маеце права, узніме гвалт. Яе, хоць і не бачылі, прапусцяць — не сварыцца ж! — вясёлыя дзецюкі. Бачачы такое, паспрабуе прарвацца і сярэдняга веку мужчына пад замусоленым гальштукам неакрэсленага занятку: ні рабочы, ні інтэлігент. Веселуны-дзецюкі перагародзяць дарогу, закрыюць шырокімі плячыма. Мужчына закрычыць: «Яны ж п'яненькія! Самі не абілечваюцца і іншым не даюць! Непарадак! Куды міліцыя глядзіць!?»

Апынешся перад акенцам, падасі касірцы даўно падрыхтаваную, нагрэтую ў жмені дробязь, атрымаеш ружовы білецік і рушыш на свежае паветра. Выберашся, абмацаеш гузікі, зашпілішся і спакваля, падстаўляючы рахманаму ветрыку твар, пакрочыш пад бетонны казырок, дзе ўздоўж пасадачнай пляцоўкі выстрайваецца люд.

Са стаянкі кранаецца аўтобус. Яго заўважаць, і нехта нецярплівы не ўтрымаецца, гукне: «Наш, Берасценаўскі!» Натоўп захвалюецца, забунтуе, рынецца насустрач. Кагосьці адціснуць, якісьці таўсташыі здаравяка паплішчыцца напралом.

Дык не прашчэмішся.

Тлум уляжацца, як узвые матор, як хіснешся ўзадуперад.

Сярод нямногіх, цяпер стрымана-абачлівых галасоў, вуха вылучыць адзін, адкрыта-няхітры, старэчы, аднак звонкі.

— Э, во! Не пазнала, Вулляначка, цябе! Мусіць, гадкоў пяць не сустракаліся. Больш? А-а. Нядзіва. Кажаш, жывеш паціху? Ну і слава богу! Адкуль жа дабіраешся? У дачкі была?Так-так. Гасціла? Унука яньчыла? Добра. Не зусім? Чаму? З мужыком дачка развялася? Ы-ы-ы. Зараз такое не нова. А я і Гануля ўнь у магазіны ездзілі. Купілі таго-сяго. Наш жа пад замком. Прадаўшчыца пралічылася, рукі пагрэла. Думала — не ўсплыве. Аж — не. Рэвізія цяперака...

Голас падасца знаёмы. Закарціць паглядзець, каму ён належыць, хто гэта сакоча так. Павернешся, убачыш шчупленькую бабульку. Дык то ж — Хоўра Салаўянская. Драбнатварая, маршчынаватая, худзенькая, прыткнецца яна ўскрай сядзення ля самага ўваходу, ашчагерыць парэпанымі рукамі пастаўленую на калені лазовую, да верху напакаваную і так-сяк прыкрытую старэнькай лайнінай кашолку, з якой, хавай—не хавай, выпруцца слюдзяністыя хвасты марожанай рыбы, ашчадна абгорнутай шэрай паперай, або пакажа румяны мысок батон, прыладзіцца Хоўра, высуне з-пад хусткі вуха і будзе не столькі слухаць, колькі сама, што сарока, сакатаць, гаварыць, гаварыць.

Праплыве паўз вокны і застанецца ззаду няроўны строй дамоў. Замільгаціць сумная, непрыглядная сваім бязладдзем ускраіна.

Палову Кабыляцкай гары аўтобус адолее лёгка. Потым натужна завые, папаўзе, сярдзіта зачмыхае; пераваліць грэбень, памарудзіць, ледзьве не заглохне; нарэшце быццам апамятаецца і ўздумае нагнаць упушчанае, рванецца, пакоціць наперад.

Прамчыць нямнога. Супраць цагельні перад Андрэеўшчынай ён зноў сцішыць бег, паверне ў лясок на Міцькаўскі шлях; спыніцца, выпусціць першых пасажыраў.

Далей пойдзе ладна выбітая гравейка. Цябе затрасе, заліхаманіць. Праз адчыненыя вокны, люкі хлыне смольны водар хвоі, а неўзабаве, калі воку адкрыюцца палі, уварвецца пах то саладжава-прытарны— лубіну, то пяшчотна-шчымлівы — канюшыны, то густы, аж перасядае ў горле, сытны, што чэрствы хлеб, — збажыны і абавязкова ўсю дарогу дасць аб сабе ведаць гаркавы — угрэтай паўдзённым сонцам бярозавай лістоты.

— На Солаўе хто ёсць? — пасля другога прыпынку пацікавіцца шафёр.

— Ёсць, ёсць! — адгукнешся.

Перад лагчынай аўтобус збочыць і стане. Скрыгнуць дзверы. Выберашся. Следам вылузнуцца Хоўра і Гануля, абедзве маленькія, гаваркія. Кіўнеш ім галавой, скажаш «Добры дзень», дасі аўтобусу крануцца і закурыш.

Разы са два жанчыны азірнуцца: ці ідзеш за імі? Але хутка забудуць пра цябе, разуюцца і басанож пацюхаюць, загамоняць.

Пакрочыш і ты, паціху, бо захочацца даўжэй пабыць сам-насам. Ад усведамлення, што непрыемнасці застануцца далёка, што там, куды дабіраешся — спакой, аж двухдзённае забыццё, зробіцца лёгка і суцешна.

Парэзаная глыбокімі удаўненымі каляінамі дарога перапаўзе лугавіну і скіруе ў сыраватыя, аплеценыя калючай ажынай і маліннікам хмызы, але мінут праз колькі выскачыць, пацягнецца пабліз балацявін, зарослых асіннікам, бярозкамі, купкаватым ракітнікам, дзе табе давядзецца не раз секчы дровы, выкошваць лапіны драціністага мятлюгу або шукаць цубкія падасінавікі. Паперадзе з-за жыта будуць тыркацца — то знікаць, то паказвацца — галовы жанчын і амаль бесперапынна даносіцца галасы.

Пакажацца мураваная салаўянская царква, забытая, паўразваленая. Даўно змоўкнуць яе званы, даўно страціць яна патрэбу і цікавасць. Не-не ўспомняць салаўяне пра тое ці іншае здарэнне, здзеянае ў ёй альбо пад яе сценамі. А іх, здарэнняў тых, процьма. Смешных, сумных.

Прыгадаецца пагудка аб самым адметным. Неаднойчы раскажуць, як пасля, калі адрачэцца поп, на царкве, на самай макаўцы кагосьці заўважаць. Ён пачне паяўляцца там галяком. Пры месячку будзе рабіць рукамі незразумелыя рухі. Старыя набожна мовяць: святое прадвесце, анёл! Старшыня калгаса Каранцэвіч наважыцца паглядзець «жывога анёла». Ветраным надвор'ем забярэцца прыцемкам у царкву, залезе пад бляшаны купал, на любую за распоркай-брусам схованку. «Анёл» заявіцца без спазнення. Пасапе, скіче апрагку і борзда шмыгне праз дзірку да крыжа. Каранцэвіч счакае мінуту і асцярожна пакрадзецца следам. Боскі пасланнік зойме сваё месца. Віхляючы далёка не анёльскім азадкам, захрысціцца. Старшыня высунецца, жыгане «анёла» лазіною. Той нема ўскрыкне, заверашчыць. То будзе Марка — сын былога царкоўнага старасты Таркачэнкі...

Усплыве і сваё. Царква для нас, для дзятвы, стане месцам зборышчаў. Тут, балазе побач шырокі цвінтар, дзе раней сыдзе снег і прасохне, мы днямі будзем бавіцца лаптой, а вечарамі гуляць у хованкі. Бегатня, крык, пакуль мацеры не патураць дадому. Часцяком нам выпадзе лазіць на царкоўнае гарышча лавіць галубоў. Дамовімся, каму першаму падавацца, і паціснемся праз аконныя краты; ляскаючы зубамі не столькі ад скразнякоў, колькі ад таемных шорахаў, пакараскаемся па крутой падгнілай лесвіцы. Павуцінне аблепіць твары. Пакоіцца халодны пот. Узбяромся. Набіваючы аб распорку гузакі, загародзім дзіркі. Нехта асвеціць ліхтарыкам закуткі, чымсьці замахае, шпурне. Ашаломленыя галубы ўзнімуць мітусню, залопаюць крыллем, шугануць у знаёмыя лазы і не мінуць рук...

Задуменны, павернеш на стары Кацярынінскі шлях, адмераеш сотню—паўтары крокаў і, адурманены пахам нечапанай травы, атлумлены несціханым гудам пчол, спынішся, акінеш залітую гарачым сонцам далеч палёў, блакітнае, без адзінай хмурынкі неба. Убачыш высока над галавой ледзь прыкметнага коршака, уздыхнеш — як хораша! Дзеля гэтага, гэтых мінут і ўцячэш сюды. Адпраўляючыся раніцой на работу, маўкліва, не кажучы ні слова жонцы, бо яна нават не павернецца, бо па-ранейшаму будзе дзьмуцца, прыхопіш сакваяж, адпрацуеш і — дай бог крылы!

Яшчэ здалёку сярод вуліцы супраць сваёй хаціны заўважыш кульгавую Насту, якая падапрэцца кульбай, падцягне адну, караткаватую нагу, прыслоніць да вачэй далонь і, быццам чапля тая, будзе ўзірацца, віжаваць, распазнаваць цябе.

— А я думаю, хто там! — калі наблізішся, калі параўняешся, усклікне яна. — Матка твая і казала-ткі — прыедзеш.

За царквой, сам не ўведаеш чаму, паддасі кроку, папрастуеш, збіваючы з чаравікаў дарожны пыл, па мяккаму аксаміту мурагу. Пройдзеш уздоўж цянлівай сцяны вішанніку, што схавае хату, спынішся ля пахіленых рыпучых весніц, адчыніш іх, патупаеш пазначанай між хвашчастых раманоў сцежкай; акідваючы вокны, прадыбаеш паўз прызбу, ступіш на дашчаны, чыста вымыты, выдраены галеньчыкам, аж ззяе васковай жаўцізной, ганак; пхнеш дзверы — зачынены. Затопчашся, паставіш цяжкі сакваяж. Захочацца сесці, бо адчуеш, як млява загудуць ногі, але не апусцішся — рушыш вакол хаты; спудзіш паўсонных курэй; цераз падворак, ускрай якога будуць ляжаць прывезеныя даўней, так і непасечаныя дровы, зірнеш у гарод — можа, там бацька і маці? Не, няма. Пэўна, у садку? Абагнеш хлеў, глянеш туды-сюды — таксама нікога. Значыцца, дома старыя. Натаміліся, відаць, і ляжаць, адпачываюць. Узбоч пруткай цімафееўкай сіганеш да яблыні, выбераш жаўтлявых ападкаў белага наліву, прагоніш смагу і павернеш назад. Аднекуль бясшумна з'явіцца рабы, ласняны, разумны і надта зброднлівы кот. Ён пазнае цябе, ветліва затрэцца ля ног, замяўкае; не забудзе, шэльма, што мінулы раз даваў яму каўбасы, што заўсёды расшчодрываешся; зразумее, што і цяпер не так сабе прыехаў, што прывёз не тое, дык другое; увяжацца следам, і хочаш — не хочаш, насунешся на сакваяж, мусіш частаваць.

Увойдзеш праз другія, са двара, дзверы, бразнеш клямкай, павітаешся. За перагародкай жвава рыпнуць спружыны матраца, і з-за кваццістых занавесак пакажацца маці.

— Я-ткі і чула — нехта грукнуў! — абрадуецца яна. — Узнялася — ціха.

— Нездаровіцца? — спагадліва пацікавішся.

— Галава баліць. Колькі там папоўзала, папалола, папяклася і — во, — паскардзіцца. — Хварэю. Рукі, ногі трасуцца. Па-добраму — ляжаць бы мне. Дык работы... Парадчыш, мяцеш, шкрабеш.

— Меней шчыруй, — скажаш.

— На каго ж спадзявацца? На бацьку? Бацька таксама выдахся. Крэкча, стогне, перхае. Хапае і яму.

— А дзе ж ён? — азірнешся.

— Ай, у нас няшчасце за няшчасцем. Кабанчык вунь не ўстае і есці не бярэ. Крый бог, прападзе. Пакліч, кажу, ветэрынара. Дык паехаў.

Маці ўздыхне, сядзе насупраць, дапытліва акіне цябе і, забыўшыся пра сваё, адчуўшы нядобрае, затрывожыцца, нечакана папытае:

— Адзін прыехаў?

— Бачыш — адзін.

— Чаму Ніну, Алу не ўзяў? — пачне дазнавацца пра жонку і дачку.

— Некалі Ніне.

— Зноў пасварыліся? — затуманяцца яе вочы.

— Ды не, — паспрабуеш зманіць.

— Што ў вас там? — не паверыць.

— Усё нармальна, — не прызнаешся і, жадаючы хутчэй скончыць непрыемную размову, роблена разлуешся, здзівішся: — Адкуль ты ўзяла?

— Эх, дзеці, дзеці! Чаго вам няма міру? Ладзь ты ўжо. Ну, пакрычыць Ніна — змоўчы. Набярыся цярпення. Трэба ж камусьці ўступаць.

Маці задрымкае заслонкай, замітусіцца ля печы. Сходзіць у кладоўку, затанцуе перад шафай, зазвініць талеркамі. На стале з'явяцца сырыя і вараныя яйкі, каўбух, смятана, кавалак твайго любімага ўпрэлага любовага мяса.

— Еш, — не скажа — загадае і задумліва замрэ: ці ўсё паставіла, але тут жа схамянецца, дастане з-за шафы бутэльку. — Во, галава! Гарэлку ж не падала. Выпі чарку — смачней укусіш.

Цяпер маці спакойна апусціцца побач і неяк непрыкметна загаворыць пра вясковыя навіны, якія яшчэ не ўлягуцца і будуць турбаваць. Са смуткам і жалем паведаміць, што памёр малады такі — жыць ды жыць — Аксінін Жэнька. Раскажа, што Рыгорка Царанок павысек паўз лог бярэзнік. Неяк ціха нагадае, што Мар'ю Пандзюрыху забраў да сябе сын Валодзя, паскардзіцца, што суседка — касаватая, уедлівая Мархва — забіла (бегаў да яе курэй) іхняга пеўня. Нявесела пасміхаючыся, успомніць, што п'янымі пабіліся Хвёдар і Шурка Гуцік, і, пэўна, будзе суд, бо Хвёдару Шурка выкрышыў два зубы.

Паабедаеш, пераапранешся. Адзенеш усё старое і зазбіраешся секчы, ладкаваць дровы.

— Адпачыў бы, — прыбярэ тым часам маці посуд і выйдзе следам. — Самая задуха зараз.

— Калі ж працаваць? Раніцой — росна, днём — млосна, а вечарам — камары кусаюць, — пажартуеш.

— Тады касіў бы цімафееўку. Людзі адсенавалі ўжо. Трэба і нам неяк ухапіць. Перастойвае наша. Хоць і другі ўкос, а вырасла — каноплі і каноплі. Бацька браўся, пакрактаў трохі, пчальнік агораў і адцураўся — цяжка, няссіліць. Табе пакінуў.

— Мне — дык мне!

Са старой разгалістай слівіны знімеш выкляпаную ясную, схопленую там-сям налётам свежай іржы дзевяціручку, знойдзеш на вышчарбленым вугле даволі сцёртую мянташку і пакіруеш у пазахлеў'е.

Белае сонца даўно возьме самую высокую паўдзённую адмеціну, пахіліцца ўніз, аднак спёка не паменшае, а, надварот, узмацніцца, дасягне найбольшай сілы.

Не заўважыш, калі паявіцца бацька. Убачыш яго ўжо блізка. Яшчэ не вітаючыся, ён возьме пук падрэзаных сцяблоў, патрасе імі, патрэ выкалашаныя шышкаватыя стрыбулі-кацелкі і, каб апраўдацца, чаму сам дасюль не скасіў, схітруе:

— А я не спяшаўся, адкладваў. Думаў, няхай пагрубее. Можа, рана пачаў?

— Не, чаго, — адкажаш. — Пара. Ды і надвор'е добрае. Глядзіш, спакойна, адным прыскакам высушым, у пуню сцягаем. Не тое, што першы ўкос па каліву з-пад дажджу хапалі.

— І то праўда. Калі так — тады, канечне, час.

Пасля гэтага бацька, нарэшце, падасць руку — ну, здароў быў — і апусціцца на бухматы вал. Супраць уляжашся ты. Папытаеш, ці прыязджаў ветэрынар. Стары хітне галавой: не, не знайшоў; растлумачыць: заняты — кіровам прышчэпку супраць яшчура робіць.

Над суседскімі садкамі, рыхтуючыся нырнуць за іх, павісне парыжэлае сонца. Упадуць, праз увесь гарод распластаюцца сінія цені. Ад зямлі павее халадком. З'явяцца, заныюць першыя, пакуль не вельмі злыя камары.

Устанеш, пагоніш недакончаны пакос.

— Закругляйся, — не ўседзіцца бацьку. — Заўтра ранічкай з расой змахнеш. Лазня сёння. Васіль Балашэнка паліць. Недзе гатова ўжо.

— Мыўся ж пазаўчора.

— Папарышся, — заўважыць стары тваё ваганне. — Канчай. Пойдзем.

Пагадзішся — сапраўды, чаму б не схадзіць?

Хутка маці збярэ бялізну, дастане з куфра ўціральнік, знойдзе мыла, рагожку; пакладзе ўсё ля тазіка пасярэдзіне ўслона, побач са свежым — гадзіну назад нарэжа над раўком у бярэзніку бацька — ёмкім венікам.

Толькі спусцішся на лог — пачуеш мужчынскія галасы, а неўзабаве з-за пагорка ўбачыш пад лазняй і саміх мужчын, заўзятых ахвотнікаў «пагрэцца», якія, каб не ўпусціць пару, збяруцца загадзя. Першых пазнаеш былога каваля, зласлівага аднавокага Сямёна Вераб'я і няўрымслівага, кампанейскага Віцьку Леванёнка, празванага Кумам. Гэтую мянушку ён атрымаў таму, што займеў шмат хрэснікаў. Ля Віцькі ўгледзіш Кацая — слыннага музыканта, без якога не абыдзецца ніводнага вяселля, ніводных радзін ці провадаў у армію. Прыкмеціш даўгавязага камбайнера Ярмака, унурлівага Рыгорку Царанка. Яны будуць кагосьці вінаваціць, сварыцца паміж сабой.

Мужчыны заўважаць цябе і бацьку, змоўкнуць, павернуць галовы, дачакаюцца твайго прывітання і тут жа, не столькі з-за цікавасці, колькі для парадку, паўжартам сыпануць, быццам гарохам:

— Прыехаў свежым паветрам падыхаць?

— Дамоў пацягнула?

— Ссумаваўся па Солаўю?

Слязліва міргаючы чырвонымі вачыма, Васіль Балашэнка вынесе поўнае вядро жару ды галавешак; вернецца назад, прыгаворваючы: «Горыч вон, слодыч у лазню», акоціць сцюдзёнкай чорныя закапцелыя сцены, палок, квартай кіпеню абдасць раскаленыя камяні і туды гукне: «Хто смелы—заходзь!»

Не без смешыкаў мужчыны пачнуць распранацца, вешаць, складваць адзенне. Бадай, у кожнага ўгледзіш на целе то шрам, то ладны рубец —адмеціны вайны ці нейкага мірнага занятку.

Раней усіх шмыгнуць парыцца Верабей і Леванёнак. Нехта з іх чабурдыхне кварту вады. Вухне печ.

— О-го-го-го! — данясецца Сямёнаў голас. — А-я-я-я! — зойдзецца былы каваль.

— У-у-ух! — зацёхае венікам Віцька. — А-та-та-та! Во дзе рай! Яшчэ б трошкі паддаць!

— Х-хопіць! — ледзь не млеючы, задзеразуецца, прахрыпіць старэйшы — Сямён.

— Грамульку б, не больш!., — падасца Віцьку мала.

Празмерная ягоная жадлівасць гады два назад народзіць цэлую гісторыю і набудзе немалую вядомасць. Аб ёй часта ўспомняць са смехам. Неяк Леванёнку надарыцца трапіць у лазню да свайго міцькаўскага кума Адама Буланка. Там ён, балазе дарвецца, перасядзіць усіх міцькаўцаў. Застанецца толькі Павел Гаранёк — выдумшчык і не меншы ахвотнік папарыцца. Але і Гаранёк урэшце не вытрымае — капітулюе. Кіруючыся дадому, паганьблены міцькавец убачыць, што Віцька залезе на палок апошні раз, возьме ды падапрэ дзверы. Выпусцяць Віцьку жанчыны. Віцька не застанецца даўжнікам. Падбярэ момант і адплаціць Гараньку — знясе апратку. Выйдзе Павел — няма бялізны. Туды-сюды нікне — бяда: во-во жанчыны падаспеюць. Агледзіцца ён і, прыкрываючы тазікам перад, а тыл — венікам, зладзеявата прыгінаючыся, пашпарыць межамі. Праскочыць сваю канюшыну і ўскрай бульбы ледзь не зваліць цешчу, якой собіць рваць парсюку макрыцы. Старая не расшалопіць, хто, адкуль і чаго накінуўся, напалохаецца, ірване прэч, залямантуе: свят, свят, свят, ратуйце! Паўлаў сабака таксама не прызнае гаспадара і падвоіць вэрхал — зальецца пад хлявом, быццам недарэзаны. Суніміць лямант жонка, маўляў, сціхніце, вы, то ж — свой, Павел наш!

Чырвоныя, што апараныя ракі, разгарачаныя Верабей і Леванёнак, вынесшы здаровы пах бярозавых венікаў, напаўняючы прымыльнік вільготным цяплом, вылецяць разам. Сямён тую ж мінуту намацае шырокую лаву, расслабіцца, а Віцька падступіць да цабэрка, пачэрпне балейкай халоднай вады, абальецца і ўжо тады апусціцца поплеч.

Пасядзяць яны, астынуць, затым, калі аслабаніцца палок, зноў пададуцца парыцца ці, па-іхняму, выганяць хваробы, бо дасюль толькі разагравалі кроў.

Выйдзеш з лазні — ні стомы, ні гнятлівых думак. Быццам усё змыеш, быццам нанава на белы свет народзішся. Цела зробіцца млява-бязважкім — во ўздымешся і паляціш.

Звечарэ. Праступяць, шэранню пасякуць паветра суцемкі. Вяснушкамі высыплюць, падзіравяць неба па-асенняму буйныя і частыя зоркі. Адскочыць раса. На лагу між лазнякоў завяжуцца бялёсыя аблачынкі туману. Усталюецца старожкая цішыня. Парушаючы яе, за вёскай абзавуцца перапёлкі, дзесьці ля Міцькаўшчыны гуркне машына ды зусім у іншым баку далёка-далёка прашуміць поезд.

Пры расчыненых, асветленых зыркай лямпачкай, сенечных дзвярах стрэне маці. Яна падоіць карову, працэдзіць малако, налье бляшачку кату і выгляне, зацікуе: ці памыліся, ці не ідуць там мужчыны, ці не час ёй адпраўляцца?

Забяжыць суседка Марына, задужа рухавая, лёгкая як на работу, так і на язык, Балашэнкава жонка.

— Пайшлі, пайшлі, Сцёпачка! Мой Васіль даўно дома.

Маці схопіць падрыхтаванае для лазні, патупае, але перад весніцамі спыніцца.

— Прынясі, сынок, судаў двое вады, — папросіць. — Ні лыжкі няма.

Сыроваткай уціхамірыш смагу, пастудзішся пад прызбай і падасіся выконваць наказ.

Пашыбуеш на лог.

Калодзеж выкапаюць непадалёку ад густога чаромхавага зарасніку—спрадвечных салаўіных гняздоўяў —невядома калі. Яго, як узвядуць воданапорную вежу, як панатыркаюць калонак, той-сёй надумае забурыць. Вёска запратэстуе: не, няхай стаіць, маўляў, калонкі — калонкамі, яны таксама не шкодзяць, але ўсё ж не тое. Адно — крышталь, а другое — трубны чаёк. Знойдуцца людзі, пачысцяць дно, змайструюць новы даўгавечны асінавы зруб, і салаўяне па-ранейшаму, не цураючыся, зразумела, і калонак, ваду для сябе будуць браць толькі ў ім, бо яна, што ні кажы, смачнейшая, жывейшая.

Знімеш акаванае жалезам, пагнутае вядро, схілішся над цёмнай зеўрай калодзежа, убачыш у блізкай вадзе ясныя караліны — не караліны — большыя за гарошыны светлякі і няўцямна вырачашся: што гэта? Аднак тут жа задзярэш галаву: о, дык то ж зоркі глядзяцца — адсвечваюць!

Па гладкай чорнай паверхні ўдарыць вядро. Зоркі рассыплюцца драбней маку, заіскрацца мноствам залацінак.

Як набярэш суды, яны зноў сальюцца, пагойдаюцца колькі, а неўзабаве супакояцца, хоць, праўда, з-за кроплі, якая час ад часу сарвецца і ўпадзе з надзрубнай лавачкі, дзе зойме сваё месца бодня, не застынуць зусім.

Напоўніш дзве эмаліраваныя выварки, бітон.

— Куды столькі! — здзівіцца бацька. — До.

Разрумяненыя з'явяцца маці і Марына.

— З лёгкім парам! — скажам ім.

Маці стомлена і расчаравана ўздыхне:

— А, не хадзіць бы мне лепш.

— Людна было?

— Мархва асой накінулася. За мяжу чахвосціла. Чаму не яна абкасіла.

— Якое там сена?! — абурыць бацьку. — Лебяда ды асот. Каб не абнасеньвалася, змахнуў. Ніхто той быльнік не чапаў. Ляжыць вунь. Няхай грабе.

— Дык я ж ёй так і сказала: бяры. Божа ж мой — раскрычалася. Запырскала слінай. З граззю змяшала. Не ўступіся Марына — з'ела б.

— За мужыка, за Ціхана злуе, — нагадвае Балашэнкава жонка. — Помслівая Мархвачка, урэдная.

— Ціхан жа сам збег. Да нас папрасіўся пажыць. Ці не пусціш па суседству? Думалася — змірацца. Мы, наадварот, угаворвалі: жыві. Не. Рукамі замахаў: хопіць, нацярпеўся! Такой ведзьме сам чорт не дагодзіць. Ну і з'ехаў, аж у Сібір. Дык вот яна і ганіць. Дакуль здзек цярпець? Бэсціць і бэсціць!

— У суд, у суд падавайце, — параіць Марына. — Нябось, укароцяць язык. Штрафу атрымае — прыціхне, няпраўда.

— Ат, — адмахнецца бацька. — Ці хочацца звязвацца.

Ён устане, возьме за шафай бутэльку.

— Будзем вячэраць. Давайце прамочым горла.

Ад гарэлкі жанчыны пачнуць адмаўляцца — галава разбаліцца. Але бацька ўгаворыць, налье, і яны, пакутліва моршчачыся, вып'юць.

Забудзецца Мархва. Завяжацца гамонка, няспешная, мірная.

Марына заспявае старую і жаллівую песню аб салдату, які, падкошаны варожай куляй, абвянчаецца з ліхадзейкай-смерцю далёка ад роднай старонкі, ад сваёй любай. Бацька, удзельнік трох войнаў, чамусьці заміргае, зойдзецца нейкім непраўдзівым кашлем, выберацца з-за стала, махне рукой і скіруе за перагародку, адкуль хутка данясецца рып ложка.

— Ой, заседзілася ж я! — скончыць Марына. — Позна. Бывайце, — развітаецца.

Пуня не замыкаецца. Сярод цемры, хоць выкалі вока, вобмацкам ступіш некалькі крокаў, знойдзеш драбінку, узграбешся пад самы вільчык, уляжашся.

Праз шчыліну ў сцяне ўбачыш, як з сянец, з акенца будзе слупам падаць на гладкі падворак святло. Пачуеш тупат і бразганне. Гэта пачне ўпраўляцца маці. Але неўзабаве лямпачка пагасне, замруць крокі.

Павернешся ямчэй. Пад табой зашуміць сена; затрашчыць густа, глуха. Нарэшце хрупне апошняя былінка. Наступіць цішыня, і табе зробіцца спакойна.

«Э-эх, было б з-за чаго нерваваццa, перажываць», — папракнеш сябе.

Апошнім, што ўловіць паміж явяю і забыццём тваё вуха, што адзначыць свядомасць, будзе гук шпокнуўшага вобзем пераспелага яблыка.

У КАДРЫ — ІМГНЕННЕ

Нявеста.

Фота А. КАЛЯДЫ.

Характар.

Фота М. ПІЛЮЦІНА.



Лісце на снезе.

Фота І. АБРАЎЦА.

У СВЯТЛЕ СЁННЯШНЯГА ДНЯ

РОЗДУМ НАПЯРЭДАДНІ ПРЭМ'ЕРЫ

У ПЕРШЫНЮ «Ціль Уленшпігель» быў пастаўлены на сцэне нашага тэатра амаль тры гады назад. Аўтар лібрэта і пастаноўшчык А. Дадзішкіляні, грунтуючыся на вядомым рамане бельгійскага пісьменніка Шарля дэ Кастэра, задумаў яго як харэаграфічнае апавяданне пра Уленшпігеля і Ламэ Гудзака. Апавядальны тон адчуваўся і ў сцэнарыі, дзе захоўваліся асноўныя фабульныя хады аповесці, і ў харэаграфіі, у якой паслядоўна ад эпізоду да эпізоду расказвалася пра жыццё, каханне, барацьбу Ціля і яго сяброў. Аднак з паказаных канкрэтных падзей не выраслі абагульненні, прыватнае не стала агульным, мінулае—сучасным.

Новаму пастаноўшчыку балета на сцэне Ленінградскага тэатра імя С. М. Кірава беларускаму харэографу В. Елізар'еву дасталася цяжкая спадчына: аднавіць разбураную гармонію паміж «састаўнымі часткамі» спектакля і са шматпланавага і шматпластавага рамана атрымаць тое, што лепш за ўсё можа быць перададзена сродкамі танца. Ён прапанаваў сцэнарый, у якім адмовіўся ад падобнага жыццеапісання Ціля і сканцэнтраваў сваю ўвагу на адным трагедыйна-драматычным аспекце.

Эпоху Уленшпігеля балетмайстар убачыў таксама вачыма яго сучасніка, вядомага нідэрландскага мастака Пітэра Брэйгеля, які ў сваіх творах аллюстраваў змрочны час у гісторыі краіны, калі жорсткасць стала нормай жыцця. Нацыянальнае заняволенне народа іспанцамі, свавольства каралеўскай улады, разгул інквізіцыі афарбавалі ў трагічныя таны многія творы мастака. І гэтая трагічная згушчонасць атмасферы выразна стала адчувацца ва ўсіх трох асноўных кампанентах спектакля: у музыцы, дзе натэтыка-драматычнай тэме Ціля і гёзаў супрацьстаялі поўныя змрочнай сілы сцэны, што малявалі жудасны свет караля Філіпа і Інквізітара; у дэкарацыях, на маляўнічых заднёках якіх палалі кастры і пакутавалі людзі; у харэаграфіі, дзе прыкметнае месца заняў трагічны гратэск і пластыка герояў страціла сваю класічную гармонічнасць і спакойную жыццярадаснасць.

Але, як і ў раней пастаўленых ім балетах, В. Елізар'ева не цікавіла простае харэаграфічнае адлюстраванне трагічных падзей, якое яшчэ некалькі гадоў назад было б асноўнай мэтай балетмайстра. Пастаноўшчык імкнуўся выявіць скрытую сутнасць іх, агаліць асноўныя супрацьдзейныя сілы, акумуляваць ідэі эпохі. Жадаючы ўхіліцца ад выкладання фабульных перыпетый, В. Елізар'еў прыйшоў да драматургіі асобага тыпу, не падобнай на драматургію як харэаграфічных спектакляў, названых у 50-я гады «драмбалетамі», так і на больш позняя, так званыя «танцсімфоніі». Ад першых яна адрознівалася вялікай абагульненасцю і паэтычнай шматзначнасцю, ад другіх — меншай абстрактнасцю. У «Цілі Уленшпігелі», як і ў папярэдніх балетах В. Елізар'ева («Кармэн-сюіце» і «Стварэнні свету»), няма падрабязнага і дэталёвага развіцця сюжэта. Харэограф стыкуе, супастаўляе толькі яго кульмінацыйныя моманты, найвышэйшы эмацыянальны стан герояў. Для перадачы такога сюжэта ў праграмцы балетмайстру спатрэбілася толькі некалькі радкоў. «Нараджэнне Ціля», «Інквізіцыя», «Гёзы», «Каханне», «ЗдрадніК», «Паражэнне», «Пакаранне», «Бессмяроцце Фландрыі» — так коратка называюцца асобныя часткі балета, які і не мае патрэбы ў больш падрабязным лібрэта, таму што з'яўляецца не драмай палажэнняў, а драмай характараў, а больш дакладна — нават трагедыяй, дзе даследуюцца не столькі індывідуумы, колькі тыя сілы, тыя з'явы, што стаяць за імі.

Арыентацыя В. Елізар'ева на гледачоў, якія ўжо чыталі раман і жадалі атрымаць ад балета не другаснае яго выкладанне, а новае прачытанне сучасным харэографам, слушная і, мабыць, нават адзіна магчымая.

В. Елізар'еў не цікавіцца тым, што маглі б зрабіць і адчуць яго героі да і пасля спыненых ім імгненняў. У спектаклі не паказваецца, як кароль Філіп, скажам, пірує, заляцаецца да жанчын або прысутнічае на аўтодафе. На сцэне мы бачым хутчэй тое, чаго ніколі не было ў сапраўднасці: мёртвай хваткай учапіўся Філіп у рулявое кола, своеасаблівы штурвал улады, сутаргава перабірае працягнутыя ад яго ніці. І такое вырашэнне гэтага вобраза, знойдзенае балетмайстрам і мастаком, адразу ж нараджае ў нас асацыяцыі з велізарным драпежным павуком, што сядзіць у цэнтры павіслага над краінай павуціння. Яго дапаўняюць Інквізітар і Рыбнік — увасабленне жорсткасці і здрадніцтва. Іх рукі, якія безупынна ў руху, штосьці заграбаюць, нагадваюць то павука, то фашысцкую свастыку, то наогул шматрукага страшэннага ідала.

У сваім імкненні зрабіць пластычна бачным тое, што ў звычайным жыцці схавана за будзённасцю, В. Елізар'еў зусім заканамерна звяртаецца да гратэску, здольнага выявіць такія сацыяльныя заганы, якія ў рэальным жыцці не маюць бачнай канкрэтнай формы. Гратэск становіцца вядучым выяўленчым сродкам у характарыстыцы трох адмоўных персанажаў балета, з яго дапамогай харэограф малюе карціну таго пачварнага, змрочнага свету, які душыць, паліць, топча ўсё жывое. Надзвычай выразна ў гэтым плане танцавальнае трыо караля, Інквізітара і Рыбніка, дзе кожны вядзе сваю ўласную пластычную тэму і разам з тым складана ўзаемадзейнічае з іншымі. Моцнае ўражанне пакідаюць і многія іншыя сцэны спектакля: пакарання смерцю гёзаў, адчаю Ціля, разгулу, шабаша злых сіл.

«Ці ўпэўнены ты,' што ў гэтым свеце ўжо няма ні Карлаў Пятых, ні Філіпаў Другіх?» — гэтыя словы Шарля дэ Кастэра блізкія стваральнікам спектакля і маглі б быць пастаўлены эпіграфам да балета. Імкненне асэнсаваць тэму больш шырока, чым барацьба народаў Фландрыі за сваю свабоду і незалежнасць у XVI стагоддзі, разгледзець яе як агульначалавечую праблему, датычную і да чорных палкоўнікаў Грэцыі, і да чылійскай хунты, і да расізму ў Паўднёвай Афрыцы, прымушае аўтараў «Ціля» адмовіцца ад канкрэтных прыкмет эпохі, ад нацыянальнага каларыту. Яны разгортваюць неба Фландрыі да памераў Сусвету, апранаюць герояў у касцюмы, дзе зліты ў адно забрала крыжаносца, скафандр касманаўта і маска куклуксклананўца, прымушаюць іх гаварыць на цяперашняй музычнай і харэаграфічнай мове, даюць ім светаўспрыняцце сучаснага чалавека. Мінулае разглядаецца імі ў святле сённяшняга дня, цяперашні час асвятляецца святлом мінулага.

Пафас выкрыцця зла, тры адмоўныя галоўныя персанажы, гратэск як адзін з важнейшых сродкаў выразнасці, разуменне гісторыі Ціля і яго народа як трагедыі — усё гэта не магло не адбіцца на агульным ладзе спектакля, афарбоўваючы яго ў напружана драматычныя таны, прыглушаючы тыя жыццярадасныя, бравурныя ноты, той невычарпальны аптымізм, якімі насычаны раман Кастэра. Пункт гледжання аўтараў балета, іх бачанне падзей не дазволілі Цілю бескланотна смяяцца, гарэзаваць. Ні кампазітар, ні харэограф не далі яму ні бяспечнай весялосці, ні сонечнай жыццярадаснасці. Буфанада ператвараецца ў яго ў фарс, гумар афарбоўваецца сарказмам. Цяплом і святлом вее ад героя толькі ў адажыо і сцэнах з Нэле. І музыка, і харэаграфія напаўняюцца тут трапяткой пяшчотай, дыхаюць водарам кветак. Лірычныя сцэны Ціля і яго каханай становяцца своеасаблівым «промнем святла ў цёмным царстве», зла і насілля, іх чалавечнасць і ўлы супрацьстаіць антыгуманнасці жудаснага свету.

Але, на жаль, мастак Я. Лысік не падтрымаў у гэтых сцэнах двух сваіх асноўных саўтараў. Змрочнае палатно касмічных прастораў, няўтульна аголеныя сцены і каласнікі вялізнай сцэны (дарэчы, паўтарэнне гэтага прыёму агалення сцэнічнай пляцоўкі, надзвычай удалага ў «Стварэнні свету», выглядае не зусім апраўданым у «Цілі Уленшпігелі»), халодная гама колераў — усё гэта перашкаджае лірычным эпізодам стаць жыццесцвярджальным цэнтрам спектакля, залішне падкрэслівае аднабаковасць яго палітры.

Мацней магла б, на мой погляд, прагучаць у балеце і гераічная нота. Вядома, у параўнанні з першым варыянтам балета, Ціль у спектаклі В. Елізар'ева набыў значна больш мужнасці. Ён стаў гёзам, стаў правадыром паўстанцаў, але не стаў яшчэ «вялікім гёзам». Большай эмацыянальнай пераканаўчасці хацелася б убачыць і ў масавых народных сцэнах — харэаграфія іх пакуль нейкая механістычная і статуарная. Ствараецца ўражанне, што харэограф крыху фармальна адгукаецца на фанфарныя гукі труб аркестра, не захапляючыся стварэннем маштабнага і яркага вобраза народа-змагара.

Што ж датычыць гарэзлівасці, насмешлівай дзёрзкасці, характэрнай для героя Кастэра, то яна прысутнічае ў балеце— як рыса самога пастаноўшчыка. Бунтарскі дух рамана заразіў В. Елізар'ева, і словы Кастэра «забіяка-паэт», сказаныя пра Ціля, цалкам маглі б быць аднесены да балетмайстра, таму што яго харэаграфіі ўласцівы і дзёрзкая смеласць, і атакуючая наступальнасць, і немалы сатырычны зарад. Аб'ектам атакі В. Елізар'ева зрабіўся той традыцыяналісцкі, «прыстойны» балет, у якім немудрагелісты сюжэт густа абрастае танцамі пры кожным зручным і нязручным выпадку, дзе ўсё ад першага да апошняга падзіравана, выверана, нарміравана ў адпаведнасці з лепшымі класічнымі балетамі мінулага. Разам з іншымі савецкімі харэографамі В. Елізар'еў імкнецца насыціць сваё мастацтва ідэямі сучаснасці, вывесці яго за межы звычнага балетнага зместу.

Заўзяты прапаведнік абнаўлення выразных сродкаў балета, яго, калі можна так сказаць, «асучаснення» і «інтэлектуалізацыі», В. Елізар'еў рашуча заяўляе: «Балет—мастацтва думкі» і літаральна кожнай сцэнай імкнецца даказаць гэта. Зрабіўшы дамінантай спектакля выкрыццё зла і падначаліўшы гэтаму ўсе выразныя сродкі, В. Елізар'еў не пабаяўся адысці ад прывычных уяўленняў аб балетным мастацтве як мастацтве ўслаўлення прыгажосці чалавечага цела, сцвярджэння ідэалу хараства. І нельга, мабыць, адмаўляць права харэографа на падобны падыход, таму што, як вядома, ідэал цудоўнага можа зацвярджацца ў мастацтве не толькі прама, але і ад адваротнага: як справядліва заўважыў нехта з эстэтыкаў, «эпічнае зла мае тую ж каштоўнасць, што і перамога дабра». Можна толькі заўважыць, што В. Елізар'еў з такой палкасцю імкнецца абвергнуць устойлівае, што часам перагінае палку: адыходзячы ад ілюстрацыйнасці, пазбягае яе нават тады, калі яна неабходная (адсутнасць маскі на твары Ціля робіць незразумелым, напрыклад, чаму тыя, хто моліцца, прымаюць яго за Інквізітара); імкнучыся да асацыятыўнай вобразнасці, так яе ўскладняе, што яго харэаграфічныя алегорыі не заўсёды даходзяць да гледачоў (так, не да канца ясным з'яўляецца супастаўленне вобразаў Фландрыі, якая спрабуе ўзляцець, і паўзучага здрадніцтва); жадаючы ўзмацніць інтэлектуальны пачатак, часам даходзіць да сухога рацыяналізму. У сваім імкненні насыціць глыбокім філасофскім сэнсам амаль што не кожную сцэну В. Елізар'еў ахвяруе, часам, і пэўнай «дансантнасцю» харэаграфічнай мовы, і шматколернасцю характараў сваіх герояў, якія становяцца своеасаблівымі рупарамі ідэй самога балетмайстра.

Канструкцыя балета складаная і перанасычаная задумамі, але В. Елізар'еў не хоча дэталёва растлумачваць свае рашэнні, рыхтаваць гледача да іх успрымання. Харэограф адразу кідае яго на глыбіню, абрыньвае лавіну непрывычнага, нестандартнага, новага. Харэаграфічныя метафары, алегорыі, намёкі рассыпаны па спектаклю з такой шчодрасцю, што прысутныя ў зале проста не паспяваюць часам усяго зразумець і асэнсаваць. А іншы раз на пытанні, што нараджаюцца пры знаёмстве з балетам, бывае і немагчыма знайсці адказ: напрыклад, цяжка зразумець, чаму пластыка Ціля часам робіцца падобнай да пластыкі адмоўных персанажаў, або — чаму ў такім містычным плане вырашана сцэна, калі здрадніка Рыбніка паглынае зямля?.. І такіх пытанняў магло б быць значна больш.

Своеасаблівая стыкоўка балета з філасофіяй адбываецца не без страт і выдаткаў. Але і знаходкі ў гэтай сферы такія па-мастацку пераканаўчыя, а перспектывы такія прываблівыя, яны так многа абяцаюць, што хочацца дараваць балетмайстру пралікі ў шляху, які вядзе да адкрыцця новага.

Значнасць і напружанасць думкі, якая дамінуе ў спектаклі, спраецыраванасць яго на сучаснасць, сур'ёзнасць і філасафічнасць імкненняў аўтараў вырваць балет з кола прывычных ідэйна-эстэтычных прадстаўленняў — усё гэта прымушае з павагай ставіцца да харэаграфічнага твора пра Ціля, незалежна ад таго, падабаецца гэты твор ці не. У параўнанні з ім многія традыцыйныя балеты здаюцца дзіцячымі казкамі, вадэвільнымі дробязямі, гледзячы на якія пасля яго так і хочацца ўсклікнуць: «Калі балет не стыкуецца з філасофіяй — тым горш для балета!».

Да таго ж, парывісты запал балетмайстра, яго хлапечае нежаданне скарацца аўтарытэтам, яго безупынны пратэст, супраць устарэлых норм і прынцыпаў міжволі заражаюць гледачоў і падзяляюць іх на амаль аднолькава тэмпераментных сяброў і ворагаў. Спектакль нікога не пакідае абыякавым (і ўжо гэта бясспрэчная ўдача!), ён нараджае гарачыя спрэчкі, якія маста выходзяць за рамкі асобнага балета.

Работа яшчэ наперадзе. Аўтарам «Ціля Уленшпігеля» выпала даволі рэдкая ў практыцы ўдача — стварыць яшчэ адзін новы варыянт балета на мінскай сцэне, ліквідаваць выпадковае, дадаўшы нехапаючае, удасканаліўшы прыцыповае. Нам жа, гледачам, наканавана ўбачыць яго, ацаніць, а галоўнае (якая шчаслівая магчымасць!) — захацець пра яго паспрачацца. Пачаткам гэтых спрэчак, а разам з тым, і своеасаблівай «інфармацыяй да роздуму» перад будучай прэм'ерай мне і хацелася зрабіць гэтыя нататкі.

Юлія ЧУРКО.

Палёт.

Фота А. КАЛЯДЫ.

У АБЛІЧЧЫ САЛІСТАЎ

У гэтым канцэрце для слухачоў усё было незвычайна і вельмі цікава. За радкамі сціплай рэкламы аб творчай справаздачы артыстаў Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР хавалася, аказваецца, вялікая і разнастайная праграма, у якой музыканты паўсталі ў новым для слухачоў творчым абліччы.

Мы даўно і добра ведаем наш аркестр, ведаем яго магчымасці, радуемся яго добрай творчай форме, якая дае магчымасць калектыву выконваць самыя складаныя праграмы з твораў сусветнай музычнай класікі і савецкіх кампазітараў. На гэты раз музыканты аркестра выступілі і як салісты, і ў цікавых інструментальных саставах.

Яўген Савікоўскі, Вадзім Мазо, Вадзім Сысюк, Віктар Хальфін склалі добры камерны ансамбль. Лёгка, натуральна, з пачуццём стылю, артыстычна выканалі яны струнны квартэт Гайдна, і ў слухачоў магло ўзнікнуць поўнае ўражанне, што музыканты пастаянна выступаюць такім калектывам.

Ансамбль «Кантабіле» Беларускай дзяржфілармоніі ўжо добра зарэкамендаваў сябе ў асяроддзі аматараў камернай музыкі як выдатны, тонкі інтэрпрэтатар класічных твораў. Высокамастацкае выкананне ансамблем канцэрта Альбіноні, прэлюдыі Вівальдзі яшчэ раз пацвердзіла багатыя выканаўчыя магчымасці «Кантабіле», мастацкі густ калектыву, яго творчыя перспектывы. У канцэрце ў складзе ансамбля выступілі Генадзь Гедыльтэр (флейта), Валерый Фралоў (габой), Міхаіл Бараноўскі (скрыпка), Уладзімір Перлін (віяланчэль), Аляксандр Фісейскі (клавесін).

Дзяржаўны сімфанічны аркестр Беларускай ССР (за пультам — галоўны дырыжор аркестра Юрый Яфімаў) акампанаваў салістам у выкананні фрагментаў з інструментальных канцэртаў. А салістамі выступілі самі аркестранты. Дыпламант Міжнароднага конкурсу Святлана Сергіенка выканала «Адажыо і варыяцыі для габоя з аркестрам» Гумеля. Выканала выдатна, з віртуозным бляскам. У яе ігры спалучаюцца мяккасць, прыгажосць гучання габоя з бліскучай «каларатурай», якая нагадвае празрыстае, адухоўленае гучанне чалавечага голасу.

Другую і трэцюю часткі Канцэрта № 4 для двух кларнетаў з аркестрам кампазітара Стаміна выканалі Генадзь Забара і Рыгор Лунін. Пявучыя чыстыя таласы салірующых кларнетаў арганічна спляліся з фарбамі аркестра. Была прадстаўлена і салірующая валторна (Чэслаў Юшкевіч) у Канцэрце з аркестрам Моцарта.

Скрыпач Пётр Сакін выступіў з першай часткай Канцэрта Чайкоўскага. Знаёмая да кожнай ноты музыка і на гэты раз уразіла слухачоў: саліст прадэманстраваў добры гук свайго інструмента, мастацкі густ, тонкае разуменне вобразнага ладу музыкі.

У заключэнне канцэрта адбылася прэм'ера: новая кантата беларускага кампазітара Марка Шнейдэрмана «Па Леніну звяраючы крок» (словы Э. Агіянвет, У. Фірсава, С. Смірнова). Разам з аркестрам пад кіраўніцтвам Ю. Яфімава ў яе выкананні прынялі ўдзел Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР (галоўны дырыжор Уладзімір Раговіч), хор хлопчыкаў Сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры Белдзяржкансерваторыі (кіраўнік Ігар Жураўленка), салістка Валянціна Раговіч.

Справаздача артыстаў Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР, якія паказалі сябе з розных выканаўчых бакоў, пераканала, што ў складзе калектыву — вопытныя музыканты, вартыя з гонарам насіць званне салістаў.

А. РАКАВА.

ПРЫЎЗНЯТА, ШЧЫРА, ВІРТУОЗНА



— Выступае народны артыст рэспублікі Аркадзь Астрамецкі...

У час яго канцэртаў хочацца проста слухаць музыку, забыўшыся на складаную спецыфіку цымбальнай ігры. І ўсё ж міжволі не пакідае пачуццё захаплення хаця б тым, як адпрацаваны, выверан кожны рух музыканта, як спраўна кіруе ён капрызным гучаннем інструмента. Кожны выканаўчы штрых працуе на раскрыццё музычнага вобраза. Аркадзь Астрамецкі спрытна «ловіць» канцоўкі фраз або, наадварот, пакідаючы струны адкрытымі, прымушае «іграць» церпкі гул. Ён дэманструе такое piano, што, здаецца, спявае не метал струн, а толькі дрэва цымбальнай дэкі; высякае з цымбалаў па-пракоф'еўску рэзка акрэсленае forte.

Артыст, у рэпертуары якога — творы сусветнай класікі, савецкія сачыненні, паўстае перад намі перш за ўсё як паслядоўны прапагандыст і ўдумлівы інтэрпрэтатар беларускай музыкі. Уражвае то клавесіннае, то звонавае гучанне яго інструмента («Сюіта ў старадаўнім стылі» В. Войціка), майстэрскае крашчэнда і вяртанне ў цішыню («Элегія» Д. Смольскага, прысвечаная памяці Шастаковіча), лёгкае лунанне гуку ў «Інтэрмедыі» Я. Глебава, адчувальны ўсплёск хвалі ў трэмала з «Нанцюрна» С. Картэса.

Што ж, усё гэта прыйшло да яго праз багатую выканаўчую практыку. Салістам Беларускай дзяржаўнай філармоніі таленавіты цымбаліст працуе з 1946 года, шмат гастралюе па рэспубліцы, па Саюзу, пабываў у Англіі, Францыі, Індыі, Японіі — больш чым у дваццаці краінах свету. Ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За працоўную адзнаку», Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР адзначаны поспехі Аркадзя Астрамецкага ў развіцці нацыянальнага мастацтва. Даражыць ён высокай ацэнкай сваёй дзейнасці. А прызнанне, удзячнасць слухачоў для яго — не менш ганаровая ўзнагарода. І, бадай, самыя сяброўскія сустрэчы ў артыста — з землякамі.

Сёлета яго цымбалы амаль штовечар гучалі на Гродзеншчыне ў час «Беларускай музычнай восені» і завяршылі сваю святочную вандроўку ў сталіцы рэспублікі: адбыўся канцэрт Аркадзя Астрамецкага ў зале філармоніі. Гэта — знамянальна і для самога выканаўцы, і для музычнай грамадскасці рэспублікі.

С. ВЕТКА.

Традыцыі жанру

Летась у гэтакія ж снежаньскія дні падводзіліся вынікі першай сумеснай работы кампазітарскіх арганізацый Літвы і Беларусі. Аб'яднаны пленум, які адбыўся ў Вільнюсе, пераканаў яго ўдзельнікаў: варта часцей наведваць адзін аднаго і ўнягваць у творчыя размовы шырокае кола слухачоў. Прымаючы эстафету дружбы, арганізатарамі Другога аб'яднанага пленума Саюзаў кампазітараў рэспублік-суседак сталі беларусы. 30 лістапада ў Мінск прыбылі госці з Літвы. Вечарам таго ж дня яны наведалі оперны спектакль «Джардана Бруна». А ўчора канцэртам літоўскай сімфанічнай музыкі распачаў работу пленум.

Гэта мерапрыемства праходзіць пад знакам юбілейнага года, таму ў праграмах шасці пленумаўскіх канцэртаў пераважаюць творы, апрабаваныя часам, прызнаныя слухачом. Два сімфанічныя, харавы, камерны, канцэрты з твораў для народных інструментаў і песні не толькі дапамогуць уявіць узровень развіцця таго ці іншага жанру ў музыцы абедзвюх рэспублік, але і прадэманструюць прафесійны ўзровень выканаўцаў. Сярод іх — Дзяржаўны Каўнаскі хор пад кіраўніцтвам Пятраса Бінгяліса, лаўрэат міжнародных конкурсаў Вільнюскі струнны квартэт, жаночы хор «Агле», народны артыст Літоўскай ССР дырыжор Юозас Дамаркас, вядучыя літоўскія і беларускія салісты, музычныя калектывы Беларусі.

Праграму ўчарашняга канцэрта склалі творы В. Юозапайціса, О. Балакаўскаса, І. Дамаркаса, В. Баркаўскаса. Сімфанічную творчасць гаспадароў пленума прадстаўляюць К. Цесакоў, Я. Глебаў, Л. Захлеўны, А. Багатыроў, Л. Абелёвіч, Г. Вагнер, А. Мдзівані. Падрыхтаваны дзве беларускія прэм'еры: Другі фартэпіянны канцэрт Г. Вагнера і канцэрт для цымбалаў з народным аркестрам К. Цесакова.

В снежня адбудзецца творчая дыскусія па праблемах шасцідзесяцігадовага развіцця савецкага музычнага мастацтва Літвы і Беларусі.

Сёння мы прапануем артыкул вільнюскага музыказнаўцы Д. Палёнітэ пра сімфанічную музыку нашых гасцей.

На шляху развіцця літоўскага савецкага сімфанізму ярка вылучаецца сучасны творчы этап. За апошнія пяць-сем гадоў у рэспуліцы нарадзілася звыш трыццаці новых партытур — паэм, канцэртаў, уверцюр, сімфоній. Але вылучаецца гэты этап не столькі ў колькасных, колькі ў якасных адносінах: шэраг новых сімфанічных опусаў высока ацэнены ў рэспубліцы і за яе межамі. Гэта Чацвёрты канцэрт для фартэпіяна з аркестрам С. Вайнюнаса, трыяда сімфанічных паэм В. Монтвілы, «Вітражы» Ю. Юозапайціса, сімфоніі В. Баркаўскаса, О. Балакаўскаса, Ф. Баёраса, А. Бражынскаса, Б. Барысава, В. і Ю. Юозапайцісаў, Ю. Юзелюнаса, А. Шэндэроваса. З усіх сімфанічных жанраў асаблівай увагі заслугоўвае сімфонія. Менавіта яна характарызуе літоўскі савецкі сімфанізм і дазваляе рабіць аб ім некаторыя абагульненні.

Першае, што трэба адзначыць. — гэта актуальнасць, значнасць тэматыкі новых сімфанічных твораў. У іх знаходзяць водгук важныя падзеі грамадскага і палітычнага жыцця краіны, рэспублікі: 50-годдзе ўтварэння СССР, 650-годдзе горада Вільнюса, 100-годдзе з дня нараджэння М. Чурлёніса, 30-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, 60-годдзе Вялікага Кастрычніка... Важна падкрэсліць, што вырашэнне гэтых тэм, а таксама раскрыццё агульначалавечай праблематыкі спалучаецца з псіхалагічнай насычанасцю, філасофскай глыбінёй і сур'ёзнасцю выказвання. Успрыняцце ж многіх партытур аблягчаюць аўтарскія рэмаркі, праграмныя назвы або паэтычны тэкст. У гэтым выражаецца ўласцівая многім кампазітарскім школам тэндэнцыя наблізіць найскладанейшы жанр інструментальнай музыкі да слухача, дэмакратызаваць яго.

Дамінуючы тып сімфанічнага мыслення літоўскіх кампазітараў — лірыка-эпічны і лірыка-драматычны. Герой многіх новых опусаў — складаная асоба, але яе адносіны з навакольным светам не носяць вострадраматычнага характару. Таму і вядучыя драматургічныя сферы часцей за ўсё не антаганістычныя, кантрасты не заключаюць у сабе глыбокай канфліктнасці, непераадольных супярэчнасцей, а з трактоўкі драматычных вобразаў амаль знікае боль і вастрыня душэўных перажыванняў, трагічнае адценне. На сучасным этапе ў сімфоніях змяніліся і іншыя эмацыянальныя сферы. Напрыклад, героіка, валявыя вобразы сталі больш засяроджанымі, праніклівымі, лірыка — больш стрыманай, унутрана больш канцэнтраванай, асабовай і, разам з тым, праведзенай скрозь прызму інтэлектуальнасці. Важна адзначыць, што каларытнай карціннасці, светламу роздуму, сузіральнасці роўным партнёрам у новых партытурах з'яўляецца дзейнасць.

На цяперашнім этапе значна пашырыліся і паглыбіліся формы сувязі з родным фальклорам. Сталі выкарыстоўвацца элементы больш ранніх песенна-танцавальных узораў. Пры гэтым архаічныя інтанацыйныя і рытмічныя мадэлі аказаліся толькі своеасаблівымі сасудамі для сучаснага зместу. Немалое месца, як і раней, у буйных палотнах займае жанравасць, але цяпер яна выступае апасродкавана, больш асацыятыўна.

Ідэйны змест і дамінуючыя выразныя сферы вызначылі і некаторыя агульныя для новых сімфоній асаблівасці формы. Так, вядучыя тэмы цяпер з'яўляюцца ўсебаковай характарыстыкай аднаго вобраза; вельмі часта кампазітары звяртаюцца да монатэматызму і на першы план вылучаюць ідэю вечнай абнаўляльнасці, працэсуальнасць. Нарэшце, агульным, як для літоўскіх, так і для кампазітараў іншых рэспублік, стала імкненне да пошукаў індывідуальнай стылістыкі.

Для больш дэтальнага знаёмства з новымі літоўскімі партытурамі мэтазгодна, кіруючыся стылявымі прыкметамі, умоўна падзяліць іх на тры групы: «вялікая» сімфонія, створаная традыцыйнымі сродкамі, сімфонія камерна-канцэртнага плану і «вялікая» сімфонія, створаная нетрадыцыйнымі сродкамі.

Традыцыйную галіну літоўскага сімфанізму прадстаўляюць партытуры Ю. Башынскаса (Трэцяя сімфонія — 1970, Чацвёртая — 1973), Ю. Гайжаўскаса (Другая — 1974, сімфонія «Брэст» — 1977), А. Рачунаса (Восьмая — 1975).

Перапляценне прыкмет сімфоніі і іншых жанраў больш яскрава і вынікова праяўляецца ў творчасці маладога пакалення кампазітараў рэспублікі. У гэтым працэсе асабліва прыкметны ўхіл да камернасці. Камерна-канцэртны тып сімфанічнага мыслення ў розных стылістычных аспектах праяўляецца ў вакальнай сімфоніі «Homo sum» А. Бражынскаса, у Другой Ф. Баёраса, у Камерных сімфоніях А. Шэндэроваса і Ю. Юозапайціса, у Другой сімфоніі В. Юозапайціса.

Бадай, самы значны плён дасягнуты літоўскімі кампазітарамі ў галіне «вялікай» сімфоніі з выкарыстаннем нетрадыцыйных сродкаў. Маштабнасці іх задум адпавядае псіхалагічная глыбіня, а новыя канструктыўныя метады як бы маскіруюцца класічна яснымі формамі.

Сярод «вялікіх» сімфоній новага тыпу асабліва вылучаюцца «Rex» Ю. Юозапайціса, Сімфонія О. Балакаўскаса і Чацвёртая сімфонія Ю. Юзелюнаса.

«Rex» (1974) Ю. Юозапайціса прысвечана памяці М. Чурлёніса і носіць назву самай велічнай карціны выдатнага літоўскага жывапісца і класіка нацыянальнай музыкі. «Rex» палюбіўся шырокім колам слухачоў за меладычную яркасць, пастэльную маляўнічасць, манументальнасць гучання.

Сімфонія (1973) О. Балакаўскаса насычана дзейснасцю, дынамікай, урбанісцкімі гукамі, інтэлектуалізаванай лірыкай і элементамі гратэску. Сімфонія О. Балакаўскаса прыкметна пашырае вобразныя грані літоўскага савецкага сімфанізму.

Чацвёртая сімфонія (1975) Ю. Юзелюнаса прысвечана 30-годдзю Перамогі над фашызмам. Барацьба, гераічны подзвіг савецкага чалавека, яго перамога асэнсоўваюцца ў сімфоніі ў філасофскім пераламленні. Строгі рацыяналізм пераплаўляецца ў гэтым творы з амаль што скрабінскай імпульсіўнасцю і імпрэсіяністцкай каларытнасцю.

У цэлым можна сказаць, што літоўская сімфанічная музыка перажывае час свайго рэнесансу. Акрамя партытур ужо прызнаных, шырока вядомых, аб якіх мы тут гаварылі, неабходна назваць і тыя, што чакаюць сваіх прэм'ер. Гэта Сімфонія-канцэрт для аргана і аркестра Э. Бальсіса, «Святочная сімфонія» для аргана В. Багдонаса, сімфонія «Кастрычнік» Б. Барысава і сімфонія самых маладых нашых аўтараў А. Лапінскаса і І. Тамулёніса. Дасягненні ў мінулым — надзейная зарука поспеху ў будучым.

Д. ПАЛЁНІТЭ.

На парозе сталасці

Сярод тых, хто сабраўся нядаўна на ўрачысты мітынг з выпадку адкрыцця помніка Герою Савецкага Саюза і Герою Сацыялістычнай Працы К. П. Арлоўскаму ў калгасе «Рассвет», што на Магілёўшчыне, быў і Юрый Казакоў. Ён хваляваўся больш за іншых — напэўна, больш за арганізатараў мітынгу і выступаючых. Менавіта ён разам са скульптарам М. Рыжанковым выканалі праект гэтага помніка. Як прымуць яго людзі? Як ацэняць яны архітэктурна-пластычны вобраз чалавека, які добра вядомы ў нас у краіне?

Гучаць цёплыя словы аб жыцці і дзейнасці слаўнага сына савецкага народа Кірылы Пракопавіча. Ю. Казакоў убірае ў сябе гэтае свята, але яно не перашкаджае яму думаць пра сваё. Пра тое, як усё пачыналася для яго. Як здаваў ён свой грозны «сапрамат» — вучыўся пераадольваць супраціўленне любога «архітэктурнага» матэрыялу і ў гэтым пераадольванні тварыць. Як авалодваў складаным арсеналам прыёмаў і тайн мемарыяльнага дойлідства.

Юрый Казакоў увайшоў у беларускую архітэктуру імкліва і, як здавалася, адразу вызначыўся сваім почыркам. У 1964 годзе ён паспяхова закончыў Беларускі політэхнічны інстытут, дзе вучыўся ў такіх выдатных педагогаў, як А. П. Воінаў, Н. М. Макляцова, Г. А. Заборскі, В. М. Волчак, а ўжо праз год выканаў у садружнасці са скульптарам П. Цомпелем праект помніка партызанам, якія загінулі ля вёскі Іканы на возеры Палік.

У 60-я гады ў беларускім мастацтве паступова і ўсё больш рашуча пераглядаліся некаторыя каноны 40—50 гадоў. Скульптура станавілася як бы больш «архітэктурнай». Разам з тым у мемарыяльныя кампазіцыі ўсё больш арганічна ўваходзіла прадметнае, прыроднае асяроддзе. Гэта быў час стварэння Хатынскага мемарыяла і Кургана Славы, правядзенне конкурсаў на праектаванне помнікаў Я. Купалу і Я. Коласу. Менавіта ў сярэдзіне 60-х гадоў па ініцыятыве ЦК ЛКСМБ быў узведзены шэраг значных мемарыялаў у гонар гераічных подзвігаў савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. У мастацтва і архітэктуру ўваходзілі імёны А. Анікейчыка, Г. Мурамцава, Л. Гумілеўскага, М. Рыжанкова, А. Арцімовіча, А. Веліксонава, Л. Левіна, В. Занковіча, Ю. Градава, А. Стаховіча...

Ужо былі праведзены першыя конкурсныя туры на лепшы праект мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», у якіх актыўны ўдзел прыняў і Ю. Казакоў. Ён — адзін з аўтараў гэтага сусветна вядомага помніка, пра які Л. І. Брэжнеў ў кнізе ганаровых наведвальнікаў пакінуў наступны запіс: «У вяках будзе жыць у памяці народаў подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці, — жыць і заклікаць людзей да самаадданасці Савецкай Радзіме.

Велічны мемарыял, створаны ў 1971 годзе, — вартая даніна мужнасці герояў. Дзякуй тым, хто яго стварыў. Народы планеты, змагайцеся за мір!»

У творчым актыве архітэктара Ю. Казакова больш чым дзесятак праектаў разнастайных мемарыяльных збудаванняў, сярод якіх помнік У. І. Леніну ў Лепелі (скульптары І. Глебаў і Б. Івонцьеў), Курган Славы пад Бабруйскам (скульптар П. Цомпель), шэраг помнікаў і бюстаў выдатным дзяржаўным і партыйным дзеячам і героям Вялікай Айчыннай.

Творчасць Ю. Казакова ў лепшых яго работах прыцягвае асаблівым ракурсам аўтарскага бачання, прасторава выразнай архітэктурнай пластычнасцю, пошукам складаных структур архітэктурных вобразаў-сімвалаў. А калі суаднесці гэтыя якасці з агульнай тэндэнцыяй развіцця беларускай савецкай школы мемарыяльнага дойлідства, то яны набываюць больш глыбокі сэнс, асабліва ў плане сённяшняй праблемы сінтэзу архітэктуры і пластычных мастацтваў..

«Архітэктар і мастак... Толькі пры іх

цеснай садружнасці можна дамагчыся максімуму выразнасці помніка, — гаворыць Ю. Казакоў. — Калі, нягледзячы на розніцу почыркаў, яны працуюць над адным праектам, б'юцца над вырашэннем адной задачы, толькі тады, напэўна, можна гаварыць, што помнік можа стаць фактам мастацтва, як ім стаў, напрыклад, Хатынскі мемарыял. Аднак на практыцы нярэдка бывае так, што, адарваўшы манумент ад асяроддзя няправільным выбарам памеру, матэрыялу, архітэктурнага ладу, сілуэту, аўтар парушае цэласнасць вобраза. Вельмі наглядным прыкладам можа служыць цудоўная скульптурная група В. Мухінай «Рабочы і калгасніца», якая, будучы адарванай ад архітэктурнага збудавання, прыкметна страціла ідэйна-эмацыянальную гучнасць. Гэта абумоўлена, па мой погляд, яшчэ і тым, што манумент сёння не звязаны ні з планіроўкай плошчы, ні з навакольнай прасторай».

Як жа працуе Ю. Казакоў пры праектаванні тых або іншых помнікаў?

Бадай, галоўнае ў яго архітэктурных пошуках — гэта пошук сімвалаў, арганічна звязаных з задумай скульптара. У той жа час такія сімвалы часта набываюць шматпланавасць і выразнасць за кошт укаранёных у народнай свядомасці ўяўленняў.

Так, у помніку К. П. Арлоўскаму выкарыстаны вобраз пераплеценых разам плуга і вінтоўкі як сімвал баявога і працоўнага жыцця і дзейнасці праслаўленага героя і працаўніка. Сімволіка выкарыстана і ў помніку партызанам на возеры Палік (скульптар П. Цомпель). Высокая фігура партызана-сейбіта з вінтоўкай за плячамі, які размашыста кідае ў зямлю зерне, устаноўлена на гладкім пастаменце ў выглядзе стылізаванай баразны.

Заканчваецца будаўніцтва помніка ў гонар воінаў, партызан і падпольшчыкаў, якія вызвалілі горад Маладзечна (скульптары І. Глебаў, А. Засніцкі). Тут удала выкарыстаны прапілеі з высечанымі скульптурнымі рэльефамі, якія ўслаўляюць подзвіг савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны.

А замыкае прасторавую кампазіцыю мемарыяла ўзляцеўшая ўверх пяціканечная зорка, устаноўленая на двух пілонах. Гэта значная знаходка Ю. Казакова як архітэктара.

Помнік герою грамадзянскай вайны У. М. Азіну, ураджэнцу в. Мар'янава Полацкага павета (скульптар С. Вакар), які будзе ўзведзены ў Полацку, мае іншую архітэктурна-пластычную канцэпцыю. Архітэктар не толькі ўлічыў усе архітэктурна-планіровачныя патрабаванні, звязаўшы іх з рэканструкцыяй плошчы, дзе будзе стаяць помнік, але і пановаму паспрабаваў звязаць своеасаблівым «замком» строгі гранітны пастамент з паўфігурай У. Азіна.

Характэрны для творчасці Ю. Казакова і помнік-бюст Ф. Э. Дзяржынскага на радзіме «рыцара рэвалюцыі» ў вёсцы Дзяржынава Валожынскага раёна (скульптар С. Вакар). Ён узведзены на высокім з чырвонага паліраванага граніту пастаменце. А побач, у сінтэзе з ім — на гранітным прыгожым валуне, характэрным для пейзажу гэтай мясцовасці,— аўтары змясцілі выразны бронзавы блок з подпісам «Ф. Э. Дзяржынскі».

Цікава выканана і архітэктурная частка помніка загінуўшым аднавяскоўцам у саўгасе «Новы шлях» Верхнядзвінскага раёна (скульптар А. Веліксонаў). Пастамент у форме паралелепіпеда з высечанымі імёнамі загінуўшых нясе дынамічную фігуру партызана.

Архітэктурная гарызанталь — стылабат, на якім размешчана скульптурная фігура байца, выкарыстана і ў другім помніку — ахвярам фашызму пад г. Чэрвенем (скульптар А. Веліксонаў). Але тут архітэктурна-пластычная задума іншая. Галоўная тэма мемарыяла падаецца праз выразныя рытмы вялікіх плоскасцей: на бетонным сколе, куды, як стрэлы, накіроўваюць наш погляд гэтыя рытмы, адліты словы: «Ахвярам фашызму 1941—1945 гг.» Злева, пад покрывам стылабата, пакоіцца прах расстраляных савецкіх грамадзян у сорак першым. А на тарцы п'едэстала высечаны вядомыя вершы Р. Раждзественскага з заклікам памятаць пра тое, якой цаной заваявана шчасце.

На стадыі завяршэння знаходзіцца праект помніка герою партызанскага руху, былому старшыні калгаса В. З. Каржу ў вёсцы Хворастава Мінскай вобласці (скульптар І. Глебаў), дзе Ю. Казакоў у сімвалічных каласах хлеба, украплёных у пастамент, дапамагае скульптару больш востра і выразна падкрэсліць думку аб галоўным прызванні гэтага чалавека.

На паліцах і стэлажах у майстэрні Ю. Казакова можна ўбачыць праектныя эскізы бюста двойчы Героя Сацыялістычнай Працы, старшыні калгаса «Аснежыцкі» Пінскага раёна У. А. Ралько (скульптар С. Селіханаў), праект манумента У. І. Леніну ў г. Століне (скульптар С. Селіханаў), першыя варыянты праекта надмагільнага помніка двойчы Герою Савецкага Саюза Л. І. Бядзе (скульптар І. Міско), праекты мемарыяльных дошак.

Не так даўно на будынку музычнай школы-дзесяцігодкі пры кансерваторыі па плошчы Свабоды ў Мінску была адкрыта памятная дошка заснавальніку Паўночнага таварыства дзекабрыстаў Н. Мураўёву (скульптар С. Вакар). А ў хуткім часе мінчане ўбачаць новыя мемарыяльныя дошкі, архітэктурную частку якіх выконвае Ю. Казакоў, — В. І. Казлову, І. П. Мележу, С. М. Будзённаму, М. В. Фрунзе, акадэміку М. С. Акулаву, падпольшчыцы Х. Кульман...

Працаздольнасць Ю. Казакова зайздросная, калі ўлічыць, што вось ужо 12 год ён выкладае на кафедры тэорыі і гісторыі архітэктуры Беларускага політэхнічнага інстытута.

Сталасць творчасці — гэта здольнасць архітэктара разумець свае задачы і магчымасці іх здзяйснення, уменне самастойна мысліць і знаходзіць найлепшую форму для ўвасаблення задум; уменне адысці ад знойдзенага ўчора і знайсці новыя, арыгінальныя творчыя канцэпцыі.

Ю. Казакоў — на парозе сваёй творчай сталасці.

Б. КРЭПАК.

РАМЯСТВО? МАСТАЦТВА!

Перафразіраваўшы вядомае выказванне аб тэатры, можна сказаць, што мастацкі музей пачынаецца з вытворчых майстэрань. Гэта тычыцца і Дзяржаўнага мастацкага музея БССР, дзе загадвае майстэрнямі В. Зелянко. Абавязкі ў яго нялёгкія. Здавалася б, чаго прасцей — узяў карціну, абмеваў яе і майструй рамку. Але тут не абысціся без творчасці. Тая рама, што пасуе да партрэта, зусім не падыходзіць для пейзажа — абмяжоўвае прастору. А патрэбна так аформіць карціну, каб глядач адчуваў бязмежнасць прыроды. Ды і партрэт трэба аформіць так, каб падкрэсліць усе вартасці работы...

А розныя падарожжы карцін на выстаўкі ў іншыя гарады і краіны! Кольні нечаканасцей іх падпільноўвае ў час транспарціроўкі!

На пасяджэнні Міжнароднага савета музеяў, якое адбылося ў гэтым годзе ў Маскве, разглядалася асобным пытаннем праблема захавання мастацкіх каштоўнасцей у час перавозак. З кожным годам маршруты робяцца больш разнастайнымі, дарога даўжэйшай. Гэта натуральна. Прызначэнне мастацтва, незалежна ад таго, належыць яно беларускаму, рускаму або любому іншаму народу, — вучыць людзей разумець і шанаваць цудоўнае, абуджаць узвышаныя пачуцці. Абмен мастацкімі каштоўнасцямі духоўна ўзбагачае людзей, адкрывае перад нацыянальнымі культурамі новыя гарызонты. Не выпадкова Заключны акт Нарады ў Хельсінкі прадугледжвае меры па пашырэнню кантактаў і ў гэтай галіне.

Так што скарачэння перавозак мастацкіх твораў быць не павінна. Выйсце толькі адно — зрабіць іх бяспечнымі. Але як? Пакуль што да вырашэння гэтай, без сумнення, важнай праблемы прыцягнуты «саматужнікі» —спецыялістаў такога профілю ў нас яшчэ няма. Як няма, зрэшты, і сродкаў малой механізацыі, спецыяльных матэрыялаў, навуковых рэкамендацыі, якія б аблегчылі працу такіх фанатыкаў мастацтва, як Вячаслаў Зелянко. Яны, як і дзесяткі, а можа, і сотні год назад, самі падбіраюць матэрыялы, самі прыдумваюць розныя прыстасаванні, самі чаруюць над упакоўкай. Наколькі вялікая рызыка, здагадацца не цяжка.

У свой час карціна І. Ахрэмчыка «Абаронцы Брэсцкай крэпасці» вярнулася з Румыніі ў такім стане, што давялося выклікаць з Масквы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі, які аднаўляў палатно больш чым месяц. Зусім нядаўна прыкладна ў такім жа стане вернута з ВДНГ СССР скульптурная кампазіцыя Л. Давідзенкі, выкананая ў дрэве. І ў тым, і ў другім выпадку затрачаны немалыя грошы на тое, каб вярнуць мастацкаму твору яго першапачатковы выгляд.

Існуе думка, што пазбегнуць падобных накладак немагчыма. Маўляў, пашкоджанне пры транспарціроўцы так жа непазбежна, як непазбежны «апетыт» фельетаністамі ўсушка і ўтруска. А Вячаслаў Зелянко сваёй трыццацігадовай работай даказвае адваротнае. У яго ўпакоўцы нават сырыя творы (бывае іншы раз так, што карціны дапісваюцца ў апошнія дні перад выстаўкай і не паспяваюць высахнуць) дабіраюцца да месца прызначэння непашкоджанымі.

Я папрасіў работнікаў музея назваць, хаця б прыкладна, колькі твораў адправіў за час работы Вячаслаў Зелянко. Думкі былі розныя. Называлі лічбы ад двухсот тысяч да мільёна. А вось прыгадаць выпадак, калі карціна або скульптура пацярпелі з-за ўпакоўкі, зробленай ім нядбайна, ніхто не змог.

Вячаслаў Зелянко — рэдкі, калі не унікальны спецыяліст - самародак. Вядомыя беларускія мастакі характарызуюць яго як незвычайна працавітага, сумленнага, вынаходлівага работніка, як чалавека, аддадзенага мастацтву.

Ніколі, ні пры якім аўрале Зелянко не адпраўляў карціну, калі не быў абсалютна ўпэўнены, што прыняты ўсе меры перасцярогі. У музеі ведаюць: няхай прыйдзе груз у любы час дня і ночы, у выхадны дзень або ў час яго адпачынку, Зелянко з'явіцца на выклік без агаворак. Ён умее знайсці выйсце з самых складаных сітуацый. Легенды ходзяць аб тым, як ён без усялякіх сродкаў механізацыі дастаўляе скульптуры вагой у паўтары тоны з аднаго канца музея ў другі, падымае іх на любую вышыню.

Не раз прапаноўвалі Зелянко работу, якая лепш аплачваецца. Не згадзіўся. Таму што справа гэта ў значнай ступені стала для яго запатрабаваннем душы. Зелянко першым знаёміцца з любым творам, які паступіў у музей, гадзіны праводзіць каля яго, пакуль падбярэ і змайструе раму, пакуль знойдзе найбольш адпаведнае месца. І тым не менш, калі экспазіцыя аформлена, ён нязменна няспешнай хадой праходзіць па залах. Любуецца прыгожым!

«Сціплы працаўнік на ніве мастацтва, які з любоўю і вялікай адказнасцю ставіцца да сваёй справы. Калі ён упакуе скульптуру, выкананую нават у такім хрупкім матэрыяле, як гіпс, можна быць упэўненым, што яна дойдзе цэлай і непашкоджанай у любое месца нашай краіны і за мяжу», — гаворыць пра Зелянко народны мастак СССР, правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР З. Азгур.

«Для музея і для нас, мастакоў, ён — незаменны работнік, цяжка ўявіць музей без Зелянко», — сцвярджае заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР В. Грамыка.

Талент Вячаслава Браніслававіча Зелянко паважаюць беларускія мастакі. Але, на жаль, яго не ведае амаль ніхто з наведвальнікаў музея. Адзначаючы поспех выстаўкі, як правіла, забываюць успомніць аб сціплым працаўніку, ад якога ў значнай ступені залежыць гэты поспех.

І. КЛЕНАЎ.

ПАМЯЦЬ СТУКАЕ Ў СЭРЦЫ

З УСІМ нядаўна, у сонечны жнівеньскі дзень да сціплага абкладзенага цэглай доміка, што ў Радашковічах на Маладзечаншчыне, сабраліся з кветкамі ў руках пісьменнікі, партыйныя і савецкія работнікі, мясцовая інтэлігенцыя, рабочыя саўгаса, вучні. Яны прыйшлі і прыехалі, каб ушанаваць памяць вядомага беларускага празаіка Аркадзя Чарнышэвіча, які жыў у гэтым доміку ў 1957—1962 гадах, пісаў тут свой лепшы раман «Засценак Малінаўка». Прыгадваецца, што тады, адкрываючы мемарыяльную дошку, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Чыгрынаў асабліва дзякаваў за клопаты партыйным і савецкім органам Маладзечанскага раёна. Гэта пры іх стаpанні ўвекавечаны многія памятныя мясціны, звязаныя з жыццём пісьменнікаў, вучоных, грамадскіх дзеячаў.

І сапраўды, паглядзіце, колькі на Маладзечаншчыне за апошнія гады адкрыта помнікаў, мемарыяльных дошак! Непазнавальна абноўлена нацыянальная святыня ў Вязынцы. Купалаў помнік узвышаецца ў Радашковічах. Памяць народнага песняра ўшанавана ў Яхімоўшчыне. Ля вёскі Ракуцёўшчына ўстаноўлены мемарыяльны знак, які сведчыць, што тут у 1911 годзе бываў Максім Багдановіч. Мемарыяльныя дошкі прыгадваюць, што Радашковічы звязаны з імем кіраўніка «Грамады», аўтара першай беларускай граматыкі і перакладчыка паэмы «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча Браніслава Тарашкевіча, Хоўхлава — вядомага асветніка, гуманіста і кнігадрукара Сымона Буднага, Мясата — польскага паэта, вучонага, палітычнага ссыльнага Тамаша Зана, Дуброва — аднаго з першых даследчыкаў возера Байкал Бенядзікта Дыбоўскага.

У тым, што на Маладзечаншчыне так свята шануюць памяць сваіх славутых землякоў, ёсць немалая асабістая заслуга сакратара райкома партыі Вячаслава Антонавіча Ляшковіча, намесніка дырэктара Мінскага абласнога краязнаўчага музея (з сядзібай у Маладзечне) Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага, іншых энтузіястаў. Яны ездзяць па раёну, шукаюць, даследуюць. Складаюць планы на будучае.

— Работы ў нас — непачаты край, — сказаў мне тады, пасля адкрыцця дошкі ў Радашковічах, В. А. Ляшковіч. — У радашковіцкай аптэцы ў 1891—1897 гадах працаваў Ядвігін Ш.; тут жа рыхтавалася да пастаноўкі яго п'еса «Злодзей». Таму мяркуем на мясцовай аптэцы ўстанавіць мемарыяльную дошку. Варта прыгадаць людзям, што ў Гарадку памёр Ігнат Буйніцкі, што ў Маладзечне вучыўся Міхась Чарот, што ў Канчанах жыў Іван Козел. Нельга забываць і сціплых працаўнікоў на літаратурнай ніве. Скажам, да рэвалюцыі ў Гарадзілаве настаўнічаў А. Посах. Ён сябраваў з Купалам, пабываў у Горкага на Капры, зацікавіў вялікага рускага пісьменніка маладой беларускай літаратурай. Дык чаму ж нам не заняцца яго асобай, не прысвяціць яму куток у Гарадзілаўскай дзесяцігодцы або і адкрыць мемарыяльную дошку?!

— А чаму б яшчэ не зацікавіцца рэвалюцыянерам-дэмакратам, аўтарам адозвы «Да смаргонскіх сялян» Юльянам Бакшанскім? — дадаю са свайго боку ў тон Вячаславу Антонавічу. — Ён удзельнічаў у паўстанні 1863 года, загінуў у сутычцы і быў разам з трыма іншымі паўстанцамі пахаваны каля Плябаніі. Помнік, устаноўлены патрыётам, даўно прыйшоў у нягоднасць.

— Так, — пагаджаецца мой субяседнік, — трэба зберагаць памяць тых, хто змагаўся, тварыў для нас. Як мы паставімся да продкаў, так і нашчадкі паставяцца да нашага пакалення!

Помнікі нашай культуры, нашай гісторыі... Іх зберажэнне стала ў нас справай партыйнай, дзяржаўнай, грамадскай. Зыходзячы з вучэння У. І. Леніна аб спадчыне мінулага, нядаўна быў распрацаваны і прыняты агульнасаюзны закон «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры». Зберагаць і памнажаць усё лепшае з таго, што завяшчалі нам продкі, абавязвае нас толькі што прынятая Канстытуцыя СССР. Адным словам, мудрыя законы на гэты конт ёсць. Трэба толькі іх строга выконваць. Не фармальна, а па сутнасці, з душой, з ініцыятывай. Так, як у Маладзечанскім раёне ды і ў іншых месцах Беларусі. Аднак жа — не ўсюды.

Возьмем для прыкладу суседні з Маладзечанскім Смаргонскі раён. Колькі тут памятных мясцін! Кушляны, у якіх жыў і тварыў Францішак Багушэвіч. Залессе, дзе Міхал Агінскі напісаў свой чароўны палатнез «Развітанне з радзімай». Вішнева, звязанае з імёнамі вядомага вучонага Яна Карловіча і яго сына кампазітара Мечыслава Карловіча. Жодзішкі, у якіх у XVIII стагоддзі дзейнічаў школьны тэатр. Руіны Крэўскага замка.... На жаль, усё гэта занядбана. У Кушлянах даўно патрабуе рамонту дом, у якім аўтар «Дудкі беларускай» правёў апошнія гады свайго жыцця. Трэба аднавіць альтанку, зробленую яго рукамі, ачысціць сажалку, выкапаную па яго ініцыятыве. Настала пара стварыць тут музей пісьменніка, мемарыяльны комплекс. Гады са два назад за гэту справу ўзяўся Гродзенскі абласны музей. Яго супрацоўнікі прыязджалі ў Мінск, у Інстытут літаратуры за кансультацыямі, атрымалі іх. Але потым чамусьці закінулі распачатую справу... Не лепей выглядае і Залессе. Ні на Смаргоншчыне, ні ў Саюзе кампазітараў БССР не ўзялі пад увагу шматлікія прапановы стварыць тут хаця б невялікі музей Агінскага (тым больш, што ёсць экспанаты), увекавечыць яго памяць.

Тое ж самае мы пабачым, перавандраваўшы ў Валожынскі раён, таксама суседні з Маладзечанскім. Люцынка, дзе доўгія дзесяцігоддзі жыў адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры В. Дуніна-Марцінкевіч. Тупальшчына, дзе разам з жонкай і дачкой ён пахаваны на мясцовых могілках. Старажытны Ракаў, куды прыязджала Э. Ажэшка. Багданава, звязанае з імем выдатнага мастака-рэаліста Ф. Рушчыца (там жа і яго магіла). Выганічы, у якіх бываў рускі пісьменнік-дзекабрыст А. Бястужаў (Марлінскі), у якіх жыў і памёр кампазітар Міхал Грушвіцкі. Лоск, дзе ў XVI ст. існавала друкарня, у якой працавалі Д. Лянчыцкі і Я. Карцан, друкаваліся творы многіх гуманістаў. І амаль нідзе вы не пабачыце ніякага знака, які сведчыў бы аб памяці, павазе нашчадкаў. Толькі ў Тупальшчыне, на магіле Дуніна-Марцінкевіча, нядаўна быў устаноўлены помнік. Але зроблены ён на невысокім мастацкім узроўні.

У апошнія гады партыйныя і савецкія органы Беларусі вельмі многа зрабілі па зберажэнню і памнажэнню помнікаў гісторыі і культуры. Увекавечана памяць многіх дзеячаў рэвалюцыйнага руху (напрыклад, Ф. Э. Дзяржынскага), літаратуры, мастацтва, навукі. Дастаткова прыгадаць (абмяжуемся літаратурай) помнікі Купалу і Коласу ў Мінску, Скарыне ў Полацку, Багушэвічу ў Жупранах, Цёткі ў Астрыне. Не зарастае народная сцяжына да Вязынкі, Альбуці і Мікалаеўшчыны. Да стагоддзя з дня нараджэння Купалы і Коласа абнаўляюцца памятныя мясціны ў Ляўках, Акінчыцах і інш. У Мінску мяркуецца з цягам часу ўзвесці помнік Багдановічу.

Аднак перад многімі пісьменнікамі мы ўсё яшчэ ў неаплатным даўгу. Найперш — перад тымі ж Францішкам Багушэвічам, Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам (да гэтага часу няма нават у Мінску іх вуліц). Потым — перад светлым талентам Кузьмы Чорнага, Максіма Гарэцкага.

Цяпер мемарыяльная камісія Саюза пісьменнікаў БССР начала паступова выяўляць памятныя мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю беларускіх пісьменнікаў, дзеячаў іншых славянскіх літаратур. Складаюцца спісы па кожнаму раёну (па Мінскай вобласці яны ўжо складзены). Рыхтуюцца адпаведныя прапановы на бліжэйшыя гады. Але ў празмернай актыўнасці нашу камісію ўсё яшчэ не абвінавоціш. Яе работа вядзецца адасоблена ад іншых творчых саюзаў, ад рэспубліканскага Таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры і сектара Збору помнікаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Не абысціся тут без падтрымкі, без дапамогі з боку Міністэрства культуры БССР. У выніку супольных намаганняў павінен нарадзіцца перспектыўны план мемарыяльнай работы ў рэспубліцы, каб весці гэту работу без юбілейнай спешкі, паўсядзённа і сістэматычна.

Што, на нашу думку, трэба зрабіць у бліжэйшае дзесяцігоддзе? Найпершы наш клопат, вядома, Купалавы і Коласавы мясціны. Устанавіць мемарыяльныя знакі ў тых вёсках, дзе жыла сям'я Луцэвічаў. Пры дапамозе агульных прынцыпаў афармлення, адзінай задумы аб'яднаць у мемарыяльны комплекс Акінчыцы, Альбуць, Ласток і Смольню. Затым — навесці парадак у Кушлянах і Люцынцы. Наспеў час у Мінску, дзе нарадзіўся Максім Багдановіч, стварыць хаця б невялікі музей паэта.

Не ўсё мы яшчэ зрабілі для ўвекавечання памяці нашага першадрукара Францішка Скарыны. Добра, што ёсць яму помнік у Полацку. Але патрэбен таксама музей гісторыі беларускага кнігадрукавання. А ў Мінску — барэльеф Скарыны, скажам, на стэле ці мемарыяльнай пліце, прысвечанай людзям беларускай навукі і асветы (С. Будны, Я. Карскі, Б. Тарашкевіч, Я. Колас, В. Купрэвіч, У. Перцаў і інш). Такі мемарыял быў бы вельмі дарэчы перад галоўным корпусам АН БССР у сувязі з яе хуткім пяцідзесяцігоддзем.

Некалькі слоў пра пісьменнікаў XIX стагоддзя. Часам для ўшанавання іх памяці трэба зусім нямнога. Скажам, у Крошыне, на радзіме Паўлюка Багрыма у касцёле, дзе вісіць кандэлябр, зроблены яго рукамі, адчыніць музей быту часоў прыгонніцкага права (прыгадаем, што Крошын — на людной дарозе на Брэст). У Мінску — прывесці ў парадак магілу Янкі Лучыны, устанавіць мемарыяльную дошку на будынку, дзе ён працаваў. На Мядзельшчыне — назваць імем паэта-рэвалюцыянера Адама Гурыновіча школу ці бібліятэку. Урэшце ў Слуцку — упарадкаваць магілу Альгерда Абуховіча, устанавіць мемарыяльную дошку на тым месцы, дзе перад смерцю жыў пісьменнік, назваць яго імем адну з вуліц горада.

Перамога Кастрычніка выклікала бурны прыток у беларускую літаратуру маладых творчых сіл. Віднае месца ў грамадска-літаратурным жыцці занялі Андрэй Александровіч, Сымон Баранавых, Платон Галавач, Уладзіслаў Галубок, Цішка Гартны, Міхась Зарэцкі, Барыс Мікуліч, Рыгор Мурашка, Язэп Пушча, Эдуард Самуйлёнак, Паўлюк Трус, Міхась Чарот і іншыя. Пасля іх смерці пастановы аб ушанаванні іх памяці не прымаліся. Таму трэба, хоць са спазненнем, у адным выпадку запланаваць мемарыяльную дошку, у другім — назваць імем пісьменніка вуліцу, школу, Дом культуры. Вядома, арганізоўваць у кожным выпадку спецыяльны музей наўрад ці рэальна і мэтазгодна. Але кожны з названых пісьменнікаў заслугоўвае асобнага стэнда ў агульным літаратурным музеі, які мяркуецца стварыць пры Саюзе пісьменнікаў БССР. Дарэчы, другі такі музей варта было б мець у Гродне, дзе вельмі багатыя і разнастайныя літаратурныя традыцыі.

Асаблівы клопат — ушанаванне памяці пісьменнікаў братніх народаў, якія нарадзіліся, доўгі час жылі або хоць бывалі ў Беларусі. У Магілёве нішто не нагадвае, што тут спыняўся Пушкін, у Віцебску — што тут служыў Лажэчнікаў, у Шклове — што сюды спецыяльна прыязджаў Дзяржавін, у Мінску — што тут жыў аўтар рэвалюцыйнай песні «Слухай!» рускі паэт Гольц-Мілер, што тут даглядала хворага сябра-рэвалюцыянера Леся Украінка, што тут была дэпутатам гарсавета літоўская пралетарская паэтэса А. Мяркітэ. Наш абавязак адзначыць у бліжэйшае дзесяцігоддзе таксама мясціны, дзе нарадзіліся, жылі ці пахаваны класікі польскай літаратуры Ю. Нямцэвіч, У. Сыракомля, Ф. Карпінскі, Ф. Князьнін, А. Плуг.

Устанаўленне помнікаў, мемарыяльных знакаў і дошак у месцах, звязаных з жыццём і творчасцю беларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх пісьменнікаў, безумоўна, будзе садзейнічаць інтэрнацыянальнаму і патрыятычнаму выхаванню працоўных. Упарадкаваўшы такія мясціны, мы маглі б стварыць адно або некалькі «літаратурных кольцаў». Маршрут аднаго з іх нядаўна прапанаваў на старонках часопіса «Беларусь» настаўнік з Барысаўскага раёна М. Вінакураў (Мінск — Мікалаеўшчына — Нясвіж — Навагрудак — Астрыно — Вільнюс — Кушляны — Вязынка — Мінск). Яго прапанову варта ўсяляк падтрымаць.

Памяць... Гэта не толькі музеі, помнікі, вуліцы, мемарыяльныя дошкі, але і пасмяротныя выданні твораў, зберажэнне рукапісаў і асабістых бібліятэк, запіс успамінаў. Чытаючы сёлета ў «Літаратуры і мастацтве» артыкул Лідзіі Арабей пра сястру Цёткі Караліну Пашкевіч, у якой яшчэ зусім нядаўна захоўваліся рукапісы паэтэсы, я з жахам падумаў, якія мы ўсё ж нядбайныя, з якой ленасцю ўзнімаемся на пошук (гэта не датычыцца Л. Арабей, якая тут здзейсніла грамадзянскі подзвіг). А няўмольны час ідзе, знішчае сляды! Тое ж самае стасуецца і да вусных успамінаў. Колькі адышло ў нябыт людзей, што добра ведалі Купалу, Коласа, Багдановіча, Гарэцкага, Чорнага, пісьменнікаў маладзейшага пакалення. Мы ж не выбраліся, каб адшукаць іх, занатаваць іх успаміны. Гэта павінна паслужыць нам сур'ёзнай навукай не будучыню.

Сёння нам трэба набрацца мужнасці і шчыра прызнацца, што пры ўсіх дасягненнях мы ўсё яшчэ мала робім для ўшанавання памяці тых, хто складае гонар і славу беларускага народа. У гэтай святой і высакароднай справе мы прыкметна адстаём ад нашых суседзяў. І каб нам не было соромна ні перад імі, ні перад нашымі нашчадкамі, ні, тым больш, перад намі самімі, неабходна разам падумаць, што і як мы можам зрабіць і ў першую, і ў доўгую, і ў трэцюю чаргу. Гэта да нас, членаў творчых саюзаў, інтэлігенцыі, непасрэдна звернуты напамін з перадавога артыкула газеты «Правда» ад 27 верасня гэтага года: «Помнікі гісторыі — наш нацыянальны здабытак, сведчанне велізарнага ўкладу народаў СССР у развіццё сусветнай цывілізацыі. Выражаючы творчы геній і стваральныя намаганні многіх пакаленняў працоўных, яны служаць сучаснасці, мэтам і задачам грамадства развітога сацыялізму».

Адам МАЛЬДЗІС,
намеснік старшыні мемарыяльнай камісіі Саюза пісьменнікаў БССР.



Зялёны Луг.

Фота Я. МЯЦЕЛІЦЫ.

ПРАЗ УСЕ САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЛАСТЫ...

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. УПІТА

У Скрыверах, непадалёку ад Даўгавы, растуць велічэзныя таполі, пасаджаныя яшчэ трыццацігадовым Андрэем Упітам. Тут жа, ля дома-музея народнага пісьменніка,— яго сад, ясень, дубы...

Гаворачы аб велічы А. Упіта як пісьменніка, М. Ісакоўскі на адным з юбілеяў свайго сабрата адзначыў: «...Андрэй Упіт адносіцца да таго цудоўнага шэрагу пісьменнікаў, які ўключае такія імёны, як Франко і Кацюбінскі на Украіне, як Купала і Колас — у Беларусі, як Горкі і Серафімовіч — у літаратуры рускага народа».

Сын селяніна, які з ранніх гадоў зведаў усю «асалоду» батрацкага жыцця, усяго некалькі зім хадзіў у вучылішча, а пасля экстэрнам здаў экзамены па дыплом вясковага настаўніка, Упіт уваходзіў у літаратуру цвёрда, са сваім пэўным жыццёвым вопытам. Яго першыя апавяданні («У навальніцу», «Карчавальнікі пнёў» і інш.) перадавалі, як адзначаў пазней ён сам, «веру батракоў, палавіншчыкаў, вандроўных арандатараў і памесных паншчынных сялян у трыумф працы».

Сур'ёзны ўплыў на светапогляд Упіта і яго творчасць аказваюць падзеі 1905 года. Вуліцы Рыгі з чырвонымі сцягамі і баявымі песнямі, магутны людскі паток у тыя кастрычніцкія дні данамагаюць яму «знайсці сябе». Упіт не толькі адчувае моц рабочага класа, які ўзняўся на барацьбу, але і пачынае, знаёмячыся са шматлікімі працамі філосафаў-марксістаў, усведамляць сутнасць сацыяльна-эканамічных праблем, перад якімі стаяла тагачасная Латвія, непазбежнасць барацьбы процілеглых класаў.

Як вынік, услед за райнісаўскім паэтычным зборнікам «Далёкія водгукі ў сінім вечары» і горкаўскай «Маці» друкуецца раман Упіта «Новыя вытокі» (1908) — першая частка эпаса «Рабежніекі». Увасабляючы ў вобразе Мартыня, старэйшага сына Рабежніека, нараджэнне новых традыцый і ідэй, новых адносін у грамадстве, пісьменнік вуснамі свайго героя выказвае рэвалюцыянізуючую думку аб сэнсе чалавечага жыцця: «Шчасце не ў рабоце дзеля кавалка хлеба, кавалачка зямлі, а дзеля лепшай будучыні, дзеля таго, каб вакол старых пнёў зазелянелі маладыя парасткі... Дзеля такога шчасця не шкада і памерці...»

Такім чынам, голаму «трыумфу працы», у выключную сілу якога яшчэ нядаўна так непадзельна верыў малады пісьменнік, быў проціпастаўлены ў «Новых вытоках» пафас барацьбы народа за сваю шчаслівую долю. Аўтар адным з першых у латышскай літаратуры заўважыў сацыяльныя перамены, якія ўзнікалі ў латышскай вёсцы на рубяжы стагоддзяў, паказаў разлажэнне патрыярхальных і развіццё капіталістычных адносін, працэс «расслаяньвання паных сялян», па вобразнаму вызначэнню Леніна.

У наступных творах эпапеі («У шаўковым павуцінні», «Паўночны вецер», «Вяртанне Яна Рабежніека», «Смерць Яна Рабежніека» і незавершаным рамане-пралогу «Цені мінулага») А. Упіт ацэньвае грамадскае жыццё з выразных класавых пазіцый, што адбілася і на разуменні прычын пад'ёму і спаду рэвалюцыі 1905 года, смела ахоплівае вялікае кола супярэчнасцей, урэшце, у мноства падзей бачыць перспектыву будучыні — г. зн., упчыльную падыходзіць да сацыялістычнага рэалізму як мастацкага метаду ў літаратуры.

Атмасфера набліжэння новай рэвалюцыйнай хвалі ў той ці іншай меры адчуваецца і ў раманах «Жанчына», «Апошні латыш», «Золата» і «Рэнегаты», напісаных да Кастрычніцкай рэвалюцыі, прысвечаных выкрыццю нораваў буржуазнай Латвіі і сутнасці мяшчанства. Гэта тэма яшчэ больш востра гучыць у раманах пісьменніка 20—30-х гадоў: «Перад навальніцай», «Пад жалезным абцасам» і «Тайна сястры Гертруды». Ва ўсіх іх, як і ў ранніх творах, тая ж упітаўская дэталізаванасць у паказе асяроддзя і характараў герояў, тонкасць псіхалагічнага малюнка.

Імклівасць і насычанасць падзей, якімі жыве грамадства, вымагаюць у пісьменніка выкарыстання самых разнастайных жанравых форм. А. Упіт усё часцей і часцей выступае не толькі як раманіст, але і як драматург і навеліст, як паэт і публіцыст, як вучоны, якога хвалююць праблемы развіцця літаратуры і мастацтва ўвогуле. Зборнікі навел «У гарачы час» і «Барацьба вятроў», гістарычныя трагедыі «Мірабо» і «Жанна д'Арк», паэма «Пяты акт», шматлікія атрыкулы ў перыядычных выданнях насычаны барацьбой ідэй, пафасам рэвалюцыйнага аднаўлення свету.

Своеасаблівым творчым вынікам пісьменніцкай работы А. Упіта сталі яго эпапейныя раманы «Зямля зялёная» (1945) і «Прасвет у хмарах» (1951). Як і раманы В. Лаціса «Навальніца» і «Да новага берага», яны былі народжаны неабходнасцю раскрыць лёс латышскага народа праз лёсы прадстаўнікоў усіх класаў, розных сацыяльных груп.

Зноў звяртаючыся да рубяжа двух стагоддзяў, Упіт з зайздроснай настойлівасцю паглыбляецца ў шматлікія дакументы. Ён, па яго ж словах, «доўга і зорка ўглядваўся ў жыццё людзей працы, прагрэсіўных настаўнікаў, назіраў латышскую «арыстакратыю», ведаў буржуазнае асяроддзе».

Энцыклапедыяй жыцця сялянскага люду можна назваць пададзены ў «Зямлі зялёнай» латышскі хутар з яго жыхарамі. Малюючы працоўныя будні, напаўняючы падзеі і лёсы герояў супярэчнасцямі, Упіт раскрывае сацыяльныя ўмовы жыцця народа, пераканаўча паказваючы пры гэтым, што не для батракоў і здольнічыкаў тыпу Осісаў зелянее зямля, а для іншых, багатых.

Калі ў «Зямлі зялёнай» зямля ў руках кулака становіцца для батракоў штодзённай пакутай, то ў другім манументальным рамане Упіта такой жа цяжкай доляй для рабочых з'яўляецца праца на фабрыцы. Толькі ў адрозненне ад учарашняга хутаранціна, герой рамана Андра Калвіц выступае ўжо як свядомы рабочы, як барацьбіт: «Замест Рыжскага бунту падняць Рыжскую рэвалюцыю — гэтага калі-небудзь, магчыма, у аддаленым будучым, патрабуюць жыццёвыя інтарэсы рабочага класа. І адзінае, што можа выхаваць у нас здольнасць ажыццявіць такую велізарную задачу,— гэта партыя».

Сімвалічны ў рамане вобраз прасвету. Ён — як водбліск будучыні, як аптымістычнае гучанне народнага голасу... Мабыць, гэта і ёсць характэрнейшая рыса ўсёй творчасці Андрэя Упіта ўвогуле — адчуванне перспектывы рэвалюцыйнага развіцця грамадства.

А. Фадзееў у адным са сваіх пісьмаў да А. Упіта, гаворачы аб яго раманах «Зямля зялёная» і «Прасвет у хмарах», адзначаў: «Абодва гэтыя раманы, узятыя ў цэлым, даюць такі глыбокі — праз усе сацыяльныя пласты — разрэз жыцця латышскага грамадства ў важнейшы гістарычны перыяд яго развіцця, што наўрад ці можна пераацаніць іх пазнаваўчае і мастацкае значэнне. І не толькі для латышскага народа, а і для нас, рускіх, і для ўсіх савецкіх людзей».

* * *

Андрэй Мартынавіч Упіт памёр ва ўзросце дзевяноста трох год. Камуніст з 1917-га, ён ніколі не пакідаў працаваць як літаратар. У свае семдзесят гадоў ён сядзеў за пісьмовым сталом па шаснаццаць—васемнаццаць гадзін у суткі. «Нямнога ў сусветнай літаратуры пісьменнікаў, каму па плячы... была такая тытанічная работа»,—заўважыць адзін з даследчыкаў.

У 1943 годзе А. Упіту было прысвоена званне народнага пісьменніка. Гэта аб тым часе ў жыцці і дзейнасці Упіта расказа пасля пісьменнік-франтавік Арвід Грыгуліс, які наведаў яго ў далёкай рускай вёсцы Кеціпіно: «Некалькі начэй запар я сачыў за адной зорачкай, мігцеўшай скрозь яловыя галіны. Мясцовыя растлумачылі: «Так, такая ўжо гэтая зорка, мы завём яе «ранішняй зорачкай». Яна загараецца кожную раніцу, калі яшчэ зусім цёмна». І толькі пасля з усмешкай прызналіся: «Гэта акно рабочага пакоя Андрэя Упіта».

Напісанае Упітам — гэта цэлая бібліятэка. У ёй — сапраўды мастацкая энцыклапедыя народнага жыцця, жыцця самых розных, шырокіх пластоў насельніцтва: ад батракоў да баронаў, ад буржуяў і мяшчан да важакоў сялян і рабочых мас.

Інга КЛЮЧАНОВІЧ,
кандыдат філалагічных навук.

ПАФАС РЭВАЛЮЦЫІ, ПАФАС ЗМАГАННЯ

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ АНДРЭЯ ГАЛАЎКО

Неспакойныя, надзвычай складаныя, цяпер ужо далёкія дваццатыя гады... Аднаўляліся разбураныя інтэрвенцыяй і грамадзянскай вайной прамысловасць і сельская гаспадарка, фарміраваўся новы чалавек—чалавек сацыялістычнай явы. Новыя сацыяльныя ўмовы нараджалі і новую літаратуру, уважлівую да жыцця і працы простага народа, такую літаратуру, якая заклікана была ідэйна-пераканана і бескампрамісна, па-партыйнаму глыбока і шчыра сказаць усю праўду пра найвялікшы сацыяльны пераварот у гісторыі чалавецтва.

Такая літаратура нараджалася ва ўсіх кутках неабсяжнай краіны, у кожнай рэспубліцы.

Сярод тых, хто вітаў новае, разняволенае жыццё, быў і ўкраінскі пісьменнік Андрэй Галаўко. Сын палтаўскага селяніна, настаўнік, аўтар паэтычнага зборніка «Самацветы» (1919), добраахвотнік Першай Коннай арміі, ён пасля дэмабілізацыі некаторы час настаўнічае, а ўжо з 1922 года цалкам прысвячае сябе творчай дзейнасці.

Чалавек вялікага таленту, добры знаўца народнай мовы, тонкі псіхолаг, майстар пабудовы займальнага сюжэта, А. Галаўко ўжо з першых сваіх празаічных твораў актыўна прыглядаецца да новага жыцця, чуйна рэагуе на ўсе тыя змены, што адбываюцца на роднай зямлі.

Упэўненасцю ў заўтрашні дзень, верай у шчаслівую долю дзяцей-сірот, пра якіх клапоціцца дзяржава, напоўнены апавяданні зборніка «Дзяўчынка з шляху» (1923); пафас рэвалюцыі, змагання гучыць у кнізе «Магу» (1926), якая стала паваротнай вяхой у лёсе аўтара і адным з лепшых дасягненняў украінскай савецкай літаратуры. Менавіта ў гэтым зборніку зроблены пісьменнікам першыя, няхай яшчэ і не ва ўсім прыкметныя, подступы да сваёй тэмы—тэмы сацыяльнага пераўтварэння грамадства, якая, пачынаючы з дваццатых гадоў, будзе гучаць на працягу ўсяго яго доўгага творчага шляху.

А. Галаўко па-ранейшаму вабіць да сябе новае жыццё, клічуць яго светлыя і шырокія далячыні. Ён спрабуе зразумець ролю і месца лепшых прадстаўнікоў народа ў гушчы падзей нечуванай, нябачанай дасюль сацыяльнай перабудовы грамадства.

Новым творчым задумам было ўжо цесна ў рамках апавяданняў, не ўмяшчаліся яны і ў аповесцях. Уладна клікаў маладога аўтара да сябе раман.

Праца і толькі праца. І галоўнае — не распыліцца на дробязях. З багатага фактычнага матэрыялу, пачэрпнутага як з уласных жыццёвых назіранняў, так і з расказаў «бывалых» людзей, трэба было ўзяць толькі найбольш важнае і істотнае, характэрнае для жыцця грамадства на пэўным этапе яго гістарычнага развіцця. Так з'явіўся раман «Бур'ян» (1927)—лепшая кніга ва ўкраінскай літаратуры пра класавую барацьбу на вёсцы ў час умацавання Савецкай улады.

У гэтым рамане пісьменнік стварыў яркі, прывабны вобраз вясковага камуніста Давыда Матузка, характару па-сапраўднаму народнага, значнага сваёй агульначалавечай і сацыяльнай напоўненасцю.

Падзеі першай рускай рэвалюцыі адлюстраваны ў рамане «Маці» (1931), галоўныя героі якога—Юхім Гармаш, Фёдар Бандарэнка і іншыя — увасабляюць сабой працоўны народ. Раман гэты, як і папярэдні «Бур'ян»—сведчанне сталення пісьменніка, далейшага паглыблення ў яго творчасці сацыяльнага кірунку, павароту да падзей маштабнага, агульначалавечага значэння, імкнення з твора ў твор паказваць персанажы, блізкія аўтару сваім светапоглядам, жыццёвай праграмай.

Прамым працягам «Маці» стаў раман «Арцём Гармаш», за які А. Галаўку ў 1969 годзе была прысуджана літаратурная прэмія імя Т. Шаўчэнкі.

...Выступаючы на адной з чытацкіх канферэнцый, Андрэй Васільевіч неяк прызнаўся: «Я імкнуся да таго, каб мае творы дапамагалі роднаму народу жыць і перамагаць, паступова рухацца па ленінскаму шляху да камунізму».

Словы гэтыя набываюць асаблівы сэнс сёння, калі мы адзначаем 80-годдзе з дня нараджэння выдатнага ўкраінскага пісьменніка. Сапраўды, яго кнігі дапамагаюць нам жыць і працаваць, а героі іх з'яўляюцца ўзорам адданага служэння Радзіме, народу.

Творы А. Галаўко перакладзены на многія мовы народаў СССР і замежныя мовы. Двойчы яго кнігі выдаваліся і па-беларуску: «Бур'ян» (1929), «Піліпка» (1930).

І. ВІШНЕЎСКІ.

ФОРМУЛА СЯМЕЙНАГА ШЧАСЦЯ

Сацыёлагі Вільнюса сумесна з урачамі псіханеўралагічнага дыспансера надлічылі, што 80 працэнтаў людзей з дыягназам «неўроз» захварэлі з-за канфліктаў у сям'і. А хворы чалавек, натуральна, працуе з меншай аддачай і мае «цяжкі» характар. Як бачым, адносіны ў сям'і датычацца не толькі Яго і Яе. Таму наша грамадства зацікаўлена, каб у кожнай сям'і складваліся добрыя адносіны.

Раней большасць шлюбаў заключалася на матэрыяльнай аснове і часта — амаль без духоўнай, эмацыянальнай блізкасці.

Цяпер для шлюбу характэрна тэндэнцыя пашырэння духоўных, псіхалагічных патрэб. Менавіта маральна-псіхалагічныя адносіны, духоўныя сувязі ўплываюць сёння на трываласць сям'і. Станаўленне яе, асновай якой з'яўляецца ўжо не матэрыяльная зацікаўленасць, а духоўная блізкасць, агульнасць патрэб, поглядаў — не простая справа.

Лічыцца, што чым больш індывідуальная, непаўторная асоба, тым багацейшы яе ўнутраны свет, больш складаныя яе патрэбы і задаволіць іх цяжка.

Прынцыпы, умовы нашага грамадства спрыяльныя для сям'і. Адносіны без матэрыяльнага разліку, новае становішча жанчын у грамадстве, рост духоўнай культуры людзей — усё гэта добра ўплывае на сям'ю. Але дзейнічаюць гэтыя прынцыпы не адназначна. І нават пры самых спрыяльных акалічнасцях заключэння шлюбу, ён усё ж падвержаны маральна-псіхалагічным канфліктам.

На трываласць шлюбу, яго лёс уплывае не столькі пачуццё, з якім людзі жэняцца, колькі іх характары, маральныя якасці. Першапачатковыя пачуцці, эмацыянальная сувязь паміж маладымі ў працэсе сумеснага жыцця істотна змяняюцца. І гарантыяй таго, што гэтыя непазбежныя змены не дэфармуюць адносін, з'яўляецца высокі ўзровень унутранай культуры чалавека, маральнай сталасці мужа і жонкі.

Сямейнае шчасце, як вядома, складваецца з многіх параметраў. Гэта і матэрыяльная забяспечанасць, і бытавыя ўмовы, і ўзровень культуры, і агульнасць інтарэсаў, мэт, патрэбнасцей. Колькі б ні іранізавалі некаторыя людзі з таго, што «з мілым і ў шалашы рай», жыццё пераконвае нас у тым, што часта кватэры «рай», з яго знешняй раскошай і багаццем пры адчужанасці людзей, прымітыўнасці інтарэсаў, робіцца пеклам і для яго жыхароў, і для навакольных. У такой сям'і не сагрэешся, не схаваешся ад жыццёвых бур. Калі чалавек прагне матэрыяльных каштоўнасцей і мэтай яго жыцця з'яўляецца, як пабольш накапіць багацця, то ўвесь унутраны свет яго спустошваецца, скажаецца, і гэта становіцца прычынай сямейнай трагедыі, крыніцай канфліктаў.

Гаворачы пра шчаслівую сям'ю, мы маем на ўвазе, перш за ўсё, яе душэўны, унутраны камфорт. Агульнасць інтарэсаў, патрэбнасцей, адзінства ідэй і жыццёвых мэт, аднолькавасць маральных і эстэтычных поглядаў, агульнасць адносін да важнейшых з'яў жыцця, да выканання сваіх абавязкаў перад грамадствам і сям'ёй — вось што, мне здаецца, складае сямейнае шчасце.

Безумоўна, паказчыкам ладу ў сям'і з'яўляюцца і дзеці, іх маральнае аблічча, адносіны да людзей, навакольнага свету. Тое, што дарослы чалавек можа схаваць, баючыся асуджэння акружаючых, абавязкова праявіцца ў яго дзецях. Сучаснага мешчаніна не так проста разгледзець. Ён старанна ўтойвае сваю спажывецкую псіхалогію, а менавіта дзеці з'яўляюцца тонкім барометрам сямейнай атмасферы.

Выхавацелям дзіцячых садоў і настаўнікам часам даводзіцца сустракацца з праявамі абывацельскага, спажывецкага стаўлення да жыцця.

Напрыклад, пяцігадовая дзяўчынка прыйшла ў дзіцячы сад з залатымі завушніцамі. Маці сказала, што дзяўчынка так патрабавала. І вось гэты штрых нам шмат гаворыць пра клімат у сям'і. У пяцігадовага дзіцяці няма іншых жаданняў і патрэбнасцей! Жыццёвыя погляды, якія павінна сям'я прывіваць дзіцяці, тут ужо сапсаваны, скалечаны.

На бацькоўскім сходзе маці і бацька шасцікласніцы катэгарычна адмовіліся выканаць патрабаванне класнага кіраўніка зняць завушніцы з іх дачкі. Сваю адмову яны тлумачылі тым, што завушніцы да твару дзяўчынцы.

А на першы ж погляд здаецца, што ў гэтай сям'і ўсё добра. Нават на бацькоўскі сход тата і мама прыйшлі разам, што не часта даводзіцца сустракаць. Але гэтая дэталь таксама шмат сказала пра ўнутраныя спружыны сям'і, яе арыентацыю на каштоўнасці.

Класны кіраўнік папрасіла школьнікаў прыйсці 9 мая з кветкамі, каб пакласці іх на брацкія магілы. Кветкі прынеслі не ўсе. Дзеці тлумачылі гэта па-рознаму:

«Тата сказаў: без цябе абыдуцца». «Не далі грошай на кветкі...». «Мама сказала: трэба на дачу ехаць. Бацька ўжо машыну прыгнаў». Здавалася б, шчаслівая сям'я: і машына ёсць, і дача. Але паглядзіце, які сацыяльны ўрок толькі адной заўвагай прыпаднесла маці. Выпадковым такое быць не можа. Гэта ўжо атмасфера, клімат сям'і. Пачварны, удушлівы. Крытыкуючы менавіта такіх бацькоў, П. М. Машэраў на XXVIII з'ездзе КПБ гаварыў: «Не сакрэт жа, што «крэда» некаторых в іх такое: нам на долю выпала нямала цяжкасцей і нястач, дык няхай нашы дзеці цешацца магчымасцямі і плёнам забяспечанага жыцця. На жаль, шчасце сёй-той бачыць толькі ў матэрыяльным дастатку, у рабоце ўлегцы або проста ў бяздзеллі».

Што можна сказаць пра сем'і, дзе вырастаюць такія дзеці? Шчаслівыя яны? На першы погляд, так! У доме дастатак, добрыя адносіны бацькоў, дзеці не чуюць сварак, не бачаць п'яным бацьку. Але тым не менш, мы не можам назваць такую сям'ю шчаслівай. І гэта — паказчык незвычайна ўзрослай значнасці маральных пачаткаў у жыцці нашага грамадства. Бо тут мы бачым, як матэрыяльны дабрабыт нявечыць дзяцей, бо ён не падмацаваны высокімі сацыяльнымі, маральнымі каштоўнасцямі, агульнай культурай бацькоў.

Нам здаецца, што дэвіз спажывання дзеля спажывання, імкненне да нажывы, да лёгкага жыцця, што існуе ў некаторых сем'ях — не можа не адбіцца на дзецях. Пераадоленне спажывецкай арыентацыі, перажыткаў у свядомасці людзей, сцвярджэнне ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека, у тым ліку і ў сям'і, сацыялістычнага ўкладу жыцця — з'яўляецца часткай агульнай мэты. Пра важнасць вырашэння гэтых задач падкрэслівалася на XXV з'ездзе КПСС. «Неабходна аднак, — гаварыў у Справаздачным дакладзе на з'ездзе тав. Л. І. Брэжнеў, — каб рост матэрыяльных магчымасцей пастаянна суправаджаўся павышэннем ідэйна-маральнага і культурнага ўзроўню людзей. Інакш мы можам атрымаць рэцыдывы мяшчанскай, дробнабуржуазнай псіхалогіі».

Уся складаная дынаміка знешняга свету засвойваецца дзецьмі, пераламляецца праз жыццё сям'і, узаемаадносіны дарослых, маральна-эмацыянальны клімат. Дзіця атрымлівае тут пярвічную сацыяльнасць, якая шмат адыграе ў яго насталенні, бо выхаванне заўсёды мае грамадскую прыроду. А. С. Макаранка гаварыў бацькам, што «нельга аддзяліць сямейныя справы ад спраў грамадскіх. Ваша (бацькоў. — **Д. Л.**) актыўнасць у грамадстве або на рабоце павінна мець адлюстраванне і ў сям'і. Сям'я павінна бачыць вашу палітычную і грамадзянскую асобу і не аддзяляць яе ад асобы бацькоў».

У добрай сям'і ўся атмасфера прасякнута багатым сацыяльным зместам. І калі маральныя ўстаноўкі вучаць дабрыні, увазе да людзей, любві, інтарэсу свету, то гэта гарантыя таго, што ў такой сям'і вырастаюць маральна здаровыя дзеці. Яны змогуць супрацьстаяць любому злу — і маральнаму, і сацыяльнаму. І наадварот, дух спажывецкай псіхалогіі садзейнічае выхаванню эмацыянальна глухой асобы з прымітыўнымі інтарэсамі і патрэбнасцямі. Матэрыяльны дабрабыт, які не падмацоўваецца духоўнай культурай, садзейнічае раздваенню чалавека, як асобы.

Ва ўмовах развітога сацыялізму кожны з нас атрымлівае магчымасць жыць матэрыяльна забяспечана, духоўна насычана і змястоўна, раскрываць сваю індывідуальнасць і творчы патэнцыял. Аднак ператварыць гэтую магчымасць у рэальнасць не так проста. Гэта не робіцца аўтаматычна.

К. Маркс і У. І. Ленін неаднаразова падкрэслівалі, што задавальненне матэрыяльных патрэбнасцей — гэта не самамэта, а сродак для паўнакроўнага, творчага, стваральнага жыцця, што галоўнае ў чалавеку — яго творчыя патрэбнасці.

Мне здаецца, што небяспека прыніжэння чалавечай годнасці можа з'явіцца там, дзе асабістае багацце, накапленне рэчаў становіцца самамэтай. Адсюль небяспека спажывецкіх адносін заключаецца ў тым, што можна ўвесь вольны час патраціць на набыццё рэчаў і прамінуць сапраўдныя каштоўнасці жыцця. Калі чалавек падначаліцца свету рэчаў, калі ў пагоні на іх набыццё аддае душу, ён прыніжае сваю чалавечую годнасць.

Рост жыццёвага ўзроўню вылучае праблему выхавання культуры патрэбнасцей, «разумнасці» патрэб, маральнай і ідэалагічнай падрыхтоўкі чалавека да ўсё больш шырокіх магчымасцей спажывання. «Выхаванне набывае найбольшую сілу і выніковасць пры ўмелым спалучэнні матэрыяльных і духоўных асноў у жыцці чалавека, пры гарманічным іх развіцці. Усе мы з радасцю адзначаем, наколькі дабратворныя дзеючыя ў нашым грамадстве тэндэнцыі да ўзвышэння чалавечых патрэбнасцей», — адзначалася ў Справаздачным дакладзе XXVIII з'езду КПБ.

Нармальнаму чалавеку неўласцівы як нястрымная пагоня за рэчамі, культ спажывання, так і аскетычная абмежаванасць да ўсяго гэтага. Сям'я нашага грамадства, на мой погляд, павінна будаваць свае ўзаемаадносіны са светам рэчаў, якія маюць тэндэнцыю павялічвацца і быць надзвычай разнастайнымі, толькі пры правільным сувымярэнні жаданняў і магчымасцей. Перш за ўсё з рэальнымі магчымасцямі грамадства на дадзеным этапе яго развіцця. Цікава ставіць гэтую праблему В. Мацяшоў у кнізе «Свет, што спажывае: за і супраць». Ён вылучае крытэрыі «разумнасці» патрэбнасцей. «...Задавальненне любой патрэбнасці, — піша аўтар, — не можа быць прызнана разумным, калі яна супярэчыць доўгачасовым інтарэсам грамадства. Услед за адпаведнасцю запатрабаванняў і жаданняў людзей грамадскім магчымасцям другім важнейшым крытэрыем іх разумнасці выступае суаднесенасць з грамадскай карысцю». Пераадоленне спажывецкай арыентацыі магчыма пры высокай культуры чалавека, якая не супадае з узроўнем адукацыі, але зусім немагчыма без развітога маральнага пачатку, без высокіх духоўных патрэбнасцей.

Ёсць рэчы і Рэчы, кнігі і Кнігі, музыка і Музыка... Безумоўна, карыстаючыся імі, мы робімся багацейшымі духоўна. Аднак іншы раз атрымліваецца і наадварот, што, маючы вялікую колькасць дарагіх рэчаў і чытаючы літаратуру, якую цяжка дастаць, гадзінамі слухаючы ультрамадэрновую музыку — некаторыя з нас не робяцца лепшымі, больш разумнымі, а ператвараюцца ў абывацеля, жабрака духам, які ганяецца за рэчамі, кнігамі, пласцінкамі... Такім чынам, мы бачым, што галоўным тут выступае маральна-эстэтычная культура чалавека. Менавіта яна дапамагае чалавеку выбраць у акіяне рэчаў, кніг, музыкі тое, што патрэбна Яму, зрабіць яго багацейшым духоўна.

«Выхавацель павінен быць сам выхаваны», — пісаў К. Маркс. Значыць, перш чым патрабаваць ад сям'і чалавечых адносін, правільна выхоўваць дзяцей, арыентавацца на «разумныя», «чалавечыя» патрэбнасці, — яе трэба навучыць гэтаму. Было б памылкай, калі б мы спадзяваліся на тое, што па меры ўдасканалення сацыялістычных грамадскіх адносін, знікнення дэфіцыту, дасягнення матэрыяльных даброт, самі па сабе знікнуць спажывецкія погляды, адносіны і паводзіны.

Для выхавання людзей неабходны комплексны падыход, мэтанакіраваная работа грамадскасці — школы — сям'і. Адным са шляхоў з'яўляецца маральная асвета, арганізацыя шырокай сеткі лекторыяў пры школах, дамах культуры, на месцы жыхарства; арганізацыя серыі перадач па радыё і тэлебачанню; публікацыі ў друку.

Гарантыяй моцнай сям'і, на мой погляд, з'яўляюцца высокія духоўныя патрэбнасці, душэўная блізкасць, гармонія інтарэсаў, погляду, падыходу да жыцця.

Сацыялістычная сям'я заўсёды была і будзе генератарам новых, найвышэйшых каштоўнасцей, самай галоўнай з якіх з'яўляецца выхаванне асобы.

Д. ЛУКІНА,
кандыдат філасофскіх навук.

ТУДЭМА — СЮДЭМА...

ГІПНАТЫЗЁР

Аднойчы мы зайшлі з прыяцелем на лекцыю па гіпнозу. Яе чытаў заезджы гіпнатызёр, а пасля лекцыі дэманстраваў доследы.

А якія доследы... Выйшаў на сцэну нейкі хлапчук, лектар яму і гаворыць: «Падыміце рукі! Прайдзіце па сцэне...» Потым разгіпнатызаваў хлопца і пытаецца: «Памятаеце, што вы рабілі?»

— Не, — адказвае хлопец, — не памятаю...

Зноў выклікае лектар жадаючых.

Ну, я і думаю: мяне ты на гэтым не правядзеш... Дай, думаю, выйду.

Пасадзіў мяне гіпнатызёр насупраць сябе і пачаў усыпляць. Я ў гіпноз не веру, а ўсё роўна страшна стала — ужо надта ён жудасна вачамі сваімі круціў.

Потым гаворыць: «Устаньце!»

Я устаў.

— Прайдзіце па сцэне!

Прайшоў.

— Падскочце!

Падскочыў.

Нарэшце гаворыць: «Прачынайцеся!»

А мне што, я і не засынаў зусім.

— Прачнуўся, — кажу.

Лектар ад задавальнення нават рукі пацірае.

— Вы, — гаворыць ён, — не памятаеце нічога, вядома?!

— Дзе там, — абурыўся я, — вельмі нават добра ўсё памятаю. Спачатку ўстаў, потым па сцэне прайшоў, потым падскочыў...

Выкрыў я, адным словам, увесь яго гіпноз. Зала так і пакацілася са смеху. Праўда, гіпнатызёр таксама знаходлівым аказаўся.

— Гэта, — гаворыць, — накладка ад папярэдняга нумара атрымалася. Самаўнушэнне...

Ну, я не стаў, вядома, нічога гаварыць. Няхай як хочуць, так і думаюць... Толькі я ведаю, якое гэта самаўнушэнне. Гіпнатызаваць не ўмее, а туды ж — накладка...

Пасля доследаў, гляджу, прыяцель да мяне працісквае цца.

— Ну, — гаворыць, — і загіпнатызаваў ён цябе!

— Ага, — кажу, — загіпнатызаваў...

А сам усміхаюся.

— Ніколі б не паверыў, — гаворыць прыяцель, — што ты можаш столькі часу хадзіць на руках ды яшчэ і падскокваць...

М. КАНЯЕЎ.

Міхайла СТОЛІН

ФРАЗЫ

Спяваць не ўмеў, але навучыўся падпяваць.

●

Схаваў свой талент. І забыўся, дзе.

●

Не ўсе словы, кінутыя на вецер, — крылатыя.

●

Пісаць ананімкі — марная справа: ні папулярнасці, ні ганарару.

●

Не кожны, хто называе чорнае белым, — дальтонік.

●

Густы некаторых гледачоў праяўляюцца ў тэатральных буфетах.

●

Зняў такі дэтэктыў, што на праглядзе перапалохаў увесь мастацкі савет.

Пераклаў з украінскай М. БАЗАРЭВІЧ.

Яўхім СУШНЯК

ІДУЦЬ ПАЭТЫ ПРАЗ ЛЯСЫ

«Устань да сонца», Муза!
Заканчваў чакае.
Сягоння ля саюза,
Зіра!, чарга якая.
Пасля — у лес вясновы
З лазартам хлапчукоў.
Бо там дап'е «Кляновік»
З ільдзінкаю! Пашкоў.
Ад лечэння ў абору
Мяце не зачыніць.
Вунь Дукса крочыць з бору, —
Аж «Прычарнічы сініц»!
І не, не надалося:
З гаёў і паплаваў
Чыясь курлыча восень
«Адлётам журавоў».
Не згорбімся ў вандроўцы
Пад сінерам зімы.
У ціхай «Лесічоўцы»
Прытулак знойдзем мы.
«Устань да сонца», Муза!
Прыйшла твае часы.
Шыбуюць да саюза
Паэты праз лясы.

БЕЗ ПРЫСВЯЧЭННЯЎ

ПАБЫЎКА У ПАЭЗІІ

Прыйшоў паэт
на белы свет.
Пакуль ішоў —
не стопаўся.
Імчаў паэт,
глядзеў паэт
праз вокны
у аўтобусе.

РЭЦЭНЗІЯ НА КВОЛЫ ЗБОРНІЧАК НЕВЯДОМАГА АУТАРА XX СТАГОДДЗЯ

Ён з горада на сырадой,
на свежыну, бывала, ездзіў...
А ўсё астатняе ён бэсціў.
З казла казліны і надой.

СКАРГА ЛІРЫ

— Ніякіх прысвячэнняў
не цярплю! —
сказала Ліра
мне аднойчы ўранні. —
Бо чула, адзін лірык
гаварыў «Люблю!»,
і адвярнуўшыся:
«Сагну у рог баранні!»

ПАЭТ ПРА КРЫТЫКА

— Ласкавае цялятка.
Назіраю,
як бык-бадун
варочаецца ў ім.
На жаль, і я
не аказаўся з краю...
А міла так здароўкаюцца з ім.

ДРАМАГАВОРКА

Ехаў Рэка *
каля рэкі —
рэху тараторыў:
«Літаратар
для тэатра —
дар тарэадора».

* Рэка — сучасны драматург.

С. ПРЫПАР.

РАЗМОВА З КРЫТЫКАМ

— Ну, нарэшце, я да цябе дабраўся! Што ж з табой зрабіць? Я ўсё помню: і артыкул твой помню, і выступленне на секцыі саюза помню. І тое, як ты маю аповесць «зарэзаў». А аповесць выдатная, проста выдатная! І пачатак, які табе «не спадабаўся» — цудоўны, цудоўны, цудоўны! Слухай: «Міхась падумаў крыху і наліў чарку». Што дрэнна? Ану, паўтары, што дрэнна! Ага, не хочаш, баішся!

Давай яшчэ з іншага боку возьмемся. Ты казаў, што канцоўка не жыццёвая? Казаў? Лепш адразу прызнавайся! Не хочаш? Ну, тады трымайся. Цяпер згодны, што канцоўка добрая? «Міхась падумаў, уздыхнуў і адсунуў напоўненую шклянку». Кажаш, што так не бывае, што гэта не тыпова? А я кажу — тыпова, тыпова, тыпова!

Атрымлівай цяпер з гэтага боку. А цяпер — злева. І зноў справа! Так, як ты мяне некалі дубасіў на пасяджэнні ў саюзе...

— Пракоп — пачуўся голас жонкі. — Хопіць з яго! Што гэта ты сёння размахаўся?

Пракоп Сугак — пісьменнік з салідным стажам і не менш салідным брушкам — задаволена ўсміхнуўся, адклаў убок выбівалку і пачаў скручваць дыван.

Б. ГЕРСТАН.

Раман ЗАЛУЖНЫ

ПАНЧОХА

Я сядзеў на сваім рабочым месцы і вязаў панчоху. Захапіўшыся, я не заўважыў, як у кабінет ціхенька ўвайшоў начальнік і моўчкі назірае за мной.

— Чым гэта вы, таварыш Хахленка, займаецеся ў рабочы час? — не вытрымаў урэшце ён.

— Як чым? Вы што, самі хіба не бачыце? Вяжу панчоху. Гэта ўмацоўвае нервы.

— Зараз жа бярыцеся за справу, — злосна адказаў ён.

Я хуценька адклаў убок панчоху і абыякава пачаў корпацца ў паперах. Як толькі Іван Палікарпавіч (так звалі майго начальніка) пакінуў пакой, я зноў узяўся за сваю панчоху.

Не прайшло і паўгадзіны, як у дзвярах зноў паказаўся Іван Палікарпавіч.

— Ды вы што, зусім звар'яцелі?.. Вунь камсамольскі пражэктар ходзіць...

Гэтыя два словы крыху на мяне падзейнічалі, але, успомніўшы, што панчоха «ўмацоўвае нервы», я не вытрымаў.

На гэты раз белы, як сцяна, начальнік на момант спыніўся каля дзвярэй, вусны яго затрэсліся, потым ён рашуча кінуўся да мяне, і, выхапіўшы панчоху, маланкава сігануў за дзверы.

Я чакаў гадзіну, паўтары, а пасля сам пайшоў да Івана Палікарпавіча. Дзверы яго кабінета былі зачынены. Я выгляну ў калідор. Мой начальнік сядзеў у крэсле і вязаў панчоху.

«Ага-а, — весела падумаў я, — упэўніўся, відаць, што гэта ўмацоўвае нервы».

Пераклаў з украінскай М. ЛЯШЧУН.

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...



Малюнкі У. БАРАНОЎСКАГА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі

Індэкс 63856 АТ 01597

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО, Рыгор ШЫРМА.